ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ПЯТНІЦА, 16 студзеня 1981 г.
№ 3 (3049)
Выходзіць з 1932 г.
Цана 8 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

XXVI з'езд КПСС

У БРЭСЦЕ — АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ

У гэтыя дні, калі ідзе шырокае, усеагульнае абмеркаванне праекта «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года», аднаго з важнейшых дакументаў партыі, прыемна было даведацца, што ў Брэсце, як і ў свой час у Гомелі, Магілёве, Гродне, Віцебску, пачало працаваць аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР — яшчэ адна творчая арганізацыя, якая аб'яднала літаратурныя сілы Брэстчыны. Гэта, безумоўна, паслужыць далейшаму ўмацаванню сувязей пісьменнікаў вобласці з працаўнікамі горада і вёскі, з жыццём, будзе спрыяць павышэнню творчай актыўнасці аўтараў, якія тут жывуць і працуюць, стварэнню новых цікавых кніг, выхаванню маладой змены. А творчасць літаратараў гераічнай і працоўнай Брэстчыны сёння вядома далёка за яе межамі. Тут актыўна працуе даволі моцны атрад паэтаў, празаікаў, крытыкаў.

Чытачам падабаюцца глыбокія, грунтоўныя і ў той жа час разважліва-памяркоўныя крытычныя артыкулы і літаратуразнаўчыя працы Уладзіміра Калесніка, якога многія маладыя паэты Брэстчыны нездарма называюць сваім настаўнікам. Даўно палюбілася нам нешматслоўная, але змястоўная, шчырая, прасякнутая пачуццём любові да бацькоўскай зямлі, да роднага краю, паэзія Міхася Рудкоўскага. І як не прыгадаць сёння яго радкі:

У краі тым, дзе сосны
ў сонцы плачуць.
Ступіўшы да высокіх
курганоў.
У краі тым, дзе й сёння голас
матчын—
Бы колас пераспелы—
пра сыноў.
І дзе яшчэ гайдаюцца
калыскі
На тых, на партызанскіх,
на вятрах,—
Усё да немагчымасці нам
блізка:
І зоры,
і любоў,
і продкаў прах...

А каго не крануць удумлівыя, крышку сумнаватыя, але заўсёды надзеленыя лірычнай чысцінёй і радасцю жыцця вершы і паэмы Ніны Мацяш? А колькі жыццёвага роздуму, задушэўнасці, маладога настрою ў паэзіі і прозе Віктара Гардзея, у паэтычных творах Івана Арабейкі, апавяданнях і аповесцях Святланы Курылёвай, цудоўных нарысах Васіля Праскурава?!

Сціпла і ўдумліва працуюць у літаратуры гэтыя людзі. І, можа быць, раўняючыся на іх, ідуць адсюль у літаратуру сёння крышку маладзейшыя, але здольныя Мікола Пракаповіч, Мікола Трафімчук, Зінаіда Дудзюк, зусім юная паэтэса з Піншчыны Любоў Дзікавіцкая.

Заснаванне ў горадзе над Бугам абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР — яшчэ адна з красамоўных праяў клопату Камуністычнай партыі аб развіцці і росквіце нашай літаратуры, усведамленне важнасці і значнасці яе ў выхаванні савецкага чалавека, будаўніка новага грамадства. Думаецца, адказам на гэты клопат будуць новыя змястоўныя творы літаратараў Брэстчыны.

Звалі яго Васіль КОРЖ

Яго жыццё стала легендай... Хлопец з глухой палескай вёскі, у дваццатыя гады ён стаў партызанам у атрадзе славутага Мухі-Міхальскага, якога мы ведалі потым як Кірылу Арлоўскага, ваяваў за волю ў Заходняй Беларусі; пазней, у трыццатыя гады—ён у Іспаніі ў складзе камуністычных інтэрбрыгад змагаецца з франкістамі. А ў Вялікую Айчынную становіцца камандзірам аднаго з самых першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі.

Ён заканчвае вайну генерал-маёрам, працуе намеснікам міністра лясной гаспадаркі рэспублікі, і раптам адмаўляецца ад сваёй пасады, просіць паслаць яго старшынёй калгаса ў тую самую палескую вёску, з якой выйшаў. І на пасадзе старшыні працуе нястомна і самааддана да канца дзён сваіх...

Звалі яго Васіль Корж.

Новы фільм рэжысёра Ігара Дабралюбава (аўтары сцэнарыя А. Асіпенка, М. Пяцігорская, І. Балгарын, аператар Р. Масальскі, мастак У. Дзяменцьеў), грамадскі прагляд якога адбыўся ў Доме кіно, — пра яго, Васіля Каржа, пра менавіта тыя гады яго жыцця, якія прайшлі ў роднай вёсцы, у змаганні за народны дабрабыт.

Фільм называецца «Трэцяга не дадзена». Гэта значыць, што чалавек альбо са сваім народам, альбо не. Трэцяй пазіцыі не бывае.

Кінафільм неўзабаве выходзіць на экраны; ён з'яўляецца падарункам беларускіх кінематаграфістаў XXVI з'езду партыі.

У ролі Васіля Каржа—артыст Валянцін Белахвосцік.

КАЛІ ТЫ ПРЫСЯГАЎ — ЗМАГАЙСЯ!

Ён сядзіць у крэсле ў авіялайнеры, чалавек пяцідзесяці гадоў, і ў маторным шуме яму чуецца шэпхі артылерыйскіх снарадаў і рэха славесных дыспутаў. Водгулле вайны не аціхае ў яго душы. Вайну, якую ён закончыў лейтэнантам у Берліне, аднаўляюць і старонні яго раманаў. Гэта для абмеркавання сваіх твораў з заходнімі выдаўцамі і лятаў пісьменнік Вадзім Нікіцін у ФРГ. І там зноў вайна—на гэты раз чак паядынак паміж рознымі маральнымі прынцыпамі, паміж гуманізмам нашай ідэалогіі і валюнічым цынізмам адэптаў сучаснай уседазволенасці і разбэшчанасці з «таго берага» цывілізацыі. Вадзім Нікіцін сёння, як і ў тым пераможным 45-м годзе, адстойвае сапраўдную чалавечнасць, харастро высакародных памкненняў, чысціню і сумленнасць у кожным кроку салдата і грамадзяніна.

Так, гэта — сцэнічная версія папулярнага рамана «Бераг» Ю. Бондарава. Спектакль, які Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы падрыхтаваў да XXVI з'езда КПСС. Адбыліся першыя паказы, першыя сустрэчы выканаўчага калектыву з гледачамі. Рэжысура яшчэ ўносіць у спектакль карэктывы, удакладняе акцэнты ў тэатральным гучанні празаічных старонак. Акцёры прыслухоўваюцца да рэакцыі глядзельнай залы і правяраюць інтанацыйны лад і тэмпераментны напал кожнай сцэны ў кантакце з аўдыторыяй. Гэта—абавязковы этап станаўлення сцэнічнага твора.

Як і ў рамане, на сцэне самым напружаным па эмацыянальным напале гучыць кантрапункт ваенных перажыванняў Вадзіма Нікіціна і яго баявых сяброў з той ідэалагічнай супытаўкай у ФРГ, якая прымушае героя ў думках гартаць старонкі сваёй біяграфіі, каб праверыць, ці заўсёды ён быў паслядоўна адданы таму, чаму прысягаў у юнацтве, выпраўляючыся на франтавыя скрыжаванні лёсу, ці не траціць ён сёння таго адчування духоўнай велічы і хараства чалавека, з якім салютаваў Перамозе ў маі сорак пятага... Сцэна і аднаўляе гэтыя старонкі. На падмостках як бы ажываюць абліччы, гарачыя спрэчкі, здарэнні, франтавыя эпізоды, што заўсёды застаюцца з немаладым пісьменнікам Нікіціным, вымагаюць ад яго творчага асэнсавання, пераходзяць у яго раманы. І ў асабістым лёсе Вадзіма перажытае на вайне—нібы вытоК яго ўчынкаў і паводзін, яго самаканцтролю і суда над самім сабою. Той бераг, дзе вера і спадзяванні, гонар і сумленне... І за мінуту да смерці ён думае аб ім прасветлена і ўдзячна.

Так пастаўлены спектакль «Бераг» рэжысёрамі Б. Эрыным і Г. Уладамірскай. Так іграе Вадзіма Нікіціна народны артыст БССР М. Яроменка. Выканаўцы роляў знайшлі эмацыянальны лад глыбокіх інтэлектуальных канфліктаў, калі Нікіціну і Самсонаву (Б. Уладамірскі) рэспектабельныя носьбіты заходняй маралі прапануюць забыцца на вайну і паглыбіцца ў свабодную гульню інстынктаў, дзе, маўляў, няма ніякай розніцы паміж капіталістам і рабочым, паміж нацыстам і змагаром за вызваленне народаў ад фашызму (тут асабліва наступальны характар раскрываюць У. Рагаўцоў у ролі Фрыдрыха Дыцмана і П. Дубашынскі—Карла Вебера). Шмат цікавых знаходак у А. Пабеда (лейтэнант Княжко), А. Мароза (сяржант Мяжэнін), Г. Гарбука (камбат Гарнатураў). У ролі Эмы Герберт выступаюць дэбютантка на сцэне, студэнтка інстытута культуры Е. Іваннікава (у сцэнах 45 года) і вопытная актрыса Г. Арлова.

Рэжысура разам з аўтарам сцэнаграфіі А. Ціхановічам, з кампазітарам Э. Зарыцкім і асімі ўдзельнікамі яшчэ і яшчэ ўдакладняе абрысы спектакля. Шукаецца канчатковая рэдакцыя мантажу эпізодаў. Ідзе, як кажуць, абкатка сцэнічнага відовішча. І такая патрабавальнасць тэатра да работы, прысвечаная знамянальнай падзеі ў жыцці нашага грамадства, зразумелая і варта ўхвалы.

Стыкоўка касмічнага карабля з арбітальнай станцыяй у космасе, экспедыцыя лыжнікаў на Паўночны полюс, адкрыццё Алімпійскіх гульняў у Маскве. Усё гэта маглі бачыць мільёны гледачоў краіны дзякуючы маленькаму блакітнаму экрану, які прыжыўся амаль у кожным доме. Тэлебачанне стала неад'емнай часткай нашага штодзённага побыту. Мы нават не помнім таго часу, калі яго не было.

1 студзеня 1956 года—25 гадоў таму назад—упершыню запалілася святло Беларускага тэлебачання. Гэтай даце быў прысвечаны ўрачысты вечар, які 12 студзеня адбыўся ў Палацы культуры Белсаўпрофа.

Сюды прыйшлі шматлікія госці. Яны віншавалі работнікаў тэлебачання са святам і жадалі ім яшчэ больш удасканальваць тэлеперадачы, дамагацца больш шчырай размовы з гледачом. У зале гучаў наказ і вясёлы жарт, прызнанне ў любові і напамінак аб адказнасці перад гледачом.

У адрас юбіляра паступілі прывітальныя адрасы і тэлеграмы.

Ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі работнікаў Беларускага тэлебачання павіншаваў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

Ад Цэнтральнага тэлебачання выступіў намеснік старшыні Дзяржтэлерадыё СССР У. І. Папоў.

На вечары прысутнічалі намеснік старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, загадчык аддзела ЦК КПБ С. Я. Паўлаў.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ФІЛЬМ АБ ДРУЖАЛЮБНЫМ ВІЗІЦЕ

Гістарычнай вяхой на шляху далейшага ўмацавання савецка-індыйскай дружбы стаў афіцыйны дружалюбны візіт Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева у Рэспубліку Індыю 8—11 снежня 1980 года. Гэтай падзеі, якая ўнесла важны ўклад у барацьбу за забеспячэнне ўсеагульнага міру, прысвечаны тэлевізійны дакументальны фільм «Новая сустрэча з Індыяй». Ён быў паказаны па Цэнтральным тэлебачанні 8 студзеня.

Кінакадры расказалі аб выключна цёплым, сардэчным прыёме, аказаным народам Індыі Леаніду Ільічу Брэжневу, аб яго перагаворах і гутарках з прэм'ер-міністрам І. Гандзі, іншымі індыйскімі кіраўнікамі. У фільме адлюстраваны выступленне кіраўніка Савецкай дзяржавы перад парламентарыямі Індыі, мітынг савецка-індыйскай дружбы, падпісанне сумесных дакументаў, якія адкрываюць новыя гарызонты ў развіцці савецка-індыйскіх адносін на карысць народаў абедзвюх краін, у інтарэсах міру і бяспекі ў Азіі і ва ўсім свеце.

У карціну ўвайшлі інтэрв'ю вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў Індыі, вучоных, рабочых, майстроў мастацтва, якія даюць высокую ацэнку вынікам візіту Л. І. Брэжнева, савецка-індыйскім адносінам, што з'яўляюцца прыкладам практычнага ўвасаблення прынцыпаў мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльна-эканамічным ладам.

Аўтары фільма — тэлежурналісты В. Белабародзька, В. Дунаеў, Ю. Солтан.

Кар. ТАСС.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Рэспубліканскае праўленне добраахвотнага таварыства аматараў кнігі і Упраўленне кніжнага гандлю Дзяржкамвыда БССР падвялі вынікі агляду-конкурсу клубаў кнігалюбаў і кніжных магазінаў-клубаў па прапагандзе і распаўсюджванні грамадска-палітычнай літаратуры, прысвечанага 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Конкурс садзейнічаў прапагандзе твораў У. І. Леніна, кніг аб жыцці і дзейнасці правадыра, аб саратніках Ільіча, матэрыялаў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, рашэнняў пленумаў ЦК КПСС, прац Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева.

Кнігалюбы клуба «Крыніца» вытворчага аб'яднання імя У. І. Леніна правялі пасяджэнне «Ленін і кніга», на якім дэманстравалася выстаўка кніг аб Леніне. На пасяджэнні выступілі ветэраны партыі, пісьменнікі, мастацтвазнаўцы, артысты, бібліятэчныя работнікі. Ленінскія чытанні прайшлі ў цэхах і аддзелах, члены клуба сабралі і падарылі падшэфнай школе № 78 і падшэфным калгасам бібліятэчкі аб жыцці і дзейнасці правадыра.

Клуб кнігалюбаў «Крыніца» стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу. Як пераможцы, адзначаны таксама клубы кнігалюбаў «Натхненне» (Першамайскі раён г. Мінска), «Несцерка» (г. Маладзечна), маладзёжны клуб кнігалюбаў «Мара» (Ленінскі раён г. Мінска), магазін-клуб «Светач» г. Мінска, бібліятэкі імя Я. Купалы, фундаментальная бібліятэка імя Я. Коласа АН БССР і дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага г. Мінска. За актыўны ўдзел у прапагандзе работы клубаў кнігалюбаў дыпломам адзначана рэспубліканская маладзёжная газета «Чырвоная змена».

А. ПЕТУХОУ.

КІНАКРЫТЫКА: СТАН І ПРАБЛЕМЫ

Кола пытанняў, якія былі ўзняты на рэспубліканскім семінары журналістаў, што пішуць пра кіно, можна акрэсліць так: кінематограф—кінакрытыка — глядач. Узаемаадносіны тут настолькі ж складаныя, наколькі цікавыя і досыць плённыя.

Па звестках часопіса «Советский экран», кінарэпертуар мінулага года склалі фільмы 328 назваў. А колькі з іх прарэцэнзавана ў друку, колькі атрымала сур'ёзную і прынцыповую ацэнку? Ці дастаткова ўважлівыя нашы газеты і часопісы да таго, што выходзіць на экраны? Наколькі кінакрытыка падрыхтавана да размовы, калі, скажам, пад увагу трапілі так званыя «цяжкія» фільмы? Наколькі правільна сарыентавана кінакрытыка, калі вядзе «даверальную» размову аб фільмах ілюстрацыйных, яркі сюжэтных, але не яркі мастацкіх? Ці заўсёды захоўваецца прынцыповасць, ці не адчуваецца іншы раз боязь актыўна ставіць пытанні, імкненне падмяняць прынцыповую размову шматслоўем і прапагандысцкімі штампамі?

На гэтыя пытанні скіравалі сваю ўвагу ў выступленнях на семінары кінакрытыкаў рэспублікі сакратар праўлення СК БССР, кандыдат мастацтвазнаўства А. Красінскі і доктар філалагічных навук Е. Бондарава.

У выступленнях удзельнікаў семінара падкрэслівалася, што на старонках перыёдыкі недастаткова кінакрытычных матэрыялаў наогул і асабліва аналітычных, што не заўсёды аператыўна і грунтоўна ацэньваюцца творы беларускага кінематографа. Пажадана, каб у поле зроку рэцэнзентаў траплялі творы кінастудый краіны. Часцей варта публікаваць праблемныя артыкулы па кінамастацтве.

Абмеркаванне стану кінакрытыкі наладзіла секцыя крытыкі СК БССР сумесна з Саюзам журналістаў БССР.

Л. САЯНКОВА.

САКРАТАРЫЯТ ПРАЎЛЕННЯ СП БССР

на сваім чарговым пасяджэнні, якое вёў М. Танк, разгледзеў шэраг надзённых пытанняў, пастаўленых жыццём пісьменніцкай арганізацыі, развіццём літаратурнага працэсу. Адно з іх — аб адкрыцці аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР у Брэсце.

Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі план мерапрыемстваў да 60-годдзя з дня нараджэння І. Мележа і 90-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча.

На пасяджэнні сакратарыята былі ўтвораны камісіі па літаратурнай спадчыне пісьменнікаў, якія нядаўна пайшлі ад нас. У склад камісій увайшлі: па спадчыне І. Клаза—М. Герчык (старшыня), В. Нікіфаровіч, З. Стасевіч; па спадчыне Ю. Пшыркова — А. Мальдзіс (старшыня), В. Дэконская (сакратар), А. Лойка, В. Чамярыцкі, Н. Пшыркова; па спадчыне С. Дзяргая—Я. Сіпакоў (старшыня), Я. Верабей, (сакратар), А. Клышка, В. Тарас, В. Алефірэнка.

ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

Рашэннем выканкома Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў імя народнага паэта Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай Працы Петруся Броўкі прысвоена адной з вуліц абласнога цэнтра, забудова якой пачалася ў 1980 годзе. Гэта будзе шырокая сучасная магістраль, што працягнецца з поўдня на поўнач больш чым на два кіламетры. Уздоўж яе размесціцца вялікая паркавая зона, а таксама комплекс Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

СВЯТА МУЗЫКІ, ПЕСНІ, ПАЭЗІІ



У Гомельскім абласным драматычным тэатры адбылася прэм'ера — спектакль па камедыі А. Каштанава «Не стой пад грузам». Рэжысёр — В. Бартосік, мастак — Н. Стэфанава, музычнае афармленне — Б. Гофман.

На здымках: (злева направа) Лыкаў — артыст Э. Цурбакоў, Тварожын — артыст В. Драбышэўскі.

Фота В. ГОРСКАГА.

У Доме работнікаў мастацтваў Беларускага тэатральнага аб'яднання працягваецца агляд творчых калектываў рэспублікі пад рубрыкай: «Прысвячаецца XXVI з'езду КПСС і XXIX з'езду КПБ».

На гэты раз мінчане і госці сталіцы сустрэліся з артыстамі Белдзяржфілармоніі. Гэта сустрэча перарасла ў сапраўднае свята музыкі, песні і паэзіі. З уступным словам выступіў дырэктар Белдзяржфілармоніі Я. Б. Парватаў. Ён расказаў аб рабоце філармоніі за апошнія гады, аб рэпертуарных пошуках і знаходках творчага калектыву, падзяліўся творчымі планамі на будучае.

Затым артысты філармоніі выступілі з цікавай і разнастайнай канцэртнай праграмай, у якой прагучала музыка Моцарта, Даргамыжскага, Дворжака, беларускіх кампазітараў, песні Г. Маўсесяна і М. Тарыверадзіева ў выкананні лаўрэата Усесаюзных конкурсаў эстрады С. Кульпы. Усё часцей пачынаюць звяртацца артысты эстрады да нацыянальнай фальклорнай спадчыны. Гэта хораша прадэманстравалі песні «Ой, рэчанька, рэчанька» і «Ой, сеяла Ульяніца лянок», якія з поспехам выканала Л. Сладзінская. Аматары паэзіі з задавальненнем сустрэліся з паэзіяй Г. Гейнэ, П. Броўкі, Р. Гамзатава — іх вершы прачытаў Н. Казінін.

СПРАВАЗДАЧА КОЛАСАЎЦАЎ

Эстафету святочных справаздач ад філарманістаў прынялі артысты Акадэмічнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатра імя Якуба Коласа. Мінчане радасна віталі артыстаў з Віцебска, з якімі іх звязвае даўняя і цесная дружба. Вечар адкрыў народны артыст БССР М. Яроменка. Пра творчы шлях тэатра расказаў яго дырэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў Г. Асвяцінскі. За гады дзесятай пяцігодкі тэатр перажыў некалькі хвалюючых падзей: у 1976 годзе ён адзначыў сваё пяцідзесяцігоддзе і быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, у 1977 годзе тэатру прысвоена ганаровае званне акадэмічнага, з вялікім поспехам прайшлі гастролі ў Маскве і ў гарадах Украіны. За гэты ж час былі пастаўлены многія новыя спектаклі, сярод іх такія цікавыя работы, як «Сымон-музыка», «Летась у Чулімску», «Кастусь Каліноўскі» і інш.

Затым выступіў галоўны рэжысёр, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі В. Мазынскі. «Самая галоўная наша мэта, — сказаў ён,—гэта народнасць, спасціжэнне народнага характару ва ўсіх праявах на важных гістарычных зломах».

Добрай ілюстрацыяй гэтага сталі фрагменты са спектакляў «Сівія коні на чырвонай траве» М. Шатрова, «Тры мяшкі засмечанай пшаніцы» У. Цендракова, «Закон вечнасці» Н. Думбадзе і інш. Гледачы горача апладзіравалі народнаму артысту СССР Ф. Шмакаву, народным артыстам БССР У. Куляшову, Г. Маркінай, І. Матусевічу і многім іншым.

ЧУЙНЫ ПОЗІРК

«Ёсць мастакі, чыя творчасць трывала і непарыўна звязана з роднай зямлёй: у судакрананні з ёй яны, падобна Антэю, чэрпаюць новыя сілы. Да такіх адносіцца і Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка»,—так піша мастацтвазнавец Вольга Воранава, аўтар тэксту і складальнік альбома «Гаўрыла Вашчанка», які выпушчаны выдавецтвам «Советский художник» у папулярнай серыі «Майстры савецкага мастацтва».

Пра творчасць Г. Вашчанкі—заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, прафесара,—бадай, лепш і не скажаш. Сапраўды, усё тое, што створана гэтым таленавітым мастаком у розных жанрах, заслугоўвае самай сур'ёзнай і высокай ухвалы. У гэтым няцяжка пераканацца, калі бліжэй пазнаёміцца з альбомам. Паасобныя раздзелы яго — «Нацюрморт», «Пейзаж», «Партрэт», «Тэматычная карціна», «Манументальнае мастацтва»—яскрава сведчаць: талент Г. Вашчанкі—надзвычай шматгранны і яркі, глыбінны ў сваёй сутнасці.

Е. ДРОМІН.

ПРЫЙШОЎ ДА ЧЫТАЧОЎ

Творы вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Васіля Быкава карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нашай краіне і за мяжой. І вось новае сведчанне гэтай папулярнасці. У першыя дні новага года чытачы атрымалі першы том збору яго твораў у чатырох тамах. Змест кнігі склалі ранняя аповесці пісьменніка «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Здрада», «Альпійская балада».

Крытык Д. Бугаёў у прадмове «Эпапея працягваецца» робіць высокую ацэнку творчасці В. Быкава.

У ГАСЦЯХ — УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

Гэты вечар надоўга застанецца ў памяці студэнтаў і выкладчыкаў Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Да іх у госці прыехаў вядомы беларускі пісьменнік, аўтар шырокавядомых раманаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі» і іншых Уладзімір Караткевіч.

Слова пра госця, яго творчасць сказаў загадчык кафедры беларускай літаратуры, пісьменнік У. Калеснік. Уражаннямі ад прачытаных кніг У. Караткевіча падзяліліся студэнты М. Варвашэвіч, Л. Шпар, А. Янкевіч і іншыя.

У. Караткевіч адказаў на шматлікія пытанні прысутных, расказаў аб творчых планах.

У. БАРЫСЮК.

ВЕЧАР САТЫРЫ І ГУМАРУ

Па ініцыятыве Магілёўскіх абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў БССР і таварыства кнігалюбаў у Крычаве праведзены літаратурны вечар сатыры і гумару. Вечар у Доме культуры цэментнікаў адкрыў сакратар парткома Крычаўскага цэментна - шыфернага камбіната А. Логвінаў. Са словам «Сатыра і гумар у барацьбе за чысціню савецкай маралі» выступіў выкладчык Магілёўскага культасветвучылішча імя Н. К. Крупскай, рэжысёр народнага тэатра В. Ермаловіч. На кніжных паліцах у гэты час з'явілася кніжка гумарэсак «Маўчанне навыперадні» мясцовага радыёжурналіста Апанаса Палітыкі. Аўтар пазнаёміў прысутных са сваёй творчасцю. Кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Галасы над Сожам» М. Коўзелеў расказаў аб выхаванні маладой літаратурнай змены.

На вечары выступіў адказны сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР А. Пысін.

Артысты Краснапольскага народнага тэатра і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці прачыталі сатырычныя і гумарыстычныя творы беларускіх пісьменнікаў.

А. ВАСІЛЬЕУ.

УСЁ ПРА МІНСК...

Аглядны нарыс і каля 1700 артыкулаў пра найбольш значныя падзеі жыцця беларускай сталіцы, яе плошчы, вуліцы, прадпрыемствы і навучальныя ўстановы, тэатры, кіно, развіццё літаратуры і мастацтва змешчана ў энцыклапедычным даведніку, які падрыхтавала галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Кніга, прыгожа, з густам аформленая, выдадзеная на высокім паліграфічным узроўні, так і называецца—«Мінск».

У даведніку расказваецца літаральна ўсё пра нашу сталіцу, пра яе ўчарашні і сённяшні дзень. У ім можна прачытаць пра развіццё транспарту, сувязі, пра ахову здароўя насельніцтва, даведацца пра найбольш значныя населеныя пункты, што знаходзяцца ў прыгарадах, пра санаторыі, прафілакторыі, вадасховішчы, зоны адпачынку.

На дапамогу самым дапытлівым прыйдуць карты і схемы, храналагічная табліца самых важных падзей са шматвяковай гісторыі горада. У канцы даведніка прыводзіцца спіс літаратуры пра беларускую сталіцу і яе жыхароў.

Да ўсяго трэба дадаць, што энцыклапедычны даведнік «Мінск» багата ілюстраваны і выдадзены масавым тыражом.

ЛЕНІН, ПАРТЫЯ, СУЧАСНІК...

Р. Барышнікаў. Напярэдадні.

А. Сідараў. 35 гадоў назад.

В. Вырадава-Гацье. Партрэт кампазітара П. Майбарады.

В. Кушнір. Калгасны рынак.

Ажыўлена ў гэтыя дні ў Палацы мастацтваў у Мінску. Сярод трох экспазіцый, якія дэманструюцца цяпер тут, значную цікавасць выклікае выстаўка твораў украінскіх мастакоў, арганізаваная Саюзам мастакоў Украіны сумесна з Саюзам мастакоў БССР. Творы жывапісу і графікі, што склалі яе, выкананы прадстаўнікамі розных пакаленняў. Змест жа выстаўкі можна выказаць трыма словамі: Ленін, партыя, сучаснік.

«Новы час» — так назваў сваю карціну, якой адкрываецца экспазіцыя, М. Божый. Уладзімір Ільіч Ленін на палатне паказаны ва ўвесь рост, позірк яго ўдумлівых вачэй скіраваны далёка наперад. Ільіч быццам узіраецца ў твары наведвальнікаў, пытаючыся ў кожнага з нас: як жывяце вы? як несяце наперад сцяг здзяйснення ў і перамог? Ленінская тэма гучыць таксама ў карціне В. Цярновых «21 студзеня 1924 года», графічных лістах заслужанага дзеяча мастацтваў Украіны Н. Папова «Ленін і народ», Н. Шэлеста «Дэкрэты Чырвонай Арміі» і многіх іншых работах.

Ёсць нямала твораў, якія раскрываюць шматгранны характар нашага сучасніка, чалавека працы, што пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі актыўна будуе камуністычнае грамадства. Мастакі звяртаюць асноўную ўвагу на раскрыццё ўнутранага аблічча людзей, паказваюць іх вернасць любімай справе: заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны Г. Нічыпарэнка выставіў карціну «Мантажнікі стану «3600», В. Вырадава-Гацье — «Партрэт кампазітара П. Майбарады», народны мастак СССР В. Касіян — «П. Гурскі і А. Яльшоў» (метрабудаўцы)...

Гучыць на выстаўцы і тэма Вялікай Айчыннай вайны, але найчасцей, як напрыклад, на палатне заслужанага мастака УССР А. Сідарава «35 гадоў назад» (С. Стэхаў — камандзір спецыяльнага партызанскага атрада «Пераможцы»), яна падаецца як памяць аб незабыўных гадах, тая народная памяць, якая акумулюючы ў сабе ўсё найбольш значнае ўчарашняе, звернута ў заўтрашні дзень.

А. БЕРАЗОЎСКІ.

НА ПАЛОТНАХ — ГЕРОІ ПЯЦІГОДКІ

Правафланговым перадз'ездаўскай працоўнай вахты прысвечана мастацкая экспазіцыя, якая адкрылася ў Віцебскай абласной выставачнай зале. Амаль сто карцін ствараюць партрэтную галерэю лепшых людзей Прыдзвінскага краю. Гэта своеасаблівы вынік сустрэч майстроў пэндзля з перадавікамі вытворчасці ў час сваіх творчых паездак па прадпрыемствах, будоўлях, калгасах і саўгасах вобласці.

Сярод герояў палотнаў — лепшая ткачыха Аршанскага льнокамбіната, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Вольга Федуновіч, якая за дзесятую пяцігодку выканала 17 гадавых праграм. Высокімі дасягненнямі сустракаюць з'езд перадавая ткачыха Віцебскага дывановаго аб'яднання Надзея Хоцькіна, трактарыст калгаса «Сцяг перамогі» Пастаўскага раёна, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Васіль Дзеравянка, механізатар саўгаса «Рудакова» Віцебскага раёна Генадзій Чугуноў і многія іншыя, чые партрэты прадстаўлены на выстаўцы.

БЕЛТА.

ЛЕТАПІС КРАЮ

Дыханнем нёманскіх прастораў пранізаны палотны старэйшага мастака Гродзеншчыны, заслужанага работніка культуры БССР І. В. Пушкова. Яго персанальная выстаўка, прымеркаваная да 60-годдзя майстра, адкрылася ў абласным цэнтры. У экспазіцыі прадстаўлена больш двухсот палотнаў усіх жанраў.

БЕЛТА.

ТВОРЧЫ ВЕЧАР І. ЛУЧАНКА

У Бярэзінскім раённым Доме культуры адбыўся творчы вечар заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі Ленінскага камсамола, старшыні праўлення Саюза кампазітараў Беларусі Ігара Лучанка. На ім прысутнічалі і ўдзельнікі пастаянна дзеючага семінара пры Мінскім абкоме і гаркоме партыі «Ленінская тэарэтычная спадчына і праблемы эстэтычнага выхавання працоўных у сучасных умовах».

Перад гэтым адбылася гутарка ў райкоме партыі, у час якой першы сакратар Бярэзінскага райкома КПБ А. П. Акціненка расказаў аб справах працаўнікоў раёна.

ВЫПУШЧАНА «МЕЛОДИЕЙ»

Вялікую работу праводзіць Усесаюзная фірма грампласцінак «Мелодия» па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС, удзяляючы значную ўвагу прапагандзе культуры рэспублік, краёў, абласцей.

Сярод новых пласцінак — дыск «Юнацтва камсамольскае маё», на якім запісаны песні Ігара Лучанка. Юрыя Семянякі, Уладзіміра Алоўнікава, Яўгенія Глебава і іншых беларускіх кампазітараў.

Л. АЛЕНКІН.

НАШ КАЛЯНДАР

19 студзеня — 50 гадоў з дня нараджэння лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Наталлі ПАПЛАЎСКАЙ. Мастачка нарадзілася ў Саратаве. У 1952 г. скончыла Мінскае мастацкае вучылішча. У 1964 г. закончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

З 1960 года прымае ўдзел у рэспубліканскіх, усесаюзных і зарубежных выстаўках. Працуе ў галіне станковай і кніжнай графікі. На ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах на лепшае афармленне кніг неаднаразова ўзнагароджвалася дыпломамі і прэміямі. Сярод лепшых яе работ — серыя станковых лістоў да рамана І. Мележа «Людзі на балоце» (1964), серыі «Палессе» (1968), «Героі беларускіх народных казак» (1969) і многія іншыя.

Праца мастачкі адзначана медаллю і дыпломам Георгія Скарыны.

24 студзеня спаўняецца 50 гадоў крытыку і літаратуразнаўцу Міхасю МУШЫНСКАМУ.

Вучыўся на філфаку БДУ імя У. І. Леніна (скончыў у 1955 г.). Доктар філалагічных навук. Працуе загадчыкам сектара тэксталогіі Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР. Аўтар шматлікіх прац, сярод якіх — манаграфіі «Ад задумы да здзяйснення» (1965), «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства» (1975), «Беларускае савецкае літаратуразнаўства» (1979). М. Мушынскі адзін з аўтараў двухтомнага даследавання «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры», за што яму ў ліку іншых прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980).

30 студзеня спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Івана ШАМЯКІНА.

Іван Шамякін — адзін з самых вядомых сучасных савецкіх пісьменнікаў. Яго пяру належаць шматлікія раманы, аповесці і п'есы, якія атрымалі шырокае прызнанне чытача. Сярод іх — раманы «Глыбокая плынь», «Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», кнігі аповесцей «Трывожнае шчасце», «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт», п'есы «І змоўклі птушкі», «Залаты медаль» і іншыя.

Пісьменніцкую працу ён актыўна сумяшчае з грамадскай дзейнасцю. Іван Шамякін — член ЦК КПБ, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР, член-карэспандэнт АН БССР, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П. У. Броўкі.

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА СІМЯОНУ ПОЛАЦКАМУ

Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР сумесна з Інстытутам сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага правялі навуковую канферэнцыю, прысвечаную 350-годдзю з дня нараджэння выдатнага пісьменніка і асветніка Сімяона Полацкага.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР акадэмік І. Навуменка.

Намеснік старшыні савецкага камітэта славістаў, доктар філалагічных навук А. Рабінсон у дакладзе «Значэнне творчага подзвігу Сімяона Полацкага для рускай паэзіі» адзначыў станаўленне стылю барока ў сувязі з творчасцю С. Полацкага, падкрэсліўшы, што ён быў першым беларускім і рускім пісьменнікам, які карыстаўся сусветнай вядомасцю і ў многім прадвызначыў характар развіцця рускай літаратуры наступнага XVIII стагоддзя.

Вучоныя, выступаўшыя на канферэнцыі, гаварылі аб даследаванні творчасці Сімяона Полацкага, дзяліліся думкамі аб тэарэтычных праблемах яе асэнсавання, расказвалі пра сувязь творчасці выдатнага асветніка з беларускай палемічнай літаратурай...

Канферэнцыя садзейнічала актывізацыі вывучэння спадчыны Сімяона Полацкага, паслужыла справе аб'яднання і каардынацыі навуковых даследаванняў, звязаных з жыццём і дзейнасцю славутага пісьменніка-гуманіста.

Часопісы ў студзені

«ПОЛЫМЯ»

Друкуюцца вершы А. Вялюгіна, А. Вольскага, С. Грахоўскага, К. Кірэенкі, В. Зуёнка, М. Калачынскага, В. Гардзея, Г. Пашкова, а таксама К. Шавялёвай (пер. Ю. Свіркі).

Прапануецца пачатак першай часткі гістарычнага рамана І. Шамякіна «Петраград—Брэст», апавяданне І. Навуменкі «Срэбныя мхі», падборка з лірычнага дзённіка Х. Жычкі «Абрус».

Апавяданні рускіх савецкіх пісьменнікаў С. Сартакова, В. Кажэўнікава, Ю. Бондарава, С. Залыгіна, В. Астаф'ева, У. Салаухіна пераклалі А. Жук, А. Кудравец, В. Адамчык, І. Пташнікаў.

«Вяршыні абавязваюць» — публіцыстычны артыкул Я. Бабосава, «Векапомнае» — успаміны І. Клімава, «Дыялогі аб палескай цаліне» — нарыс Я. Радкевіча.

Слова пра І. Шамякіна (да 60-годдзя пісьменніка) гаворыць П. Дзюбайла — «На быстрыні жыцця».

Пад рубрыкай «Крытыка і літаратуразнаўства» змешчаны таксама артыкулы І. Дуброўскага «Аператыўны жанр», Ю. Пшыркова «Улюбёны ў красу і прыгажосць», успаміны П. Прыходзькі пра А. Куляшова «Бесядзь — яго калыска».

Новыя кнігі рэцэнзуюць Л. Савік, В. Ярац, І. Ключановіч, І. Чарота.

У раздзеле «Культура мовы» — артыкул Н. Кавалёвай «Таямніцы роднага слова».

«МАЛАДОСЦЬ»

Нумар адкрываецца вершамі Ю. Свіркі. Змешчаны таксама паэма Р. Тармолы «Роздум пачуцця», падборкі вершаў В. Хаўратовіча, А. Касценя, В. Жыгунова.

В. Блакіт выступае з аповесцю «Шануй імя сваё».

Пачынаюць публікавацца «Дзённікі. Запісныя кніжкі» І. Мележа.

«Паказвае Мінск» — фотарэпартаж В. Ждановіча.

«Ні дня без падзеі» — інтэрв'ю А. Гардзіцкага з А. Вярцінскім.

Пра творчасць І. Шамякіна ў сувязі з 60-годдзем пісьменніка піша А. Савіцкі — «Заўсёды з народам».

І. Рубін рэцэнзуе новы зборнік Н. Мацяш «Прыручэнне вясны».

«БЕЛАРУСЬ»

«Рытмы дзесятай пяцігодкі ў фотарэпартажы М. Бандарыка, В. Драчова і М. Мінковіча» — матэрыялы, якія публікуюцца пад рубрыкай «У фотааб'ектыве — час». Змешчаны таксама падборкі «Насустрач XXVI з'езду КПСС», «У летапіс народнай славы» і іншыя.

Артыкулам І. Навуменкі і фотаздымкамі Ул. Крука, В. Жука, М. Мінковіча часопіс адзначае 60-годдзе народнага пісьменніка Беларусі І. Шамякіна.

Друкуюцца апавяданне З. Пракаповіча, урывак з паэмы Г. Бураўкіна «Ленін думае пра Беларусь», вершы У. Бабкова, М. Трафімчука, А. Пісарыка, В. Гурскай, Л. Пятруль.

«Спасцігаць свет і сябе ў гэтым свеце...» — гутарка Р. Барадуліна з В. Быкавым у сувязі з прысваеннем В. Быкаву звання народнага пісьменніка Беларусі.

У. Гніламёдаў разважае аб творчых пошуках сучасных беларускіх празаікаў — «Якім ты станеш, чалавек?».

Пад рубрыкай «Праблему даследуе пісьменнік» прапануюцца публіцыстычныя разважанні А. Шаўні — «Выпадак у нашым двары».

«Рэзананс» — новая рубрыка ў часопісе. Яна аб'ядноўвае матэрыялы, выкліканыя чытацкай поштай.

«НЕМАН»

Вершы І. Леткі на рускую мову пераклаў В. Гурыновіч. Публікуецца таксама падборка І. Шклярэўскага «З новай кнігі».

Сярод празаічных твораў — тры апавяданні В. Хомчанкі (пер. Ю. Канэ), аповесць В. Высоцкага «Зялёны красавік», працяг рамана У. Караткевіча «Чорны замак Альшанскі» (аўтарызаваны пер. В. Шчадрыной).

В. Вітка выступае з публіцыстычным артыкулам аб выхаванні дзяцей — «Азбука душы».

«За чужымі далямі» — старонкі з амерыканскіх запісаў А. Кудраўца.

У раздзеле «У свеце навукі» змешчаны артыкулы А. Унукава «Энергетыка і экалогія» і М. Ерашова «Вадарод...»

«Спасцігаць сучаснасць, думаць аб будучым» — гутарка В. Каваленкі з народным пісьменнікам Беларусі І. Шамякіным, якому спаўняецца 60 гадоў.

Да 450-годдзя з дня нараджэння С. Буднага прапануецца эсэ К. Тарасава «Жэрабя кінута...»

Погляд у будучыню

XXV з'езд КПСС

Аляксандр МАРТЫСЮК,
першы сакратар Слуцкага гаркома КПБ, кандыдат эканамічных навук

У нашым раёне ёсць багатыя землі. Але яны займаюць усяго каля 40 працэнтаў сельгасугоддзяў. А ўвогуле, у нас нямала супескаў, нізкіх забалочаных зямель.

Поспехі нашы атрыманы за кошт працавітасці людзей, за кошт правільнага кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, традыцыйнага працалюбства случчан. Раённая партыйная арганізацыя, улічваючы гэта, развівае здаровае працоўнае саперніцтва. Вось гэтыя фактары пры правільным падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў, прыносяць нам адпаведныя вынікі.

Наш раён неаднаразова заваёўваў пераходныя Чырвоныя сцягі ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, быў пераможцам Усесаюзнага, рэспубліканскага і абласнога сацыялістычнага спаборніцтва па вытворчасці і нарыхтоўках сельскагаспадарчай прадукцыі. Такіх узнагарод удастоены і некаторыя перадавыя гаспадаркі нашага раёна.

Работа гарадскога камітэта партыі мае свае асаблівасці. Справа ў тым, што ён кіруе і горадам, і раёнам. У нас два раўназначныя Саветы абласнога падпарадкавання: гарадскі Савет народных дэпутатаў і раённы Савет народных дэпутатаў. Пры такой структуры гарадскому камітэту партыі даводзіцца займацца развіццём эканомікі і сацыяльнымі пытаннямі і ў горадзе, і ў вёсцы.

XXV з'езд КПСС узброіў нашу партыю, увесь савецкі народ дакладнай і яснай палітычнай лініяй на пэўны перыяд, баявой праграмай дзеянняў на ўсіх напрамках камуністычнага будаўніцтва. Ленінскі курс партыі знайшоў сваё канкрэтнае выражэнне ў прадвызначэннях з'езда на новае пяцігоддзе, якія прасякнуты клопатамі аб самых кроўных інтарэсах савецкага грамадства і кожнага чалавека паасобку. Планы партыі прадугледжвалі і прадугледжваюць у арганічным адзінстве далейшы магутны ўздым эканомікі і культуры краіны, рост народнага дабрабыту, развіццё сацыялістычных грамадскіх адносін, забеспячэнне ўмоў для мірнай стваральнай працы і ўмацавання пазіцый сацыялізму ў свеце.

У выкананне рашэнняў XXV з'езда партыі савецкі народ уклаў тытанічную працу. І вынікам яе з'явіліся новыя грандыёзныя поспехі нашай краіны як у развіцці эканомікі, так і ў выкананні сацыяльнай праграмы дзесятай пяцігодкі. І ў гэтай працы ёсць часцінка самаадданай работы працаўнікоў горада Слуцка і Слуцкага раёна.

Аб'ём валавой прамысловай прадукцыі штогод у грашовым вылічэнні складае цяпер амаль 270 мільёнаў рублёў. А ў 1975 годзе, апошнім годзе дзевятай пяцігодкі, было толькі 200 мільёнаў рублёў. Гарадскі камітэт партыі ў галіне прамысловасці на першае месца ставіць рост прадукцыйнасці працы, эфектыўнасць вытворчасці і якасць прадукцыі. Дык вось, 70 мільёнаў прыбытку валавай прадукцыі прамысловыя прадпрыемствы атрымалі выключна за кошт росту прадукцыйнасці працы.

Характэрна, што абсалютная большасць прадпрыемстваў горада і раёна перапрацоўвае сельскагаспадарчую прадукцыю. Нядаўна здадзены ў эксплуатацыю новы хлебазавод, будуецца адна з буйнейшых у рэспубліцы сыраварня.

За гады дзесятай пяцігодкі зроблены значны крок і нашымі будаўнічымі арганізацыямі. Што вельмі важна, больш стабільна пачала працаваць наша самая буйная будаўнічая арганізацыя — трэст «Слуцксельбуд». Ён выканаў у раёне за гады дзесятай пяцігодкі работ амаль на 27 мільёнаў рублёў. Тры перасоўныя механізаваныя калоны трэста ПМК-80, ПМК-96 і ПМК-102 датэрмінова завяршылі пяцігодку.

У перыяд ад з'езда да з'езда галоўным клопатам гарадской партыйнай арганізацыі па сельскай гаспадарцы было далейшае паглыбленне спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. У раёне 26 калгасаў, 4 саўгасы і вучгас СПТВ-9. Сярод іх вызначаны насенняводчыя гаспадаркі па вырошчванні элітнага насення для ўсіх гаспадарак раёна. На вырошчванні насення траў спецыялізуюцца тры калгасы — імя Карла Маркса, імя Мічурына і «Гігант», збожжа — пяць гаспадарак, вырошчваннем ільну цяпер займаюцца толькі 6 гаспадарак, цукровых буракоў — 16 (а ў дзевятай пяцігодцы гэта рабілі амаль усе гаспадаркі раёна). Спецыялізацыя дала нам магчымасць сканцэнтраваць у гэтых асобных гаспадарках неабходную тэхніку, лягчэй укараняць навейшую тэхналогію, перадавы вопыт. І як вынік — павышэнне ўраджайнасці ўсіх культур і павелічэнне іх валавых збораў без пашырэння плошчаў пад гэтымі культурамі.

Праводзіцца спецыялізацыя і ў жывёлагадоўлі. Сёння ўсе калгасы і саўгасы раёна займаюцца вытворчасцю малака і першапачатковым адкормам буйной рагатай жывёлы. Заключным жа адкормам — Беліцкі жывёлагадоўчы комплекс, дзе адначасова можна паставіць на адкорм 7000 галоў жывёлы. Літаральна ў кастрычніку гэтага года на саведзе вытворчага міжгаспадарчага аб'яднання рашылі спецыялізаваць на заключным адкорме буйной рагатай жывёлы яшчэ і саўгас «Рачкавічы». Свінагадоўляй пакуль што займаюцца 22 гаспадаркі, а ў перспектыве гадаваць свіней будуць толькі тры калгасы — «1 Мая», імя Энгельса і імя Дзяржынскага. У дзвюх апошніх гаспадарках ужо пабудаваны свінагадоўчыя комплексы, а ў першай — праектуецца буйны комплекс. Гадоўля авечак сканцэнтравана ў калгасах «Мір» і «Краіна Саветаў».

За чатыры гады дзесятай пяцігодкі мы атрымалі сярэднегадавы ўраджай збожжавых і зернебабовых 27,2, бульбы — 224 і цукровых буракоў — 226 цэнтнераў з гектара. І гэта ў той час, калі з чатырох гадоў толькі адзін 1978 год быў добры па ўмовах надвор'я.

Раён датэрмінова, у ліпені 1980 года, выканаў пяцігадовы план па продажу малака, воўны і яек дзяржаве. Пяцігадовыя заданні па продажу дзяржаве асноўных прадуктаў сельскай гаспадаркі першымі ў раёне выканалі калгасы імя Арджанікідзе, «Ленінскі шлях» і племптушказавод.

Цяпер у горадзе і раёне шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда партыі. Наперадзе спаборнічаючых ідуць камуністы. Свае асабістыя пяцігадовыя заданні датэрмінова завяршылі звыш 3000 рабочых і калгаснікаў. Сярод тых, хто здзейсніў гэты працоўны подзвіг, — камуністы, камсамольцы, беспартыйныя. Гэта сталяр ПМК-102 трэста «Слуцксельбуд» Пётр Георгіевіч Сучок, вышывальшчыца фабрыкі мастацкіх вырабаў Галіна Сцяпанаўна Лятчэня, токар завода «Эмальпосуд» Уладзімір Іванавіч Зінчук, аператары машыннага даення калгаса «Рассвет» Ніна Сцяпанаўна Валасевіч і Надзея Васільеўна Шкурская і іншыя.

Сацыяльныя мерапрыемствы звязаны перш за ўсё з далейшым уздымам дабрабыту народа, стварэннем лепшых умоў працы і адпачынку людзей, збліжэннем узроўню жыцця ўсіх пластоў гарадскога і сельскага насельніцтва.

За гады дзесятай пяцігодкі па будаўніцтва аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння на вёсцы асвоена звыш чатырох мільёнаў рублёў, ды на будаўніцтва жылля — каля чатырох мільёнаў. На вёсцы пабудавана 7 клубаў, 10 дзіцячых садоў і ясляў, 14 лазняў, 4 школы, 242 кватэры, 9 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 3 фельчарска - акушэрскія пункты, у калгасе імя Кірава адкрыты калгасны санаторый-прафілакторый.

У горадзе за гады дзесятай пяцігодкі выраслі два новыя школьныя будынкі (СШ № 8 і СШ № 1), два дзіцячыя сады і амаль 95.000 квадратных метраў жылля. Цяпер у горадзе працуюць 12 сярэдніх школ, 18 дзіцячых садоў і ясляў. Уступіць у строй у гэтай пяцігодцы яшчэ адзін дзіцячы сад-яслі з басейнам і іншымі выгодамі.

Значнай падзеяй для случчан была закладка ў маі гэтага года ў горадзе новага бальнічнага комплексу на 600 ложкаў з паліклінікай на 960 наведванняў у змену. Узводзіцца будынак для стаматалагічнай паліклінікі.

Цяжка пералічыць усё здзейсненае случчанамі пад кіраўніцтвам гарадской партыйнай арганізацыі і гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў за гады дзесятай пяцігодкі. Але самым важным, мне ўяўляецца, духоўны, агульнаадукацыйны, прафесійны, ідэалагічны рост нашых кадраў. Вось некалькі прыкладаў. У свой час былы рабочы А. Васіленка стаў інжынерам, начальнікам цэха завода «Эмальпосуд». Ён закончыў завочна інстытут. Камуністы прадпрыемства прынялі яго ў рады партыі. А калі дырэктара гэтага завода вылучылі на іншую пасаду, доўга шукаць замены не спатрэбілася. Дырэктарам рэкамендавалі А. Васіленку. І ён добра спраўляецца са сваімі абавязкамі. Калектыў завода першым у горадзе датэрмінова выканаў план дзесятай пяцігодкі.

Радавым інжынерам прыйшоў пасля заканчэння ВНУ Аляксандр Васільевіч Сініла ў калгас імя Арджанікідзе. За кароткі тэрмін паказаў сябе добрым спецыялістам. Пад вопытным кіраўніцтвам аднаго з лепшых старшынь калгасаў нашага раёна А. Шутко ён набыў навыкі арганізатарскай работы, і гарком партыі вылучыў яго на пасаду дырэктара саўгаса «Белічы»...

Паўсюдна случчане працуюць з уздымам, які выкліканы падрыхтоўкай да XXVI з'езда партыі. І, як заўсёды, у авангардзе ідуць камуністы. Так, камуністы ПМК-80 на сваім справаздачна - выбарчым сходзе аднадушна вырашылі правесці ў гонар з'езда 26 ударных вахт. Гэты пачын падтрымала бюро гаркома партыі і рэкамендавала яго распаўсюдзіць на іншых прадпрыемствах, у арганізацыях. І ён знайшоў гарачы водгук сярод працаўнікоў раёна. Новыя павышаныя абавязацельствы прынялі калектывы калгаса імя Арджанікідзе, племптушказавода, іншых гаспадарак. Павышаныя абавязацельствы ўзялі многія працаўнікі раёна.

Зарука далейшых поспехаў — нашы людзі і правільна вызначаныя гарадскім камітэтам партыі галоўныя напрамкі арганізацыйнай, арганізатарскай і масава-палітычнай работы як па развіцці эканомікі, так і па сацыяльных пытаннях.

У СВЯТЛЕ РАМПЫ~КЛАСІКА

Маляўнічая афіша на нямецкай мове, якая запрашае на прэм'еру «Рэвізора»... Прыгожы гадзіннік з даравальнай гравіроўкай... Серыя здымкаў з рэпетыцый... Усё гэта сведчанні дэбрай памяці аб нядаўняй творчай камандзіроўцы галоўнага рэжысёра Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага Б. Луцэнкі ў ГДР. Там ён паставіў неўміручую гогалеўскую камедыю на сцэне Берлінскага тэатра імя М. Горкага.

Прэм'ера, якая адбылася напярэдадні новага года, была з захапленнем прынята гледачамі. У рэцэнзіях мясцовых газет, якія мінскі рэжысёр прывёз дамоў, шмат цёплых слоў сказана аб своеасаблівасці почырку пастаноўшчыка, арыгінальным, сучасным прачытанні ім шэдэўра рускай і сусветнай класікі, адзначаюцца эмацыянальная насычанасць і вобразны строй спектакля. Рэцэнзенты аднадушныя ў ацэнцы фіналу камедыі, які ўпершыню ў гісторыі пастановак «Рэвізора» раздроблены на некалькі нямых сцэн, у адпаведнасці з характарамі герояў і іх адносінамі да рэчаіснасці.

— Два месяцы, праведзеныя ў асяроддзі сяброў, былі да канца запоўнены цяжкай, напружанай, але цікавай работай, — гаворыць Б. Луцэнка. — Я шчаслівы, што яна атрымала прызнанне ў гледачоў і спецыялістаў. Гэтаму ў значнай меры дапамог высокі прафесіяналізм акцёраў берлінскага тэатра, багатая сцэнічная культура ўсіх удзельнікаў пастаноўкі. Шмат карыснага, дастойнага пераймання я ўбачыў у нашых сяброў у арганізацыі рэпетыцый, дакладным узаемадзеянні ўсіх службаў тэатра. У дружбы нашых калектываў, пачатак якой паклаў дагавор аб творчым супрацоўніцтве, наперадзе багатыя, цікавыя перспектывы.

У бліжэйшыя тыдні па запрашэнні берлінскіх калег у ГДР выязджае група беларускіх акцёраў, якія будуць заняты ў спектаклі «Рэвізор» на мінскай сцэне. Пазней мяркуецца абмен спачатку выканаўцамі вядучых роляў у гэтым спектаклі, а затым і гастролямі, уключаючымі паказ «Рэвізора» на падмостках тэатра-партнёра.

Намечана пастаноўка на беларускай сцэне трагедыі Ф. Шылера — «Каварства і каханне», якую ажыццёвіць дырэктар і мастацкі кіраўнік тэатра імя М. Горкага ў Берліне А. Хатэрле.

БЕЛТА.

Педадзездаўская трыбуна

Спадчына абавязвае

Наша перадз'ездаўская гаворка, думаецца, найперш павінна зыходзіць з таго станоўчага, што здабыта літаратурай і што неабходна для далейшага яе руху наперад. Бясспрэчна, што найбольшая творчая ўдача аўтара і дасягненне ўсёй нашай літаратуры ўвогуле — раман Івана Паўлавіча Мележа «Завеі, снежань», яго «Палеская хроніка», якая, цяпер можна смела гаварыць, стала адной з класічных вяршынь не толькі беларускай, але і ўсёй савецкай літаратуры.

Зыходзячы з урокаў творчасці і жыцця класіка нашай літаратуры, які працаваў найбліжэй да нас па часе, і прававерна будзе ацэньваць і здабытае нашай літаратурай, і намячаць перспектыву яе развіцця...

Мележ цэласна выяўляў сваю асобу ва ўсіх сферах дзейнасці, а з найбольшай паўнатой — у «Палескай хроніцы». Як грамадзянін і мастак ён рос разам са сваім галоўным творам, у якім здолеў выйсці на магістральны кірунак руху савецкай прозы і шмат у чым вызначыў яе асноўныя тэндэнцыі. Перачытваючы крытычныя і літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя актуальным праблемам літаратурнага развіцця, бачыш, што пераважная большасць гэтых праблем была рэалізавана ў цыкле раманаў «Палескай хронікі». У людзей, не дастаткова дасведчаных у асаблівасцях творчага працэсу, можа нават скласціся ўражанне, што пісьменнік знарок падладжваўся пад патрабаванні крытыкі. І хоць Мележ сапраўды з цікавасцю адносіўся да яе меркаванняў і быў добра сарыентаваны ў стане літаратурнай тэорыі, аднак справа перш за ўсё датычыць глыбіні мастакоўскага пранікнення ў жыццё, у чалавечую псіхалогію, паяднанасці непасрэднага ўспрымання рэчаіснасці з філасофскім поглядам на яе, бескампраміснасці пазіцыі аўтара, які імкнуўся нідзе не фальшывіць і не крывіць душою, гаварыць праўду і толькі праўду.

У сваіх раманах празаік здолеў не толькі паказаць пераход ад нізрынутых рэвалюцыяй да новых форм жыцця, крах уласніцкай маралі Глушакоў, але і пераканаўча раскрыў вызначальны для эпохі канфлікт у асяроддзі тых, хто асабіста адданы рэвалюцыйным ідэалам, аднак па-рознаму разумее іх сутнасць, сваё прызначэнне ў грамадстве, служэнне рэвалюцыі і ўзаемаадносіны з народам, па-рознаму ўсведамляе мэту сваёй дзейнасці.

Канфлікт гэты ў асноўным разгортваецца паміж Апейкам і Башлыковым і паступова ў арбіту свайго прыцягнення ўцягвае шмат іншых людзей з розным грамадскім становішчам, у сваёй маштабнай сутнасці скіроўваецца на вырашэнне праблемы рэвалюцыі і народа. У межах абранага для даследавання жыццёвага матэрыялу ён раскрывае агульную грамадскую атмасферу ў краіне і дазваляе нам не толькі адчуць дух таго часу, зразумець яго рухаючыя сілы, месца асобнага чалавека ў імклівым гістарычным поступе, але і больш глыбока спазнаць як вытокі наступных перамог і дасягненняў, так і часовых няўдач.

Паслядоўна захоўваючы вернасць гістарычнай праўдзе ў асэнсаванні мінулага, І. Мележ з цалкам сучасных пазіцый ацэньвае чалавека, яго ролю ў грамадстве. Апейку, якому пісьменнік шмат аддаў са сваіх запаветных пачуццяў, перадаверыў уласных думак, свайго разумення часу і чалавека ў ім, уласціва глыбока ўсвядомленая асабістая адказнасць за ўсё, што не толькі адбываецца побач і непасрэдна закранае самога ці датычыць абавязкаў па службе, але і ўвогуле спраў у краіне, маральнай атмасферы ў грамадстве. Ён валодае маштабнасцю мыслення, чаго вельмі і вельмі бракуе многім сучасным станоўчым героям, хоць яны часамі займаюць куды больш адказныя і значныя, чым у старшыні валаснога выканаўчага камітэта, пасады. Апейка мысліць не толькі падзяржаўнаму шырока, але і самастойна, мае свой вынашаны погляд на падзеі і працэсы, што адбываюцца ў краіне, удзельнікам якіх непасрэдна і апасродкавана ён з'яўляецца. Менавіта з адчування, што ты не проста выконваеш функцыю безаблічнага вінціка ў добра адрэгуляванай сістэме, але і сам можаш уплываць на яе сутнасць, быць стваральнікам грамадскага прагрэсу, нараджаецца ўсведамленне ім сваёй актыўна-дзейснай ролі.

Па сваім духоўным узроўні, гуманістычных асновах дзейнасці, здольнасці перспектыўна мысліць, ставіць перад жыццём новыя праблемы ён ішоў паперадзе свайго часу і значна пераўзыходзіў акружэнне, якое вельмі часта глушыла яго ініцыятыву, замаруджвала далейшы рост як асобы і грамадскага дзеяча. Ад такога стаўлення шмат страчвае як сам Апейка, так і грамадства. Варта ў гэтай сувязі акцэнтаваць увагу на здольнасці аўтара «Палескай хронікі» гарманічна і цэласна з'ядноўваць грамадскі і асабісты пачатак як пры абмалёўцы мастацкіх характараў, так і пры паказе аб'ектыўных вынікаў іх дзейнасці. Той жа канфлікт паміж Башлыковым і Апейкам пры ўсёй яго сацыяльна-грамадскай выразнасці, нават аголенасці, мае яшчэ і чыста чалавечыя прычыны. Справа ў тым, што першы па сваім духоўным і разумовым патэнцыяле нашмат пераўзыходзіць другога, які пры ўсім яго суб'ектыўным старанні не здольны так разбірацца ў жыцці і людзях, як гэта ўмее рабіць Апейка. І хоць Башлыкоў нават у сваіх глыбока патаемных думках не прызнаецца ў гэтым, але ён па чалавечы зайздросціць Апейку і асцерагаецца яго як канкурэнта, бо бачыць, што на фоне разумнай і ўраўнаважанай дзейнасці, таго аўтарытэту, якім карыстаецца Іван Анісімавіч у людзей, яму і пры самай актыўнай дзейнасці будзе не лёгка ўтрымацца на сваім кіраўнічым становішчы. Аргументы ж Башлыкоў выкарыстоўвае зусім іншыя, менавіта такія, супрацьстаяць якім пры ўсіх яго чалавечых перавагах Апейка ў той сітуацыі не можа. Складанасць і трагізм становішча заключаецца ў тым, што Башлыкоў, Галенчык і іншыя Апейкавы антыподы выступаюць не ад свайго імя, а нібыта кіруюцца ў сваёй дзейнасці агульнапартыйнымі, агульнадзяржаўнымі інтарэсамі. Але нельга прымусіць Апейку прызнаць сваю віну, адрачыся ад таго, што складае сэнс і змест яго жыцця, сутнасць поглядаў. Нягледзячы на часовую перавагу і перамогу башлыковых і галенчыкаў, Іван Анісімавіч цвёрда верыць, што ў канчатковым выніку праўда пераможа. Гэтай веры спрыяе як арганічная, каранёвая сувязь з народам, так і вынашаная, асабіста глыбока ўсвядомленая, ідэйная перакананасць. Ні таго, ні іншага няма ў яго супраціўнікаў — і гэта Апейка добра бачыць! — што і дазваляе яму адстойваць свае прынцыпы ў здавалася б безнадзейных сітуацыях. Герой гэты раскрывае перад намі сваю чалавечую і грамадзянскую сутнасць у супрацьдзеянні моцнаму сустрэчнаму ветру, у страсцях асабістага і грамадскага напаўнення, што спрыяе нашаму перажыванню за яго, данясенню аўтарскай канцэпцыі да чытача. Прычына ж таго, што многія станоўчыя героі сучаснай літаратуры не кранаюць нашай душы, не актывізуюць пачуццяў і не нясуць у сабе важнай думкі пра свой час якраз і бачыцца ў тым, што дзейнічаюць яны ў вакуумных, штучна створаных аўтарамі ўмовах, што іх «станоўчасць» дэкларуецца, а не арганічна вынікае з іх сутнасці, сцверджанай у канкрэтных дзеяннях, думках і перажываннях, у барацьбе за новае і перадавое, якое заўсёды з цяжкасцю, у супрацьдзеянні аджылому пракладвае сабе дарогу ў будучае.

Апейка хвалюецца за свае няўдачы, перажывае за сям'ю, жыве і дзейнічае ў канкрэтных умовах часу, што ўплываюць на стыль яго паводзін. У характары Івана Анісімавіча шмат ад практычнай сялянскай закваскі, ад філасофіі чалавека ад зямлі, які спакойна і цягавіта робіць сваю канкрэтную справу, не любіць пустой гаварыльні, пазбягае згрызот і непаразуменняў. І тое, што пад уплывам абставін Апейку даводзіцца нібы знарок парушаць свой спакой, асуджаць сябе і сваю сям'ю на жыццёвую неўладкаванасць, балюча адбіваецца на яго душы, аднак ён не здаецца перад нягодамі, бо прынцыповасць становіць сабой тое асноўнае, што вызначае лінію яго паводзін у жыцці, у адносінах з іншымі людзьмі.

Гэты па-мастацку паўнакроўны, па-чалавечы пераканальны вобраз камуніста-ленінца надзвычай блізкі нашаму ўяўленню пра эстэтычны ідэал, пра сутнасць гарманічнай, высакаразвітай асобы. Нездарма ж «Литературная газета», ацэньваючы здабытае ўсёй савецкай літаратурай за апошні час, зазначае, што «дасягненні Івана Мележа адлюстроўваюць у сабе галоўную тэндэнцыю развіцця нашай сучаснай літаратуры» і з мноства створаных ёю герояў вылучае, як найбольш наватарскі і значны, вобраз Апейкі:

«Менавіта Іван Мележ, — зазначае Новікаў, — зрабіў найвялікшае мастацкае адкрыццё, стварыўшы вобраз Апейкі, які ўвасобіў у сабе характэрныя рысы сапраўды народнага героя. У яго раманах найвастрэйшыя канфлікты, найвастрэйшая сацыяльная барацьба, шырокая карціна народнага жыцця Палесся з усімі яе прыкметамі. Усё ўздыблена, усё скіравана ў будучыню. Іван Мележ схоплівае асаблівае, тое, што складае вышэйшы пункт гэтага ўздыбленага часу, — Апейку. І ў ім паказвае, як час жыве ў дзеяннях, думках, пачуццях, спадзяваннях героя, які выйшаў з самых глыбінь народных мас і стаў выразнікам лепшых іх якасцей».

Мэта Апейкавай дзейнасці — чалавек і яго шчасце. Зыходзячы з гэтага, вынікаюць і прынцыпы ўзаемаадносін з людзьмі: імкненне заглянуць у душу чалавека, пераканаць яго ў мэтазгоднасці таго ці іншага рашэння, зразумець, чаму ён, калі такое здараецца, не пагаджаецца і не падтрымлівае гэтых рашэнняў. Апейка, карацей кажучы, жыве з людзьмі і для людзей. Башлыкоў жа, наадварот, не толькі не спрабуе ў сваёй дзейнасці наблізіцца да канкрэтнага чалавека, але і ўсякім чынам, кіруючыся нібыта прынцыповымі меркаваннямі, пазбягае гэтага. Прыгадаем у гэтай сувязі тыя мясціны з незакончаных раздзелаў рамана «Завеі, снежань», дзе расказваецца, як Башлыкоў і Апейка пасля пасяджэння акружкома вяртаюцца дахаты. Башлыкоў у душы злуецца на Апейку за выступленне, аднак за ўсю няблізкую дарогу не распачынае гаворкі пра гэта, не аспрэчвае і не пераконвае яго ў сваёй праваце, цешачы сябе думкай, тайком радуючыся, што неўзабаве дасць яму бой, і адразу ж па прыездзе праводзіць бюро райкома, дзе рэзка нападае на Апейку, высоўваючы супраць яго ідэйныя і палітычныя абвінавачванні. І гэта не адзіны выпадак чалавечай адчужанасці Башлыкова ад тых, з кім ён робіць агульную справу і, здавалася б, павінен быць таварыскім, добразычлівым і шчырым. Холадна, з зацятай маўклівасцю, нібы за падвопытнымі, назірае Башлыкоў за падначаленымі, высочваючы моманты, калі нехта з іх спатыкнецца і яго ўчынак у крытычным асвятленні можна будзе падаць у час афіцыйнага выступлення, кіруецца, адным словам, у адносінах з многімі сваімі таварышамі па працы не чалавечымі і не прынцыповымі, а палітыканскімі меркаваннямі, паколькі імкнецца стварыць найбольш бяспечную для сябе атмасферу ўсеагульнага маўклівага падпарадкавання, згоды з усім, што ён робіць і чаго хоча.

Адзіны выпадак, дзе чалавечае прарываецца вонкі, здарыўся ва ўзаемаадносінах Аляксея Іванавіча з Ганнай, але, як вядома, Башлыкоў і тут заглушыў у сабе парывы сэрца і пазней, пра што сведчаць незавершаныя раздзелы, укамянела выслухоўвае Ганну ў нялёгкі для яе жыцця момант, усім сваім выглядам паказваючы, што яны абсалютна чужыя людзі, паміж якімі ніколі нічога блізкага не было і не магло быць. Заставацца проста чалавекам, гаварыць бы роўны з роўным, з падначаленымі, як гэта робіць Апейка, Башлыкоў не ўмее, не можа і не хоча, усякім чынам асцерагаецца неафіцыйных асабістых кантактаў, быццам бачыць у гэтым асноўную небяспеку для сябе і сваёй дзейнасці на кіраўнічай пасадзе.

Калі мы параўнаем грамадскую сутнасць Апейкі і Башлыкова, у вочы кідаецца адна вельмі важная асаблівасць: першы з іх не адлучае сябе ад народа, аднолькава лічыць сваімі яго радасці і болі, перажывае іх, нібы свае ўласныя, для другога ж народ — гэта ўсяго толькі сфера дзейнасці, маса, якая павінна без разваг і сумненняў падпарадкоўвацца такім кіраўнікам, як ён сам. Нават не ўзнікае і пытання — патрэбна гэта самому народу ці не, прынясе яму шчасце ці гора! Галоўнае — дзейнічаць, дзейнічаць напорна і актыўна, каб гэтая дзейнасць была заўважана і адзначана. А калі нешта не ладзіцца, зрываецца, ці ажыццяўляецца не так хутка, як хочацца — значыць вінавата ўся тая маса!

Башлыкоў — актыўны, дзелавы чалавек, але справа ў тым, што гэтыя самі па сабе добрыя якасці, не забяспечаныя гуманістычным сэнсам дзейнасці, уменнем мысліць шырока і перспектыўна, могуць прывесці да адваротных вынікаў: адсунуць назад мэту, за дасягненне якой герой з такой самаадданасцю змагаецца.

У двух тыпах чалавечых паводзін, у двух стылях кіраўніцтва — апейкаўскім і башлыкоўскім — пісьменнік раскрыў важны не толькі для 20-х гадоў, але і для нашага часу канфлікт: хіба ж сёння, чытаючы аповесці і раманы, прысвечаныя вясковаму і гарадскому жыццю, гледзячы п'есы на так званую вытворчую тэму, не сутыкаемся мы з падобнымі прынцыпамі, адзін з якіх заснаваны на асабістай адказнасці за ўсё, увагай да канкрэтнага чалавека, а другі на фармальна-бюракратычным стаўленні да сваіх абавязкаў, абыякава-адчужанымі адносінамі да людзей.

Справа, вядома, не толькі ў канфлікце самім па сабе, але і ў яго сацыяльнай значнасці, і ў паўнакроўнасці мастацкага ўвасаблення. У раманах І. Мележа ён даследуецца з глыбокім пранікненнем у псіхалогію характараў, грамадзянская сутнасць якіх выпрабоўваецца не ў лакальных па сэнсу спрэчках, яе ў прыватных момантах чалавечага быцця, а ўвесь час выкіроўваецца на раскрыццё з сучасных ідэйна-эстэтычных пазіцый сутнасці эпохі ў яе чалавечым змесце.

Нягледзячы на тое, што ў раманах сюжэтнае развіццё звязана з людзьмі рознай светапогляднай арыентацыі, нярэдка зусім адарванымі і далёкімі ад народа, думка пра народ увесь час прысутнічае, жыве, гэтай думкай вымяраецца гістарычная і маральная апраўданасць усіх мастацкіх характараў. Народ у раманах І. Мележа — тут ёсць чаму павучыцца—малюецца без сентыментальнага прыхарошвання, жыве актыўным, асабліва цяпер, пасля рэвалюцыі, жыццём, і яго асобныя прадстаўнікі знаходзяцца ў складаных дачыненнях паміж сабой, змяняюцца ў той ці іншы бок. Зрэшты, будучы кожны па-свойму адметным, і Башлыкоў, і Галенчык, і Дубадзел выйшлі з народа, усе яны — сыны працоўных. Дык дзе ж прычына таго, што выхадцы з працоўнага народа аддаляюцца ад яго на адлегласць амаль поўнага ўзаеманеразумення, у чым яны бачаць сэнс сваёй дзейнасці і як гэтая дзейнасць адбіваецца на людзях, на агульнай грамадскай атмасферы, спрыяе, ці не, руху рэвалюцыйнага грамадства наперад? Пісьменнік імкнецца знайсці аб'ектыўны і глыбокі адказ на гэтыя вельмі істотныя пытанні, ставіць высокія патрабаванні да асобнага індывіда, да яго адказнасці перад народам, дзяржавай, перад сваім сумленнем. Гэтым надзвычай актуальным для сучаснага развіцця літаратуры пафасам асабістай адказнасці чалавека перад грамадствам і грамадства перад чалавекам прасякнуты ўсе раманы «Палескай хронікі».

Аднак кожны з іх уяўляе сам па сабе своеасаблівую ў ідэйна-мастацкіх адносінах, сюжэтна і праблемна завершаную, эстэтычную сістэму. Менавіта ў здольнасці мастака ў кожным наступным творы паўставаць у новым абліччы бачыцца яшчэ адзін важны ўрок для нашай літаратуры.

(Заканчэнне на стар 6—7).

ДАСЛЕДУЕЦЦА ЛІТАРАТУРА СУЧАСНАСЦІ

ВІДАЦЬ, крытыка выканае сваю галоўную місію тады, калі яна зможа вылучыць са шматграннай і стракатай карціны сучаснага літаратурнага працэсу найбольш перспектыўныя лініі мастацкага развіцця. У лепшых творах беларускай літаратуры заўсёды жыло імкненне стварыць вобраз часу, улавіць яго пульс, даць шырокія філасофскія абагульненні, намаляваць выразныя сацыяльна-псіхалагічныя тыпы.

Аўтары зборніка «Беларуская літаратура. Дзень сённяшні», у якім даследуецца літаратура апошняга дзесяцігоддзя, якраз і звярнулі ўвагу на самыя істотныя тэндэнцыі ў развіцці нашай сучаснай літаратуры.

У полі зроку даследчыкаў — шматлікія творы беларускай паэзіі, прозы, мастацкай дакументалістыкі, літаратуры для дзяцей. Шкада толькі, што абыдзена наша сучасная драматургія, якая заваявала перадавыя пазіцыі на ўсесаюзнай арэне.

Пачынаецца зборнік раздзелам «Далягляды лірыкі». У ім сённяшняя беларуская паэзія паўстае ў разнастайнасці творчых індывідуальнасцей розных пакаленняў, што актыўна ўзаемадзейнічаюць і дапаўняюць адна другую. Аўтар названага раздзела В. Бечык даследуе найбольш значныя дасягненні беларускай лірыкі апошняга часу — лірычныя цыклы вершаў П. Броўкі, паэтычныя зборнікі М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, а таксама адзначае высокую творчую актыўнасць, мастацкую спеласць Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, С. Гаўрусёва, Н. Гілевіча і іншых паэтаў гэтага пакалення. Нельга не пагадзіцца і з тым, што ў нашай сучаснай лірыцы значна ўзмацнілася імкненне да мастацкай шматграннасці, да паўнаты і шырокай маштабнасці ў адлюстраванні жыцця, да яго больш глыбокага філасофскага асэнсавання.

В. Бечык слушна падкрэслівае, што лепшыя здабыткі паэзіі апошняга дзесяцігоддзя бяруць свой выток у тых зрухах, якімі пазначана жыццё канца 50—60-х гадоў.

Надзвычай перспектыўным з'яўляецца сцвярджэнне крытыка аб тым, што філасафічнасць мыслення ў паэзіі, як і рамантычная ўзнёсласць, — гэта адзін з момантаў фарміравання своеасаблівага ўнутранага стану, «духоўнага свету сучасніка, што адчувае сябе сёння ў цэнтры гістарычнага быцця чалавецтва, на скрыжаванні галоўных дзейных сіл нашай сучаснасці». У сувязі з гэтым у сучаснай паэзіі ўзрастае пачуццё адказнасці за жыццё, будучыню. Беларуская філасофская лірыка не стала сухой і рацыяналістычнай. У вершах і паэмах А. Куляшова, напрыклад, медытацыя спалучаецца з пранікнёным заклікам:

Далёкае разгледзець арліным вокам,
Лаві на слых ледзь чутны крок бяды:
Мяне абраўшы, мусіш быць прарокам.
Як не прарокам, кім жа быць тады?

Так гаворыць сама паэзія ў паэме «Варшаўскі шлях».

Насуперак прыхільнікам цьмянага, сацыяльна неакрэсленага філасофствавання. В. Бечык у сваім артыкуле смела перакладае змест вобразаў на мову грамадзянскіх паняццяў, і ў гэтым — адна з перспектыўных тэндэнцый сучаснай крытыкі.

Цікавасць уяўляе раздзел А. Гурскай «Мастацкія пошукі лірыкі». У ім закрануты некаторыя важныя пытанні, звязаныя з мастацкай формай лірычных твораў, выбарам адпаведных паэтычных сродкаў, з вядучымі стылявымі напрамкамі ў беларускай лірыцы нашых дзён.

У адным з раздзелаў зборніка ідзе гаворка пра магчымасці сучаснай беларускай паэмы (аўтар М. Арочка), прасочваюцца шляхі яе далейшага ідэйна-мастацкага і жанравага развіцця, аналізуюцца асноўныя разгалінаванні сучаснага паэтычнага эпасу. Слушна заўважана, напрыклад, што ў апошнія гады пачаўся працэс «перабудовы» традыцыйнага тыпу апавядальна-сюжэтнай паэмы («Далёка да акіяна» А. Куляшова, «Поле жыцця» А. Русецкага), што тып ліра-маналагічнай паэмы атрымаў новае развіццё ў творчасці А. Куляшова («Варшаўскі шлях»), К. Кірэенкі («Трыпутнік»), М. Лужаніна («Як нараджаўся новы свет»), што адраджаецца жанр драматычнай паэмы («Хамуціус» А. Куляшова). Для сучаснай беларускай паэмы, як сцвярджае аўтар раздзела, надзвычай важным стала асэнсаванне дзейнасці буйной гістарычнай асобы, якая адыгрывала ў пэўны перыяд значную ролю ў грамадскім і культурным жыцці народа. Пра гэта сведчаць паэмы А. Куляшова, М. Танка, Г. Бураўкіна, А. Бачылы, у якіх бачым створаныя паэтамі вобразы выдатных сыноў беларускага народа — Каліноўскага, Скарыны, Багдановіча і інш.

Аднак артыкул М. Арочкі выклікае і сур'ёзнае пярэчанне ў прынцыповай ацэнцы паэмы Г. Бураўкіна «Ленін думае пра Беларусь», зводзячы яе вартасць да таго, што яна з'яўляецца толькі творам «у цэлым этапным у мастацкім набытку паэта». Крытык таксама беспадстаўна папракае аўтара паэмы за «малааблічнасць» маналогаў Купалы, Каліноўскага і Скарыны. Аднак папрок гэты, на нашу думку, не мае пад сабою грунту. Далей, ён правільна піша пра задуму аўтара — «стварыць пранікліваe маштабна-гістарычнае бачанне вялікаснай постаці правадыра», але гэта толькі адзін аспект праблемы ў творы. Творчасць Г. Бураўкіна апошніх год прасякнута імкненнем адкрыць гераічнае ў звычайным. Паэт асцерагаецца штучнай, халоднай гераізацыі. «Не рабіце з людзей багоў» — яго праграмны заклік, творчае крэда. І гэтым тлумачыцца своеасаблівасць абмалёўкі персанажаў паэмы. Г. Бураўкін не ставіў перад сабой мэты дасягнуць поўнага самавыяўлення герояў у маналогах — такой задачы яшчэ, здаецца, нікому не ўдалося вырашыць у творах гістарычнай тэматыкі. Ён імкнуўся наблізіць сучасніка, звычайнага чалавека да таго рубяжа, на якім ён, застаючыся самім сабой, далучаецца да гераічнага дыхання гісторыі. Такі падыход да тэмы на сучасным этапе нам здаецца апраўданым і актуальным. Г. Бураўкін у паэме свядома адмовіўся ад ускладнення структуры, заклікаючы сучасніка глянуць у мінулае, ажывіць сваю гістарычную памяць.

Заключаючы гаворку пра сучасную беларускую паэму, М. Арочка прыходзіць да зусім правільнага вываду, што гэты жанр засведчыў «новыя невычэрпныя магчымасці для далейшага развіцця паэтычнага эпасу», што ў паэме «ідзе пранікліваe асэнсаванне важных сацыяльных і маральных праблем сучаснасці, а таксама ўзняцце нялёгкіх драматычных пластоў гісторыі з праекцыяй у сучаснасць», што «яна ўся на шляху далейшых унутраных пошукаў».

Глыбокай змястоўнасцю, высокім навукова-тэарэтычным узроўнем вылучаецца раздзел пад назваю «Проза. Духоўны свет чалавека» (аўтар С. Андраюк). Тут непасрэднаму аналізу твораў сучаснай беларускай прозы ў аспекце пастаўленай аўтарам праблемы папярэднічаюць тэарэтычныя разважанні пра стварэнне пісьменнікамі глыбокіх характараў, пра раскрыццё ўнутранага свету чалавека, яго сацыяльнага і маральна-этычнага вобліку, пра імкненне нашых сучасных празаікаў (асабліва раманістаў) да мастацкага сінтэзу, да арганічнага адзінства ў адлюстраванні эмацыянальнага і інтэлектуальнага, канкрэтна-гістарычнага, рэальна-бытавога і агульнанароднага, агульначалавечага, філасофскага. Затым аўтар пераходзіць да непасрэднага разгляду твораў беларускай прозы апошняга дзесяцігоддзя (І. Мележа, В. Быкава, Я. Брыля, І. Пташнікава, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, В. Адамчыка, А. Кудраўца і інш.), падкрэсліваючы тую думку, што ў ёй выразна выяўляюцца дзве тэндэнцыі ў падыходзе да рэчаіснасці і чалавека. З аднаго боку — гэта імкненне праз лёс аднаго чалавека паказаць і асэнсаваць глыбінныя тэндэнцыі грамадства, народа, яго маральны стан. Адсюль — такое ўважлівае даследаванне ўнутранага свету чалавека ў яго самых непасрэдных і самых блізкіх сувязях з навакольным светам. З другога боку — паспяховыя спробы раскрыць, паказаць тэндэнцыі больш агульныя, больш шырокага плана, тэндэнцыі, якія закранаюць лёс народа, эпохі. Новая канцэпцыя чалавека ў прозе нашых дзён, слушна заўважае даследчык, асабліва выразна праяўляецца ў такіх вызначальных, асноўных аспектах мастацкага паказу чалавечага быцця, як узаемаадносіны чалавека і абставін, чалавека і грамадства. У паказе пісьменнікамі ўзаемаадносін чалавека і грамадства выразна адчуваецца і гуманістычная тэндэнцыя, якая асабліва праявілася ў «Палескай хроніцы» І. Мележа, аповесцях Я. Брыля.

Раздзел «Проза для дзяцей. Юны герой і сучаснасць», у якім Э. Гурэвіч разглядае беларускую дзіцячую літаратуру нашых дзён у сувязі з працэсамі, выкліканымі навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй, з выхаваўчымі і педагагічнымі праблемамі. У цэнтры ўвагі даследчыцы — юны герой, праз асобу якога і адбываецца галоўным чынам мастацкае пазнанне рэчаіснасці. На матэрыяле твораў В. Хомчанкі, А. Васілевіч, П. Місько, У. Дубоўкі, В. Віткі, А. Кобец-Філімонавай, У. Машкова і іншых аўтараў паказана, як рэагуе літаратура на змены ў сацыяльным і духоўным жыцці юнага героя, выкліканыя эпохай НТР, як на старон-

Беларуская літаратура. Дзень сённяшні. Рэдактар П. Дзюбайла. Мінск, «Навука і тэхніка», 1980.

СПАДЧЫНА АБАВЯЗВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

Пісьменнік, апрача ўсяго іншага, вельмі добра разумеў чытача, хаця ніколі і не падладжваўся пад нізкапробныя густы, асцерагаўся стаць надакучлівым хранікёрам падзей, увесь час мяняў рэгістры ўздзеяння, імкнуўся будзіць ад заспакоенасці і дрымоты яго пачуццё і думку, трымаць чытачоўскую ўвагу ў неаслабным напружанні, няспынна пашыраючы ідэйна-мастацкія далягляды сваіх раманаў. Ён не адносіўся да тых аўтараў, якія жывуць за кошт здабытай славы і рухаюцца, колькасна памнажаючы свае здабыткі, а напорна пракладваў свой шлях наперад па няезджаных, цаліковых прасторах.

«Палеская хроніка» ў перспектыве задуманага аўтарам засталася не скончаным творам: з пяці запланаваных раманаў напісана тры. Але, чытаючы іх, не ўзнікае ўражання, што тут нешта не даказана і не выяснена — перад намі класічная па завершанасці трылогія, кожная частка якой з'яўляецца самастойным, паэтычна непаўторным творам.

Іншая справа, што час, пра які піша І. Мележ, калі карыстацца прыведзеным вышэй вызначэннем В. Новікава, настолькі ўздыблены, настолькі насычаны канфліктамі, якія ставяць добра знаёмыя вобразы ў нечаканыя сітуацыі пановаму высвечваюць іх характары, што для пісьменніка створанае, застаючыся самацэнным па сваёй значнасці, разам з гэтым з'яўлялася ўсяго толькі стартавай пляцоўкай для ўзлёту да новых вышынь, для пастаноўкі і вырашэння на новым эстэтычным вітку новых чалавеказнаўчых і сацыяльных праблем. Так, даследуючы лёс Яўхіма Глушака, які ўжо быў гатоў працаваць у калгасе ці пайсці на будоўлю, але, ратуючыся ад Дубадзела, ад таго пакарання, што пагражала яму, збег у лес і стаў бандытам, Мележ з вялікай мастацкай сілай паказвае трагедыю чалавека-адшчапенца, які паддаўся дзікай злосці на ўсё і на ўсіх, абудзіў у сабе звера, стаў усім чужы і яму стала ўсё чужое на сваёй жа, роднай зямлі.

Асэнсоўванне яго трагедыі, разам з гэтым, дазваляе нам лепш зразумець тое, як ва ўмовах акупацыі здолела на тэрыторыі Беларусі жыць і змагацца паўмільённая партызанская армія — здолела, бо ўвесь час і ўсюды адчувала падтрымку і дапамогу ўсяго народа, які верыў у перамогу над чужынцамі і бачыў у партызанах сваіх абаронцаў і заступнікаў.

Калі б Мележу лёс пашчасціў да канца здзейсніць задуманае і поўнасцю завяршыць «Палескую хроніку», адзін з раманаў якой прысвячаўся ваеннаму часу, то хто ведае, ці не былі б пажаданні нашай крытыкі і грамадскасці пра найбольш значны твор, у якім бы знайшлі паўнакроўнае мастацкае ўвасабленне веліч народнага подзвігу, духоўная моц народа, трагізм яго існавання пад акупацыяй, пачварная сутнасць вайны, вытокі нашай перамогі над ворагам рэалізаваны ў тым, ненапісаным творы пра вайну. А потым жа, пасля «Палескай хронікі», пісьменнік планаваў раман пра сучасны горад. Не даводзіцца сумняваецца, што быў бы ён заселены людзьмі з самабытнымі характарамі, што думка пра родны народ, пра яго духоўнае ўзвелічэнне пранізвала б яго, як пранізвае яна ўсе раманы «Палескай хронікі».

Раманы палескага цыкла нязмушана падключаны да сусветнай мастацкай традыцыі, з якой можна вылучыць некалькі найбольш блізкіх таленту беларускага пісьменніка імён і твораў, аднак, думаецца, нацяжкаю было б выводзіць непасрэдную залежнасць творчасці І. Мележа ад аднаго з іх. Іван Мележ, як і кожны сапраўдны пісьменнік па меры магчымасці імкнуўся да найбольш поўнага і глыбокага засваення класічнай спадчыны, створанага папярэднікамі і сучаснікамі. Сама ж пастаноўка і завастрэнне праблемы «свайго» і «чужога», штучнага размежавання духоўных здабыткаў чалавецтва па знешніх прыкметах уяўляецца надуманай. Не баяцца «чужога» і не адракацца ад выпрацаваных на працягу вякоў родным народам духоўных здабыткаў — ці ж не гэтым простым і мудрым правілам кіраваліся ва ўсе часы і выдатныя майстры пяра, і звычайныя, маральна здаровыя, людзі, грамадзяне сваёй краіны.

Надуманымі здаюцца і разважанні наконт таго, скажам, што Чорны альбо Мележ, пачынаючы пісаць свае творы, загадзя мелі перад сабой для пераймання ўзоры з іншых літаратур і цалкам арыентаваліся на іх, адважваючыся, праўда, у асобных выпадках на прыхаваную спрэчку з вялікім папярэднікам. Калі пагадзіцца з падобнымі меркаваннямі, то

ках кніг ён праяўляе сябе ў школьным калектыве, у працы, у маральных сітуацыях, у адносінах з прыродай.

Станоўча ацэньваючы здабыткі сучаснай беларускай прозы для дзяцей, аўтар раздзела аднак правільна мяркуе, што ўвогуле проза гэта яшчэ нясмела падымае складаныя і вострыя праблемы выхавання юнага пакалення, слаба паказвае тое новае, чым багата наша сённяшняя рэчаіснасць.

Цікавым атрымаўся і раздзел, у якім даследуецца сучасная беларуская публіцыстыка, пераважна нарыс («Пяром публіцыста». Аўтар А. Лысенка). Вызначаюцца характэрныя асаблівасці сучаснага нарыса ў параўнанні з нарысам мінулых гадоў, у суадносінах з набытым вопытам, з лепшымі традыцыямі гэтага жанру ў нашай літаратуры. У поле зроку даследчыцы трапляюць творы «бягучай» публіцыстыкі, змешчаныя ў рэспубліканскім перыядычным друку, і найбольш значныя асобныя выданні («Гамоніць Палессе» І. Дуброўскага, «Арыенцір — сузор'е Арыён» М. Панасюка, «Зямля пад белымі крыламі» У. Караткевіча і інш.). Пры гэтым яны аналізуюцца як па лініі ідэйна-тэматычнай, праблемнай, так і па лініі мастацкай дасканаласці. Асаблівая ўвага звернута на сучасны нарыс-партрэт, задачай якога з'яўляецца паказ тыповых рыс, выяўленне духоўных і маральных якасцей чалавека-стваральніка, будаўніка камуністычнага грамадства, героя эпохі НТР. Аналіз дасягненняў і пралікаў сучаснага беларускага нарыса даў падставу аўтару раздзела выказаць думку аб неабходнасці павышэння мастацкага ўзроўню публіцыстыкі ўвогуле як перадумовы грамадскай дзейнасці гэтай літаратуры «пярэдняга краю».

Знаёмства са зборнікам «Беларуская літаратура. Дзень сённяшні» дазваляе зрабіць вывад, што змешчаныя ў ім навуковыя працы — гэта значны ўклад у беларускае літаратуразнаўства, у вывучэнне здабыткаў нашай літаратуры апошняга часу. Выхад яго ў свет прынясе вялікую карысць не толькі навукоўцам-літаратарам, але і пісьменнікам, і выкладчыкам літаратуры вышэйшых навучальных устаноў, і студэнтам-філолагам, і настаўнікам — усім, хто цікавіцца беларускай літаратурай, яе сённяшнім днём.

Аляксей РАГУЛЯ,
Антон СЕМЯНОВІЧ.

«НАВУКА І ТЭХНІКА», 1981

У тэматычным плане выдавецтва «Навука і тэхніка» філалагічныя і мастацтвазнаўчыя працы займаюць належнае месца.

С. Андраюк, напрыклад, прапануе чытачам манаграфію «Традыцыі і сучаснасць». У ёй раскрываецца сэнс і змест традыцый Якуба Коласа і Кузьмы Чорнага ў стварэнні мастацкага характару, праследжваецца развіццё і ўзбагачэнне гэтых традыцый у сучаснай беларускай прозе, раскрываюцца наватарскія пошукі і дасягненні ў творчасці І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, В. Быкава.

В. Каваленка ў працы «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» даследуе гісторыю творчага звароту беларускіх пісьменнікаў да міфалагічных і казачных сюжэтаў.

Л. Савік назвала сваё даследаванне «Адчуванне часу». У цэнтры яе ўвагі шляхі развіцця беларускай «вясковай» прозы. Аўтар абагульняе яе наватарскія дасягненні, падкрэслівае ўнутраную арганічную сувязь твораў беларускіх аўтараў з усесаюзным літаратурным працэсам. У кнізе аналізуюцца творы І. Мележа, М. Лобана, І. Навуменкі і іншых пісьменнікаў у цеснай суадносенасці з творамі С. Залыгіна, Ф. Абрамава, В. Астаф'ева, В. Распуціна.

Малады даследчык А. Верабей у працы «Максім Танк і польская літаратура» разглядае традыцыі польскага рамантызму XIX ст. у паэзіі М. Танка, аналізуе ўзаемадзеянне творчасці беларускага паэта і сучаснай польскай літаратуры.

Л. Гарэлік напісала навукова-папулярны нарыс «Аляксей Пысін». Даследчыца раскрывае асноўныя рысы паэзіі вядомага беларускага паэта, шляхі яго пошукаў, высвятляе некаторыя важныя заканамернасці літаратурнага працэсу.

«Пуцявінамі Янкі Купалы...»—так назваў Г. Кісялёў кнігу, падрыхтаваную ім да стагоддзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі.

І. Навуменка ў навукова-папулярным нарысе «З глыбінь народнага жыцця» праследжвае творчы шлях народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, аналізуе яго важнейшыя творы. Асабліва месца ўдзяляецца паэмам «Новая зямля» і «Сымон-музыка».

Пачынаецца падпісное выданне васьмітомнага збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Міхася Лынькова. У 1981 г. выйдуць два тамы, у якія ўключаны апавяданні і нарысы пісьменніка.

Рыхтуецца да друку на беларускай мове эпапея Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» у перакладзе вядомага грамадскага дзеяча і вучонага Браніслава Тарашкевіча. Пераклад быў зроблены ў 20-х гадах у польскай буржуазнай турме.

У галіне фалькларыстыкі прапануюцца працы К. Кабашнікава «Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні», у якой разглядаецца методыка і метадалогія параўнальнага вывучэння беларускай народнай творчасці ў працах прадстаўнікоў розных навуковых школ, і А. Фядосіка «Народная паэзія барацьбы» пра беларускую вусна-паэтычную творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Выйдуць таксама анталогія «Беларускія народныя казкі» і ў серыі «Беларуская народная творчасць» чарговы том «Восеньскія і талочныя песні».

Шэраг новых прац прапануюць чытачам мовазнаўцы. М. Бірыла падрыхтаваў трэцюю частку «Беларускай антрапаніміі» — «Структура ўласных асабовых імён». Калектывам даследчыкаў складзены зборнік «Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў». Тут даследуюцца агульныя пытанні ўзаемадзеяння беларускай і рускай моў, функцыі мовы і маўлення, станаўленне двухмоўя ў розныя перыяды. Л. Антанюк напісала манаграфію «Станавыя значэнні сумеснасці і ўзаемнасці ў беларускай мове». В. Вярэніч ужо шмат гадоў даследуе жыццё польскай мовы ў іншамоўным акружэнні. Ён выступае з працай «Польска-беларускае моўнае ўзаемадзеянне». М. Лясохін, К. Лук'яненкаў і Р. Піятроўскі напісалі манаграфію «Уводзіны ў матэматычную лінгвістыку. Лінгвістычнае дастасаванне асноў матэматыкі», у якой разглядаюць зыходныя паняцці асноў сучаснай матэматыкі адносна іх прымянення ў пабудове рада лінгвістычных мадэлей. Г. Цыхун доўгі час вывучае паўднёвыя славянскія мовы. Ён прапануе даследаванне «Тыпалагічныя праблемы балканаславянскага моўнага арэалу».

У раздзеле «Слоўнікі» падрыхтаваны калектывам складальнікаў «Гістарычны слоўнік беларускай мовы», «Слоўнік назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці» Я. Рапановіча, першы выпуск «Тураўскага слоўніка», а таксама слоўнік з усходняй гаворкі Магілёўшчыны «Народнае вытворнае слова».

У раздзеле «Мастацтвазнаўства» — тэарэтычнае даследаванне В. Нячай «Тэлебачанне як мастацкая сістэма». Р. Смольскі ў кнізе «На сцэне—бяссмерце подзвігу» даследуе багаты вопыт беларускіх тэатраў у асэнсаванні праблем гераічнага на шырокім матэрыяле аб Вялікай Айчыннай вайне. В. Церашчатава, А. Ляонава і А. Ярашэвіч склалі багата ілюстраваны каталог экспазіцыі «Музей старажытнабеларускай культуры».

Г. ЮРЧАНКА.

КНІГАПІС

Е. БОНДАРАВА. Кінастужка даўжынёю ў жыццё. Творчая біяграфія кінарэжысёра У. Корш-Сабліна. На рускай мове. Мінск. Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1980.

Прытрымліваючыся фантаў гэтай насычанай падзеямі біяграфіі, аўтар аднаўляе і тыповы працэс станаўлення сапраўды рэвалюцыйнай інтэлігенцыі, прадстаўніком якой быў народны артыст СССР Уладзімір Корш-Саблін. На яго творчым рахунку — выдатныя фільмы беларускай кінематаграфіі. Экранныя творы, якія паўсталі пад яго рэжысёрскім кіраўніцтвам, падрабязна аналізуюцца Е. Бондаравай. Прынцыпы сацыялістычнага рэалізму, якімі кіраваўся пастаноўшчык «Першага ўзвода» і «Шукальнікаў шчасця», «Канстанціна Заслонава» і «Чырвоных лісцяў», «Першых выпрабаванняў», «Масквы — Генуі», «Краху імперыі», набываюць канкрэтныя абрысы творчага метаду, плённага, выверанага часам. Паказаўшы змест і адметнасць незвычайнай асобы У. Корш-Сабліна, аўтар кнігі робіць шырокі агляд таго, што стваралі разам і побач з ім яго старэйшы таварыш Ю. Тарыч, калегі і паплечнікі. Тым самым чытач, які з цікавасцю сочыць за перыпетыямі творчага лёсу галоўнага героя гэтага мастацтвазнаўчага нарыса, атрымлівае ўражанні пра некаторыя істотныя моманты развіцця ўсяго беларускага савецкага кінематографа на працягу пяцідзесяці гадоў. Рэдкія дакументы, архіўныя матэрыялы, выказванні сяброў і калег, асабістыя гутаркі Е. Бондаравай з У. Корш-Сабліным, шматлікія фотаздымкі надаюць выданню характар манаграфіі.

К. ЛЯШЧЭНЯ.

трэба будзе прызнаць, што першапачатковым імпульсам і крыніцай натхнення пісьменніка з'яўляецца не жыццё народа, а факты літаратурнага паходжання. Вядома, часамі здараецца бачыць і такое, але гэта зусім не датычыць твораў, у якіх, як у чорнаўскіх і мележаўскіх, глыбока і па-мастацку праўдзіва асэнсоўваецца лёс народа на крутых гістарычных перавалах, малююцца яркія і нацыянальна самабытныя, укаранёныя ўсёй сваёй чалавечай сутнасцю ў родны грунт, у яго традыцыі, мараль, этыку і мову, мастацкія характары. І вядома ж, не з жадання перапісаць абранага класіка на свой слуцкі альбо палескі лад узнікала задума гэтых твораў, а з вострых патрэб духоўнага развіцця ўласнага народа, з жадання сказаць свету слова праўды пра найбольш важнае і актуальнае ў яго жыцці, з імкнення асэнсаваць з перспектывай на будучае пройдзены ім шлях.

Тут не месца прыводзіць выказванні самога Мележа, але не зашкодзіла б яшчэ раз перачытаць яго «Жыццёвыя клопаты», каб пераканацца, як пісьменнік прарастаў задумай «Палескай хронікі», як сама гэтая задума жывілася эмацыянальнай памяццю аўтара пра родны кут, пра перажытае ў маленстве і юнацтве і як гэты асабісты вопыт паступова суадносіўся і судакранаўся з вопытам усяго народа, з яго гістарычнай памяццю пра сябе.

Прыклад Мележа, як і Чорнага, пераканаўча сведчыць, што толькі дакрануўшыся да запаветнага, да глыбока перажытага ўласнай душой і сэрцам, да найраднейшага, спалучыўшы яго з роздумам пра пройдзены грамадствам шлях, асвяціўшы жыццёвы матэрыял сучасным поглядам на свет і чалавека ў ім — толькі пры такім падыходзе здолее мастак дасягнуць вялікага плёну.

Не адразу, аднак, узышоў Мележ на сваю вяршыню, маючы якую, сёння ўсёй нашай літаратуры павінна бачыцца нашмат далей і вастрэй. Шлях да «Палескай хронікі» быў досыць пакручастым і няроўным, ва ўсякім разе па творах, напісаных у першыя пятнаццаць гадоў творчай дзейнасці, прадугадаць майстра, якім выявіў сябе пісьменнік у час напісання галоўнага твора, бадай што, цяжкавата. І калі сёння, хоць і рэдка, даводзіцца сустракацца з фактамі суцэльнага адмаўлення не толькі зробленага тым ці іншым маладым аўтарам, але і перакрэслівання ўсякіх перспектыў далейшага росту, то, пачуўшы ці прачытаўшы такое, пачынаеш сумнявацца ў правільнасці менавіта такіх метадаў выхавання творчай змены. Ці не лепш, чым станавіцца ў ролю самаўпэўненараздражнёнага суддзі, паспрабаваць разабрацца, што ў маладога пісьменніка добра, а што дрэнна, што яму трэба развіваць і што адмаўляць у сабе?!

Спадчына Мележа, які вельмі часта вусна і ў друку выступаў у якасці крытыка, таксама можа служыць добрым прыкладам спакойнай, удумлівай і патрабавальнай гаворкі пра літаратуру, грамадзянскай заклапочанасці пісьменніка лёсам нацыянальнай культуры:

«Я разумею, — сцвярджаў Іван Паўлавіч у «Развагах пра нашу крытыку», — што такое — самалюбства і што такое — крыўда. Але давайце не забываць і пра тое, што, акрамя крыўды кожнага з нас, ёсць агульныя інтарэсы — літаратуры, вялікая адказнасць яе перад народам, перад партыяй. І давайце з вышыні літаратуры, як справы народнай, паглядзім, што адбываецца ў нас цяпер».

Слушны, асабліва актуальны напярэдадні нашага пісьменніцкага з'езда заклік!

Перачытваючы «Жыццёвыя клопаты», куды пісьменнік уключае ўсё напісанае ў жанры публіцыстыкі і крытыкі, нідзе не заўважыш дробязных эгаістычных страсцей і самазакханасці: чым далей, тым больш насычаліся роздумам і развагамі, станавіліся праблемнымі яго выступленні: тым вастрэй іх пранізвала турботная думка пра лёс духоўных здабыткаў роднага народа. Таму Мележава слова надзвычай цанілася, яму, гэтаму слову, верылі, яно было нібы прысуд у апошняй інстанцыі. Вось чаму вельмі патрэбнай была і ёсць сама **прысутнасць** І. Мележа ў літаратуры, як патрэбна ў ёй прысутнасць М. Танка, К. Крапівы, П. Панчанкі, Я. Брыля, В. Быкава, І. Шамякіна, А. Макаёнка, І. Навуменкі, А. Адамовіча, М. Лобана, А. Васілевіч, В. Палтаран, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, І. Чыгрынава, В. Адамчыка... Тое ж, што Івана Паўлавіча ўжо няма сярод нас, яшчэ больш павінна павысіць грамадзянскую адказнасць названых і не названых тут пісьменнікаў старэйшага і сярэдняга пакаленняў, прадстаўнікі якіх паказваюць і маладзейшым прыклады самаадданага служэння Радзіме, роднай культуры, адказнасць усіх тых, на чые плечы лёг цяжар, які з такой цягавітай добрасумленнасцю нёс ён.

У нашай літаратуры паміж з'ездамі не стала трох яе вялікіх працаўнікоў — І. Мележа, А. Куляшова і П. Броўкі, якія з годнасцю трымалі аўтарытэт беларускага мастацкага слова. Іх творчасць — заканамерны працяг той традыцыі, ля вытокаў якой стаялі Багушэвіч і Багдановіч, Купала і Колас, Гарэцкі і Чорны. І калі пачынальнікі, у часы цяжкога нацыянальнага і сацыяльнага ўціску, ідучы на самаахвярнасць, пераадольваючы пагарду, здзекі і ганенні, сапраўды раздзьмухвалі амаль што згаслае цяпельца, то сёння наша літаратура свеціць яркім, відочным здалёку, полымем. Спадчына нашых класікаў абавязвае і нас высока трымаць узняты імі сцяг, у чысціні захоўваць прынцыпы, сцверджаныя і завешчаныя нам іх жыццём і творчасцю.

Яўген ЛЕЦКА.

ПАЭЗІЯ

Казімір КАМЕЙША

Метрабудаўнікам Мінска

Тунеляў пазванкі,
Машынная ікотка...
Ну як там праз вякі
Нялёгкая праходка?
Праз век які прайшлі
І век які пад вамі?
Тугі архіў зямлі
Абмераны слаямі.
Напяты шлях,
як трос,
І пошук рэха
рэдкі.
Пасля мы ў сто калёс
Абуем тое рэха.
Пад вамі недзе там
Паснулі нашы рэкі.
Халодзіць мерзлата
Стамлёныя павекі.
Але не гасне крок,
Спяваюць нешта рукі,
Пакуль праб'ецца зрок
Да станцыі унука.
Яшчэ не хутка грук
Той сон зямны разрэжа.
Які б не быў наш грунт,
Усё ж мы створым рэха.

Позірк з вышыні самалёта

Ірвануўся горда і адчайна,
Адштурхнуў пагардліва зямлю.
І—плыве, з вачэй знікае лайнер,
Па аблоках цягнучы раллю.
Грозна гром ракоча у турбінах,
Залівае сонца плаўнікі.
І прастор
адчайна-галубіны —
Як разліў вясновае ракі.
На зямлю гляджу ў ілюмінатар
І не пазнаю цябе, зямля.
Роўна, нібы лодка,
паплыла ты,
Людзі — кропкі,
нават кропкі — хаты,
Ты — мурашнік, і не больш,
здаля.
Гэтак дзіўна ўсё і нечакана.
Гарады, як грады, праплылі.
Страшна чалавека-велікана
Мурашом убачыць на зямлі.
Вось што значыць—узляцець
высока
Ад бароў сваіх і ад сяліб.
Кропкаю здаецца мне далёкай
Родны,
Родны брат мой на зямлі.
А з зямлі мой брат прыжмурыў
вока.
І чаго ўсміхаецца, чаго?
Я, што узабраўся так высока,
Я ж таксама—кропка для яго.

Горкая вада

У той пасляваенны сенакос
Я піў ваду з блакаднае варонкі.
Шкляныя крылцы
маладых стракоз
Над галавою лапаталі звонка.
І горкаю здавалася вада,
Як тая,
што прайшла сюдой,
бяда.
А хтосьці вёў і не давёў пракос,
Зямлю і сонца
выбух скалануў.
Рассыпаліся крылцы у стракоз,
Спалох птушыны
з кронаў сыпануў.
Я моўчкі у будан пайшоў тады,
Хоць смяглі вусны,
піць не мог вады.
На ўсё жыццё хапіла той бяды.

●

Два буслы крыляюць
над бальніцай,
Кружацца...
«Вясна!» — крычу услых.
Неба у вачах, як жар,
іскрыцца,
І ляцяць, крыляюць два буслы.
Сэрца, ты само прасіла свята,
Ну дык вось, прыйшло яно,
прыйшло.
Калі б мог,
з бальнічнае палаты
Зараз бы крануў рукой крыло.
Ці не тыя птахі з Наднямоння?
Ці не заляцелі прывітаць?
Можа, сонца з крылаў
у далоні
Хочуць па-зямляцку перадаць.
Кружацца,
куляюцца ў блакіце,
Зводзяць і шырэй разводзяць
круг.
Паглядзіце ў вокны,
паглядзіце,
Паглядзіце танец птахаў двух!
Вось яны—крыло з крылом —
сышліся
І зліліся з малаком аблок.
Родны кут,
І заўтра мне прысніся
Пад буслінным веснавым крылом.

●

Над Маладзечнам—маладзік,
Ажно зямля памаладзела.
І ты, здзіўлёная,
глядзіш.
Ты так ніколі не глядзела.

У звыклым слове земляка
Ёсць нейкі даўні напамінак.
І лёгка ўздрыгвае шчака,
Уся з вяснушак і смяшынак.

На самым ганку у вясны
Няхай заседзяцца сягоння
Два нашы позіркі
і сны,
Ды нашы сыдуцца далоні.

«Рафік» з артыстамі спазніўся на дзве гадзіны, і кіраўнік групы Андрэй Курцэвіч кулём кінуўся з машыны напярэймы людзям, што ішлі і ішлі з асветленых дзвярэй клуба: трэба было апавясціць усіх, што канцэрт не сарваўся, што ён адбудзецца, няхай сабе і запозна.

У клубе заставалася яшчэ нямала народу, і тут жа, пачуўшы, што прыехалі артысты, сталі вяртацца іншыя, так што, пакуль артысты наскора пераапраналіся і рыхтавалі інструменты, клуб нанава быў набіты бітком, а ля самых дзвярэй стаялі падлеткі, перасмейваючыся з дзяўчаткамі.

У памяшканні было цёпла, пахла яловымі дровамі і свежай фарбай. Сіняя аксамітавая заслона, асветленая высокай, пад столлю, лямпачкай, пералівалася палосамі, новае чорнае фартэпіяна на сцэне прагучала пад Андрэевымі рукамі мякка і ўрачыста, і ў адказ у зале прыглушана заплескалі ў далоні.

— Ну што, пачынаеце? — прыспешыў загадчык клуба, і Андрэй, паклікаўшы акампаніятара, загадаў:

— Цягніце заслону!

Яна папаўзла ўбок, Андрэй — ладны, у чорным касцюме, у прыгожай белай кашулі — выйшаў на сцэну.

— Хлебаробам — гонар і пашана! — пачаў ён глыбокім, поўным голасам, у зале ўхвальна заапладзіравалі, пасля прыціхлі, слухаючы вершы. Акампаніятар іграў «Я люблю цябе, жыццё», за кулісай пазвоньвала струнамі цымбалістка Зіна, рыхтуючыся да свайго нумара.

«Каторы раз забываюся сказаць ёй, што нядобра мне перашкаджаць» — думаў ён у той час, як голас яго грымеў у вялікім новым памяшканні, дзе нядаўна памылі падлогу, ад чаго пад моднымі скуранымі крэсламі дзе-нідзе цямне-

ПРОЗА

Вольга ІПАТАВА

Канцэрт

АПАВЯДАННЕ

лі вільготныя круглякі. Зала была прыгожая — з барэльефамі на сценах, з акуратнымі шторамі на вокнах, і прыемна было Андрэю, што іх тут чакалі дзве гадзіны, хаця, едучы, ён ужо і не спадзяваўся на сённяшняе выступленне...

Дачытаўшы верш, ён аб'явіў наступны нумар. Канцэрту быў дадзены звычайны дзелавы зачын, цяпер можна было не хвалявацца: кожны ведаў сваю справу, праграма шмат разоў «абкатвалася», і вядучаму заставалася сядзець на сцэне альбо ціха размаўляць з тымі, хто чакаў свайго выхаду. Па звычцы ён ледзь адсунуў заслону, і, перагаворваючыся з Жаннай, прымадоннай групы, пачаў разглядаць гледачоў. Звычайная сельская аўдыторыя: наперадзе — старыя ў чорных сваіх кажухах, жанчыны ў плюшавых жакетках; далей — маладзіцы ў каляровых шарсцяных хустках, з малымі на руках. Паміж імі, паклаўшы шапкі на калені, сядзелі мужчыны. Моладзь, як звычайна, масцілася ззаду, і з-пад паліто з пышнымі лісінымі каўнярамі тырчалі голыя дзявочыя каленкі — як усюды, тут панавалі «міні» і ўзбітыя пад гарадскіх модніц «бабеты».

— Добра сталі ў вёсцы апранацца! — уздыхнуў Андрэй. — Вунь у хлопца лакавыя чаравікі, а я ўсе магазіны ў Мінску аббег — не знайшоў.

— Раней бы прыехалі, маглі ў сельмаг зайсці, — з цукеркай у роце прашапялявіла Жанна.—Я спецыяльна грошы прыхапіла, тут і ў раёне імпарт ёсць. Яна ўгледзелася ў Андрэя, здзівілася:

— Ты што, Андрэйка, усё ад лакавых чаравікаў адарвацца не можаш? Ці, можа, каго знаёмага ўгледзеў?

Яна зазірнула ў шчыліну над яго галавой і, чмыхнуўшы, са смакам пачала грызці цукерку, насмешліва пазіраючы на застылы твар вядучага.

...Ён неяк не спадзяваўся ўбачыць яе тут, хаця ведаў, што Таня павінна працаваць у гэтым раёне. Часам, пад час паездак у калгасы, ён успамінаў пра Таню Лігневіч, адчуваў цьмяны, цяжкі сорам і імкнуўся тут жа забыцца на ўсё, як хоча забыць чалавек крыўду, нанесеную іншаму, альбо ўласнае злачынства,—увогуле ўсё, што можа патрывожыць сумленне.

Але цяпер, гледзячы на строгі твар маладой жанчыны, на валасы яе, сабраныя на патыліцы, на сур'ёзныя яе вочы, што пільна глядзелі на сцэну, ён адчуваў, акрамя сораму, яшчэ і незразумелую радасць — можа, ад таго, што яна так папрыгажэла, папаўнела, і спакойная, роўная годнасць адчуваецца ў ёй нават адсюль. Ці замужам яна? Напэўна. Той чалавек, які сядзіць побач, трымаецца спакойна і ўладна — так трымаецца муж. Ну што ж, зусім як у «Яўгеніі Анегіне» — ёсць Таццяна, ёсць муж, і ёсць горыч, якая засталася паміж двума маладымі закаханымі — праўда, Яўгеній Таццяну не любіў, а ён, Андрэй, сваю Таццяну некалі кахаў, дый здорава кахаў...

Ці пазнала яна вядучага? Нічога нельга прачытаць на гэтым прыгожым, роўным твары, апроч увагі да таго, што робіцца на сцэне, і ён адчуў, як ад думкі, што яго не пазналі, дзіўна сціснулася сэрца.

Няўжо не пазнала? Што тут дзіўнага: за апошнія гады ён распаўнеў таксама, але паўната была пульхнай, нездаровай, на скронях з'явіліся залысіны; ад хворай пячонкі памутнелі вочы... Некалі ж усё было наадварот. Калі ён прыйшоў у раённы Дом культуры дырэктарам, яго празвалі «Мілёначкам» — таму што дзяўчаты пачалі сачыняць пра яго розныя ласкавыя прыпеўкі. Да сёння помніць адну з іх:

Сэрца аж заходзіцца,
Есць у РДК мілёнак,
Ад чаго такі сынок
У мяне не родзіцца?

Розныя былі прыпеўкі, дзяўчаты таксама былі ўсялякія — заваблівыя і няўклюдныя, але ён дырэктарствааў строга: трэба было два гады адрабляць дыплом культасветработніка, каб пасля паступаць у тэатральны. У тэатральны ён хацеў паступіць адразу пасля вучылішча, але дакументаў у яго нават не прынялі, і ён змірыўся, паехаў на раён. Уціхамірыўся — пакуль: марыў аб прафесійнай сцэне, уяўляў сябе трагікам, не іначай, у будучым — вялікім акцёрам... А пакуль даводзілася весці канцэрты, іграць на баяне, акампануючы раённай прымадонне, а часцей за ўсё — арганізоўваць у калгасных клубах самадзейнасць. Тады з кадрамі было дрэнна, загадчыцамі ў вёсках былі альбо старыя, стомленыя жанчы-

ны, альбо ўчарашнія дзесяцікласніцы. Трэба ж было хоць некаму адчыняць клуб, хаця б тады, калі прыязджала кіно, ды на раённы агляд везці самадзейнасць. Яго, як маладога спецыяліста, адразу прызначылі дырэктарам РДК, і працаваць ён стаў заўзята: кожны дзень выбіраўся ў калгас то з метадычнымі распрацоўкамі, то з канцэртамі. Але і гэтага здавалася мала: задумаў пры Доме культуры заснаваць яшчэ і драматычны гурток.

З гэтага гуртка ўсё і пачалося. Хацелася на першы раз паставіць не што іншае, як «Паўлінку» Купалы. Вясёлая п'еса, цікавая, народ яе павінен глядзець з задавальненнем. Доўга шукаў Паўлінку, нарэшце спыніўся на тым, каб іграла яе настаўніца літаратуры Наташа Багацька. Праўда, Наташа была намнога слабейшая за яго, крышку бесцырымонная, але ён спадзяваўся, што рэпетыцыі ўсё згладзяць. Што рабіць, тут Ярмолавай не дачакаешся! І вось ужо прайшла адна рэпетыцыя, другая... а пасля Наташу адхілілі, а на яе месца Андрэй паставіў Таню Ліпневіч, даярку з калгаса «Шлях Ільіча», што за тры кіламетры ад райцэнтра, завочніцу сельскагаспадарчага інстытута.

Наташа плакала і гневалася, але Андрэй быў цвярдзейшы за камень: у тыя хвіліны, калі Таня чытала на раённым аглядзе байку Крапівы, ён зразумеў: вось яна, Паўлінка! Наташа, зразумела, па знешнасці была непараўнальнай з саперніцай: яна высокая, белавалосая, а Таня маленькая, худая. У Наташы слава першай раённай модніцы, а ў Тані — доўгая барвовая сукенка з крывым белым каўнерыкам, на нагах туфлі нейкія ні то зялёныя, ні то шэрыя, ды яшчэ са збітымі абцасамі. Але тое, што ў Тані ёсць талент — тое ён зразумеў адразу, а ў Наташы было самалюбства ды стараннасць, ды, бадай, закаханасць у яго, Андрэя...

Цяпер Андрэй прыгадаў, як ён угаворваў Таню прыязджаць на рэпетыцыі ў РДК, а яна хавала свае чырвоныя рукі з абламанымі пазногцямі, баялася глянуць у вочы і толькі адмоўна трэсла галавой:

— Што вы! Ніякая Паўлінка з мяне не атрымаецца!

— Атрымаецца, яшчэ й якая! — з гарачнасцю даказваў ён. — Я дамоўлюся ў калгасе, Таня, каб вас падмянілі пад час рэпетыцый.

— Ну што вы, дзяўчаты на мяне будуць крыўдзіцца...

— Ну і што? Затое як вам будуць зайздросціць! Няўжо гэтага так мала — калі табе зайздросцяць?

— Мама мне не дазволіць... — сцвярджала яна ўпарта.

— Я і з ёю пагавару. Як гэта не дазволіць!

— Яна і так мяне баіцца адну пускаць. Што рабіць, мы дзеравенскія...

Ён тады ніяк не мог зразумець: ці яна і праўда такая наіўная, ці хітруе з ім, цану сабе набівае?

— Ды няўжо табе, Таня, самой нецікава выступаць на сцэне?

Яна зірнула на яго нявіннымі вачамі і спакойна адказала:

— Не.

Ён не паверыў ёй, таму што паверыць у такое проста не мог, і толькі намнога пазней пераканаўся, што Таня гаварыла праўду: з такім жа непарушным спакоем яна магла гадзінамі сядзець над рэчкай, апусціўшы ў ваду босыя ногі, альбо ляжаць на лузе, закінуўшы галаву, а іграла яна заўсёды без таго напружання нерваў і ўсёй істоты, якое Андрэй лічыў да гэтага такім жа непарушным правілам для артыста, як і штодзённы ўсход свяціла. Іграла — як гуляла ў цацкі. Пераўвасаблялася —і сама, можа, толкам не разумела, што пераўвасаблялася, таму што адразу ж яна пераставала быць Таняй і рабілася той, якой патрабавала ад яе быць роля.

Ці не за тую, ненатуральную, крыўдную нават для яго лёгкасць ён пацягнуўся да яе, нібыта спрабуючы разгадаць нейкую таямніцу — спачатку проста пацягнуўся, а пасля, непрыкметна для сябе, і закахаўся?

Пры першых сустрэчах ён усё-ткі трымаў лейцы ў сваіх руках: прымусіў Таню прыязджаць на рэпетыцыі, паехаў дзеля таго і да старшыні, і да Танінай маці, і пакрыкваў на Таню, калі яна ўпарцілася. Але пасля першага спектакля, самі сабой, пачалі мяняцца іх ролі. Тады, у вечар прэм'еры, Таня была не падобная да сябе ранейшай гэтак жа, як Папялушка была не падобная да той прынцэсы, у якую ператваралася. У белай вышытай кофце, паласатай спадніцы, з вянком на галаве яна сапраўды была не Таняй, не самадзейнай актрысай, што іграе ролю Паўлінкі — яна была самой Паўлінкай, і на сцэне жартавала, спявала і гаварыла так, што яму самому здавалася — няма ні гледачоў, ні залы, а ёсць сапраўдны Быкоўскі, і ён, Якім Сарока, якія спаборнічаюць з-за дзяўчыны. Яму ўбачылася тады, падумалася з сумам, але сум той на пачатку быў яшчэ светлым, яшчэ не зайздросным, што Таня, відаць, з тых шчаслівых людзей, якім усё даецца ў рукі само, без усялякіх намаганняў з іх боку. За час рэпетыцый, перабегшы ў залу, яна ўмудрылася па слыху падабраць некалькі песень на фартэпіяна; пасля дзвюх-трох рэпетыцый прыехала пераўтвораная: знікла сукенка з крывым каўнерыкам, на нагах былі нейкія чалавечыя туфелькі. З Наташай усё роўна яна не магла параўноўваць сябе, але яна, відаць, і не параўноўвала, а проста адразу неяк паставіла сябе так, што Наташа ўжо не асмельвалася хіхікаць і дражніць яе, — Таня смела і дасціпна адказвала на кпіны, умела закрыць рот любому, і ўрэшце зразумеў Андрэй, што Таню не толькі паважаюць яго гурткоўцы, але і пабойваюцца яе!

І дзе толькі яны ні пабывалі са сваім спектаклем! І ў вобласці, і на тэлебачанні, і па калгасах калясілі. Давялося Таню з даярак пераводзіць у рахункаводы, часу ў яе не заставалася, каб кароў даіць, дый адукацыя падводзіла да таго: ішоў чацвёрты год яе завочнай вучобы...

...Наступны нумар ён аб'явіў як бы ў нейкім здранцвенні. Адразу стаміўся, адчуваючы, як паколвае сэрца і стаіць у страўніку наспех з'едзены абед. Каб не спазненне, канцэрт быў бы даўно закончаны, усе яны пілі б чай у гасцініцы і ўспаміналі б смешныя здарэнні. Ішла дванаццатая гадзіна ночы, было позна, і ён адчуваў, што плечы яго нямеюць ад нейкага цяжару — ні то пражытых гадоў, ні то цяжару пустэчы, якая навалілася на Андрэя неспадзявана і несправядліва. Несправядліва, таму што чаго-чаго, а пустаты ў сваім жыцці ён не заўважаў ніколі. Заўсёды яно было поўнае, кіпучае, тлумнае...

Тады ішло на вясну, паціху мякчэлі маразы, дзень ціха прыбаўляўся, і раніцай дробны, цёплы ўжо сняжок падбельваў вуліцы. На ўскраіне гарадка, там, дзе сасняк падступаў да хат, чуцен быў перастук дзятлаў, а, выходзячы з хаты, Андрэй бачыў рудое шалупінне ад шышак, якімі харчаваліся вавёркі. У тыя дні, калі на рэпетыцыі прыязджала Таня, ён рана быў у Доме культуры, а калі ішло на вечар, чаканне ўзвінчвала яго, ён сварыўся з работнікамі, учыняў галас з шафёрам, ведаючы, што той прыдумляе нейкую прычыну, каб знікнуць і не чакаць канца рэпетыцыі. Тады ўжо ішлі паміж ім і Таняй нелады, розумам ён рыхтаваўся да ростані, а сэрца шчымела і змагалася з тым рашэннем, і ён то цягнуўся да яе, то рабіўся грубым і няўважлівым. А Таня не магла даўмецца, што здарылася, пыталася бесперастанку аб тым, а ён не мог адказаць, хаця добра ведаў прычыну свайго раздваення.

Пачалося ўсё так.

Да сакавіка гурток ставіў «Каменнага госця» Лесі Украінкі. Яму даўно хацелася сыграць Дон Жуана — не вясёлага, бесклапотнага пакарыцеля сэрцаў, а чалавека, што зразумеў усю марнасць зямнога жыцця і адчайна змагаўся з ёю; такім ён бачыў свайго героя, але Дон Жуан не ўдаўся яму. Ад рэпетыцыі да рэпетыцыі ўсё болей узнімалася донна Анна — Таня. І на прэм'еры ён, нарэшце, зразумеў ясна: Таня навечна адвяла яму пры сабе толькі другое месца! Вось яна выходзіць на сцэну разам з ім—і Дон Жуан робіцца проста вартым жалю спакушальнікам, чалавечкам, які бунтуе не ад адчаю — ад баязлівасці перад жыццём. Што дыктавала гэтай дзяўчынцы веліч і высакародства жанчыны, якая кахае і ненавідзіць? Можа, сапраўды іх каханне было для Тані тым выпрабаваннем, з якога яна выходзіла — няхай сабе на сцэне — пераможцай? На вачах Андрэя ўзнікаў цуд. Назіраючы за Таняй, ён бачыў: калі, жадаючы адцясніць яе, ён напружваў у спектаклі ўсе сілы, яго намаганне перадавалася дзяўчыне, і яна пачынала іграць яшчэ лепей. І ўсё ж — Таня не разумела ні тады, ні пасля: паміж імі пачалася барацьба; адкуль было ведаць ёй, што самым небяспечным было для яе пытанне, што прыйшло ў той вечар да Андрэя: «Хто з нас будзе ўрэшце першым?» Такога пытання для яе проста не існавала.

А ён, дзень за днём, пакутаваў усё болей. У чым жа справа? У тым, што яе шчасце недаступна для іншых? Хацелася дакрануцца да гэтага таямнічага «Танінага шчасця», адчуць яго. Дзень за днём светлае пачуццё да дзяўчыны пачало пераўтварацца ў нешта іншае, пякучае, набалелае, вострае, якое і адначасна прыцягвала, і адштурхоўвала хлопца. Дзве сілы сутыкнуліся ў Андрэі, і таму ён то пазбягаў «навасёлкаўскай рахункаводкі», як ужо пачынаў называць Таню, то позна вечарам, калі не ішлі аўтобусы, пехатой мераў кіламетры да Навасёлак, каб пасядзець у яе хаце пад наглядам бабкі Еўфрасінні...

— Андрэй, ты што гэта? — Жанна торгала яго за рукаў.

І зноў амаль няўцямна ішоў Андрэй на сцэну, нешта аб'яўляў, жартаваў, а пасля, заціскаючы ў спацелай руцэ аксаміт заслоны, прагна сачыў позіркам за жанчынай, што спакойна слухала песні.

Неверагодна, але яна стала болей падобная да бабкі Еўфрасінні, чым да маці. Помніцца, што худая, з выразнымі, цвёрдымі рысамі бабуля Еўфрасіння вечна сядзела за калаўротам. Ці былі ў хаце госці, ці глядзелі ўсёй сям'ёй тэлевізар, ці позна вечарам, ці раненька — усё сучыла яна і сучыла бясконцую нітку, выкручвала яе з пушыстага воблака кудзелі. Ніколі не бачыў Андрэй, каб скончылася нітка: калі б ні заходзіў ён у хату, гудзеў калаўрот, і доўгая ніць лілася з-пад жылістых рук старой жанчыны. Першы раз, зайшоўшы ў хату, ён здрыгануўся, сустрэўшы бабчыны вочы: невялікія, выцвілыя, яны ўпіліся ў яго, нібы п'яўкі, так што нейкі час ён не мог адарвацца ад Еўфрасінні.

— Ды не бойся ты яе! — колькі разоў упрошвала яго потым Таня. — Яна добрая, толькі вось пасля вайны, як пазабівалі сыноў, маіх дзядзькоў, значыць — яна і стала прасці. Прадзе і тчэ. Мама колькі з ёй сварылася: «Ты што, кажа, — на ўвесь свет палатна хочаш напрасці?» У мяне, ведаеш, два куфры прыданага. Уяві сабе толькі — пасаг! І ўвесь во такі, самаробны. Так надакучыла! Кашулю не купі — бабуля пакрыўдзіцца!

З Андрэем бабуля не размаўляла, не адказвала на пытанні, нібы адразу разгледзела ўсяго, да апошняй жылачкі, — і вынесла нейкі свой прысуд. Яна заўсёды сядзела нерухома, як выразаная з дрэва, і толькі імклівая нітка варушылася ў яе вёрткіх руках. Маці ж Таніна, наадварот, гаварыла за траіх. Вясёлая, жвавая кабета, яна вечна сыпала жартачкамі, сустракала Таню з выступленняў смехам:

— Матка па дачцэ плача, а дачка па дошцы скача!

— Ды я не скачу там, мамка, а размаўляю.

— Размаўляй, дачушка, размаўляй! Кажуць — гарадское цялятка разумнейшае за вясковае дзіцятка, во ўчыся. Гэта адной пчале ад роду ўся навука дадзеная, а людзям яе унь колькі дазнавацца патрэбна!

— Якую ж мне навуку шукаць у горадзе, мамка?

— Усялякая навука бывае, дачушка. Адно толькі помні: дзе вырасла сасна, там і ясна. Няма чаго ад роднай хаты адбівацца.

Андрэй разумеў яе словы, казаліся яны не для Тані — для яго.

— Яна ў вас таленавітая, вучыцца ёй трэба, — сказаў неяк. — Вунь якая з яе артыстка. Няўжо не прыемна было, калі дачку па тэлевізары паказвалі?

— Сёння — у часці, а заўтра — свіней пасці, так у жыцці бывае. Няхай канчае свой інстытут, стояшчым дзелам займаецца...

З раздражненнем адчуваў Андрэй, што тут, у гэтай хаце, усё тое, чым займаецца ён, аб чым марыць — не сапраўднае, што ні маці Таніна, ні сама Таня не думае ўсур'ёз пра сцэну. Наадварот — усе Таніны размовы былі пра тое, што хутка заканчвае яна інстытут і нарэшце возьмецца за сапраўдную, вартую справу. І тое, што саперніца (ён цяпер не баяўся так называць яе ў думках) з аднолькавай лёгкасцю вось-вось прыдбае далёкую для Андрэя, але недаступную, як там ні кажы, прафесію, што прафесія тая для яе, можа, важнейшая за сцэну — гэтага ён не мог пераносіць. Як так? Таня не марыць пра тэатр — і бярэ верх над ім, Андрэем, які мроіў тэатрам, марыў, спадзяваўся, як на нешта вышэйшае ў сваім жыцці!

Разрыў паміж імі быў немінучы, але ён адцягваў, гуляў з Таняй, як кошка з мышкай, можа, радуючыся ў душы таму, што ёсць, ёсць у Таніным шчасці адна ахілесава пята, і тая пята — ён, Андрэй...

Пазнала ці не пазнала? — задаваў ён зараз сабе пытанне, і не мог адказаць, ці хоча ён, каб яго пазналі.

З'явіцца перад ёй такім — не пераможцам, не тым, каго яна спадзявалася бачыць! Усяго толькі — вядучы гастрольнай групкі! Усяго толькі аб'яўляе нумары і, як Арлекіна, весяліць публіку — вось чым ён стаў. Не Атэла, не Гамлетам, нават не масоўкай у тэатры, а жэўжыкам, які, магчыма, ашукае іншых сваімі поспехамі — усіх, толькі не яе, таму што хто-хто, а Таня, з яе наіўнай, але безадмоўнай інтуіцыяй, добра ведае цану сапраўднаму поспеху... Дык ці пазнала яна Андрэя?

Таццяна пазнала яго. Не так моцна ён перамяніўся, толькі ў раманах людзі не пазнаюць адзін аднаго праз якіх дзесяць гадоў ростані. Дый і не ў натоўпе сустрэла Андрэя, а на сцэне, дзе ён да чорных бліскучых туфляў высвечаны і выгледжаны сотнямі вачэй. У першы момант яна адчула, што пабляднела, спалохана скасавурылася на мужа, але той сядзеў ціхі і безуважны — тады яна супакоілася. Добра, што ён нічога не заўважыў, навошта было б яму, можа, хваляваца ці раўнаваць, высочваючы ў жонцы хваляванне ці спакусу сустрэцца з былым каханнем? Усё прайшло, сплыло, быў мілы, стаў пастылы — чаго прасцей?

Але выпакутаванае, шмат разоў перадуманае, перамеранае мінулае, разбуджанае штуршком сустрэчы, нібыта перад гаццю — перад скамянеласцю душы, якою яна некалі адгарадзілася ад усяго, што магло напомніць пра Андрэя. І цяпер у яе ўзнікла адчуванне, што ўнутры яе рака, падмываючы каменную плаціну, шукала нейкія шчыліны, слабыя месцы, таму жанчына змагалася з плынню і, сціснуўшы вусны, спрабавала забыцца на ўсё і глядзець на сцэну. Спачатку ёй удавалася тое, але ўсё ў зале — і песні, і музыка, і агульны прыўзняты настрой аднавяскоўцаў — вяртала яе да няпоўных двух гадоў, калі яна жыла ў дзівосным, можа, ніколі не існаваўшым свеце. Занадта многа твараў, падзей і часін перажыла яна за той час, але ўсё — і выступленні, і ролі, і поспех — усё было для яе толькі фонам, на якім галоўнай асобай, адзінай асобай быў ён, Андрэй...

Відаць усё ж, што па-сапраўднаму шчаслівым было толькі тое лета, калі Андрэй убачыў яе на раённым аглядзе самадзейнасці, запрасіў у гурток і рэпеціраваў «Паўлінку». Як любіла яна кожны дзень, што прыносіў ёй радасць сустрэчы! Вяртаючыся з фермы, яна бегла ў лес, каб да знямогі паўтараць перад якім ядлоўцавым кустом сцэны са спектакля, а пасля ляжаць на нагрэтай пясчанай зямлі і раствараццa ў навакольным.

(Заканчэнне на стар. 10—11).

Любіць прызвання

ПЕРАБІРАЮ Ў ПАМЯЦІ дні, тыдні, месяцы 1980 года. Многа хвалюючага і знамянальнага застаецца на старонках яго календара. І ў вялікім грамадскім сэнсе, у маштабе ўсё нашай краіны, і ў лёсе аднаго чалавека, грамадзяніна. Мы, творчыя работнікі, натуральна, перабіраючы ўражанні мінулага, затрымліваемся на тым, што пазначыла наш каляндар: прэм'еры, новыя ролі, знаёмства з шэдэўрамі сумежных мастацтваў, абмеркаванні спектакляў, фільмаў, зробленых нашымі калегамі...

Хай даруе мне чытач, але я хачу сказаць пра сябе, пра свой тэатр, пра сваіх таварышаў і паплечнікаў. У нас ёсць работы, пра якія зацікаўлена гавораць і спрачаюцца гледачы, вядуць дыскусіі крытыкі, ды і мы самі вяртаемся да іх зноў і зноў, штосьці ў спектаклях удакладняючы, дапаўняючы. Рускі тэатр БССР імя М. Горкага цяпер ведае свайго гледача. Мы не скардзімся на пустыя месцы ў зале. Мабыць, нашы спектаклі звяртаюць на сябе ўвагу і прыцягваюць гледачоў. Я разам са сваімі калегамі ўдзельнічаю ў большасці з тых спектакляў, што складаюць сённяшнюю афішу. Нам вельмі патрэбна і вельмі карысна тая непасрэдная рэакцыя глядзельнай залы, якая і сама па сабе — пэўная ацэнка і крытычнае меркаванне аб сцэнічным відовішчы.

Мінулы год мне асабіста прынёс найвялікшую радасць — мая праца адзначана высокім грамадскім прызнаннем: мне прысвоена ганаровае званне народнага артыста Беларускай ССР. У мінулым пяцігоддзі я папоўніў свой рэпертуар значнымі ролямі ў п'есах савецкіх драматургаў і ў класічнай спадчыне.

Я перажыў і непаўторнае пачуццё калектыўнай радасці, калі спектаклі тэатра выклікалі прызнанне гледачоў Масквы і Кіева (у сталіцу Украіны мы нядаўна ездзілі, каб адкрыць сезон у тэатры, які называецца: «Дружба»), Таліна і Ленінграда, Горкага і Вільнюса, Казані і Рыгі, Куйбышава і Варонежа... Наведалі мы таксама Венгерскую Народную Рэспубліку, дзе прымалі нас надзвычай цёпла. Сёлета нас чакае падарожжа ў Федэратыўную Рэспубліку Германіі, дзе мы будзем удзельнічаць у шэкспіраўскім фестывалі. Гэтыя выступленні — праверка творчай сталасці артыстычнага калектыву, рэжысуры, агульнай культуры творчасці. Я мог бы спасылацца на водгукі цэнтральнага друку, цытаваць шматлікія рэцэнзіі, але спадзяюся, што сам пералік «геаграфіі» нашых паездак пацвярджае факт прызнання.

Прызнанне — абавязвае!

Міжволі прыгадваю сваё жыццё, свой шлях да такога вось прызнання. Усё выглядае амаль фантастычна. Мяркуйце самі. Ці мог маскоўскі хлопчык, якому ў восем гадоў давялося стаць «галавой» сям'і (бацька пайшоў на фронт, а я быў старэйшы сярод дзяцей), нават у самых смелых марах уявіць сябе артыстам, якому даручаецца, да прыкладу, хоць бы роля дзеда Шчукара, якую я збіраюся іграць у нашай новай пастаноўцы паводле рамана «Узнятая цаліна» М. Шолахава? Пасля вайны, калі мне было трынаццаць гадоў, я спрабаваў памагчы бацьку працаваць у кузні — паступіў у рамесніцкае вучылішча, каб стаць такім жа, як ён, малатабойцам. І захапіўся мастацкай самадзейнасцю. Паступіў у тэатр... рабочым сцэны, бо хацелася быць бліжэй да мастацтва. Але і тады, калі я гаспадарыў сярод дэкарацый, калі ўжо з'явілася ў мяне адчуванне далучанасці да сцэны, больш таго, калі я ўжо стаў унутрана рыхтавацца да акцёрскай дзейнасці: мне ў самых летуценных снах не магло б прымроіцца тое, чым я сёння жыву... Наўрад ці трэба гаварыць пра маё хваляванне, калі пастаноўшчык спектакля «Сінія коні на чырвонай траве» абвясціў аб тым, што артысту Ю. Ступакову даручаецца роля Уладзіміра Ільіча Леніна. Задачу, што паўстала перада мною, нельга было параўнаць з тымі, што выпадалі на маю долю раней.

З чаго я пачаў? Адказаць дакладна немагчыма. Я перабіраў у памяці ролі станоўчых герояў у сучасным рэпертуары («Барабаншчыца», «Іркуцкая гісторыя», «Узнятая цаліна», «Традыцыйны збор»). Прыгадваліся мне і ролі класічнага рэпертуару, якія вымагалі ад мяне творчай фантазіі і ўнутранай мабілізацыі. Не, маштаб задумы і сам тэкст, самі абставіны і калізіі п'есы «Сінія коні на чырвонай траве» патрабавалі значна большай творчай самааддачы. І пачалася праца...

Мне падабаецца, як пра нашу акцёрскую працу гаворыць выдатны акцёр сучаснасці Міхаіл Ульянаў: «Без працы акцёр ніколі не стане акцёрам. Толькі праца мацуе яго творчую мускулатуру, духоўна ўзбагачае. Ды ў тым і жорсткасць нашай прафесіі, што працы, якая выхоўвае, робіць акцёрам, нестае». Сустрэчы з сапраўды маштабнымі, сацыяльна змястоўнымі, па-чалавечы адметнымі характарамі падказваюць табе, што гэта сапраўды так і ёсць.

Якая ўсё ж цяжкая яна, акцёрская прафесія! І якая—цудоўная! Гэта ж ад таго, як ты зможаш захапіць і ўзрушыць гледача, залежыць яго ўвага да тэатра, яго цікавасць да сцэны. Табе наканавана праз мастацкі вобраз сказаць, магчыма, непаўторнае, табе аднаму вядомае слова пра жывую рэчаіснасць, пра жыццёвы прататып твайго сцэнічнага характару, пра нейкія жыццёвыя сітуацыі і месца ў іх чалавека. Сучасны глядач мае патрэбу ў такім параўнанні рэальнага жыцця з мастацкім адбіткам яго. Мы, акцёры, у гэтым пераконваемся кожны вечар. Глядач не толькі смяецца або сумуе разам з нашымі персанажамі, апладзіруе аўтару ці нам, выканаўцам роляў. У зале напружана і паслядоўна ідзе нябачная воку духоўная работа: чалавек у партэры звярае «люстра» з жыццём — і наадварот. Такім чынам ён знаходзіць, бывае, адказы на нейкія свае жыццёвыя пытанні: сцэна штосьці пацвярджае ў яго разважаннях і меркаваннях, нешта абвяргае. І ўсё гэта робіцца вось зараз, у гэтую хвіліну, у непасрэднай сувязі паміж залай і сцэнай.

Гэтую «работу» глядзельнай залы я адчуваў, калі іграў ролі сваіх сучаснікаў, напрыклад, Рабініна ў спектаклі «Чалавек збоку» або Васкова ў спектаклі «А досвіткі тут ціхія»; і калі выконваў ролі Пабеданосікава ў «Лазні» У. Маякоўскага, Немца ў спектаклі «Вяртанне ў Хатынь», Івана Каламійцава ў горкаўскіх «Апошніх». Нават у адкрыта ўмоўных, эксперыментальных работах нашага тэатра, у пастаноўках, якія будуюцца на паэтычнай плыні і сімволіцы («Васілій Цёркін» А. Твардоўскага або «Трагедыя чалавека» І. Мадача), усталёўваецца такі кантакт паміж залай і сцэнай. Хай потым разгараюцца спрэчкі, знаходзяцца апаненты, якія не пагаджаюцца з трактоўкай арыгінала або з выкананнем асобных роляў, сённяшні глядач свае мастацкія ўражанні правярае рэальным жыццём, сваімі ведамі ў галіне гісторыі, грамадскіх навук, філасофіі. Таму на акцёра ўскладаецца вельмі адказная творчая задача: даваць гледачу спажыву для такога параўнання і для такой зверкі. Гэта азначае, што мы павінны адрасаваць свой спектакль і эмацыянальным уражанням, і інтэлекту сённяшняга гледача. Такая адзнака часу. Прынамсі, калектыў Рускага тэатра БССР імя М. Горкага і яго рэжысура на чале з галоўным рэжысёрам Б. Луцэнкам заўсёды маюць гэта на ўвазе.

Вядома, я далёкі ад думкі, быццам цяпер акцёры працуюць лепш, чым працавалі нашы папярэднікі. Тым не менш дыялектычныя змены ў творчым працэсе адбываюцца і прад'яўляюць нам даволі строгі рахунак. Ці заўсёды ўзнімаемся мы на ўзровень ідэйна-эстэтычных патрабаванняў часу? Мабыць, ёсць у нас і пралікі, і выдаткі. У каго іх не бывае? Мы ж кожны вечар выходзім на падмосткі, сустракаючы новага гледача, і гэта прымушае нас у нейкіх нюансах кожны раз нанава шукаць самыя дакладныя акцэнты ў ролях і ў агульным гучанні тэатральнага відовішча.

Сцэна са спектакля «Сінія коні на чырвонай траве». У ролі У. І. Леніна — Ю. Ступакоў, Сапожнікавай — В. Клебановіч.

Калі я пачынаў акцёрскую дзейнасць, мне здавалася, што рамесніцкага навыку можа хапіць чалавеку для таго, каб узяць напісаны драматургам тэкст і па рэжысёрскіх указаннях пераўвасобіцца ў пэўны характар. Аказалася ўсё куды больш складана і супярэчліва. І, магчыма, самыя істотныя карэктывы ў маё ўяўленне аб прафесіі ўносіць менавіта глядач. Касмічны век і навукова-тэхнічныя пераўтварэнні ўносяць у штодзённае жыццё, у псіхалогію чалавека амаль непрыкметныя змены, якія з цягам часу робяцца новай якасцю.

Бывае, я пакутую ад таго, што мне трэба сарваць з сябе «скуру» прафесіяналізму, якая ўжо стала амаль што тваёй маскай, памагае табе іграць ролі сёння так, як учора... А заўтра так іграць, як сёння, — нельга! Ты задаеш сабе пытанне: ці маеш ты права на тую споведзь перад гледачом, якой фактычна робіцца твой выхад на сцэнічныя падмосткі? І тут справа не толькі ў абнаўленні прафесійных прыёмаў і метадаў паводзін на сцэне, а і ў духоўнай тваёй падрыхтаванасці да творчага акту. Што такое адухоўленасць для акцёра, для чалавека, які абавязан, якому наканавана раскрыць духоўнасць (альбо бездухоўнасць) сённяшняга персанажа? Так, сцэна можа праінфармаваць, штосьці паведаміць гледачу, і тым пашырыць яго далягляды і ўражанні. Але каб ён атрымаў ад нас патэнцыяльна ак-

КАНЦЭРТ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8).

Дзівосныя, незвычайныя стаялі дні: бялесая спякота расцякалася па зямлі, упартыя тугія галіны ядлоўца з зеленаватымі яшчэ ягадамі былі цёплымі і сухімі, на асінах, над дробнымі, дрыготкімі лісточкамі ўжо жаўцелі і чэзлі вяршаліны, а захмялелыя чмялі ляніва гудзелі над ліловымі званочкамі, што тулілися ў цень.

І маці радавалася жыццю разам з дачкой: яна сама любіла ўставаць на досвітку, калі шэрае неба павольна ружавее на ўсходзе, у росным садзе гулка падаюць у траву вільготныя яблыкі, і звонка праразае цішыню пенны струмень малака, што пырскае ў пустую даёнку. Бабка ж Еўфрасіння толькі маўкліва назірала за імі, не ўмешвалася ў размовы, у вясёлыя жарты. Толькі калі пайшло на восень — тады якраз падаўжэлі ночы, а ў балоце пачырванелі журавіны, — першыя пайшлі сваркі з Андрэем — бабуля стала загаворваць з унучкай; і то ўсё нейкімі незразумелымі намёкамі, цьмянымі для Тані сказамі:

— У кожнага чалавека свая горка бывае, у кожнага. Моцны адолее, слабы абыдзе альбо крыжам на ёй ляжа.

— Ды якая горка, бабуля, якая? — нервова пыталася Таня, таму што ўсё гора было ў тым толькі, што не так, як заўсёды, развітаўся Андрэй, не павёз дадому, як заўсёды бывала, пасля спектакля. А другі раз проста крыкнуў шафёру: «Адвязі дамоў Таццяну!» — а сам пайшоў сабе, насвіствае, і не хапіла смеласці ні загаварыць, ні хоць спытаць, што здарылася...

— Крывое верацяно не апране, Танюся, — у другі раз сказала бабуля, прыўзняла руку, каб пагладзіць унучку, але ізноў яна вывернулася, не вытрымала, злосна закрычала:

— Усё табе верацёны на ўме, бабуля! Пры чым тут верацяно? Што ты да мяне прыстала?

— Не прыстала, а кажу табе: «Ты, галубка, не здавайся, хаця правым крылцам, ды адбівайся...» Гару перапаўзці трэба...

Пра якую горку казала старая Еўфрасіння, зразумела толькі тады, калі ўцяміла: непрыяцелі яны з Андрэем, а чаму так выйшла, не магла зразумець, таму што ўся гарэла па ім, кожнае слоўка лавіла на ляту, сэрцам. Не стала ёй жыцця без Андрэя, і жыць не магла з тым, што перамяніўся ён да яе, адказваў не проста, а з насмешкаю, са шпількаю, і таму не раз пасля спаткання або размовы яна рукі сабе грызла пад тымі ж асінамі, якія летам яе бачылі такой лёгкаю ды шчасліваю...

— Ці кінеш дзеля мяне маці? — аднойчы загаварыў Андрэй, калі яны сядзелі за заслонаю, чакалі выхаду. Спытаўся на вуха, так неспадзявана, што яна адхіснулася, пасля сабралася з сіламі, здзівілася нясмела:

— Навошта ж яе кідаць?

— А дзеля мяне. Калі кахаеш, значыць, павінна забыцца, здрадзіць, зарэзаць — любога, каго я захачу, — Андрэй дапытліва ўзіраўся ў яе вочы. — Вось такім я бачу каханне. Я хачу, каб ты прыйшла сёння дадому і сказала: «Ведаць вас не ведаю». Скажаш?

Не, ён не жартаваў, нешта цёмнае, пагрозліваe легла на твар, вочы сталі цьмянымі, няўлоўнымі, павеяла ад яго злоснай, ненавіснай сілай — і яна галахліва скурчылася ў сваім халодным марлевым уборы, — іграла нейкую пані, сядзела з голымі плячамі.

— Дык скажаш? — настойваў Андрэй, казытаў вуснамі вуха, шаптаў зласліва: — А не хочаш — як хочаш...

Калі б адчувала Таня, што дзеля таго, каб узяць яе з сабой, патрабуе ён адрачэння ад самага дарагога і светлага — пайшла б за ім, адраклася б і ад маці, і ад дому... Але ж дзеля пацехі гаварыў так Андрэй, дзеля гульні, якою ён

тыўныя эмоцыі, сцэна заклікана ўзрушыць залу. Ці зможам мы гэта зрабіць сёння з нашай учарашняй прафесійнай узброенасцю?

Пытанні, пытанні, пытанні... Гэта — будні акцёрскага жыцця. Я адчуваю, што калі мне і пашчасціла зрабіць штосьці вартае на сцэне за пяцігодку, дык гэтым я абавязаны той творчай атмасферы высокай патрабавальнасці, якая ствараецца ў нашым калектыве агульнымі намаганнямі ўсёй трупы. Тыя пытанні, пра якія я толькі што гавару, — не толькі мае. Я ведаю, што адказу на іх шукаюць А. Клімава і Р. Янкоўскі, Ю. Сідараў і Г. Абуховіч, Л. Былінская і І. Лакштанава, А. Шах-Парон і В. Клебановіч... Нашы сустрэчы з рэжысурай (са сталай, а таксама і з запрошанымі рэжысёрамі Б. Глаголіным або А. Кацам), уносяць удакладненні ў нашы адказы на адвечныя мастакоўскія пытанні. Нездарма ж мы самі, паглядзеўшы спектаклі А. Яфрэмава, Г. Таўстаногава, А. Эфраса, Ю. Любімава, Р. Стуруа, Ю. Мільцініса, пераконваемся, што нас сёння часта ўзрушвае не бытавая прывязанасць да люстэркавага праўдападабенства, а смелыя асацыятыўныя вобразныя сувязі праўды штодзённых назіранняў з вобразамі-сімвалам, з метафарай, якая абуджае ў гледача роздум вялікага эмацыянальнага, гістарычнага, маральнага, філасофскага напаўнення.

Калі б мяне спыталі, які сучасны герой найбольш блізкі мне асабіста, я сказаў бы, што мяне прываблівае натура чалавека, незадаволенага сабой і сваімі справамі, скіраванага на новыя пошукі ісціны і справядлівасці, чалавека, здатнага прыходзіць у адчай ад недасканаласці зробленага ім... Адчуваю, што такі характар сёння прываблівае і гледачоў. І калі рэпертуар у большай або меншай ступені задавальняе патрабаванні сённяшняга наведвальніка тэатра, значыць, мы выконваем вельмі важную ідэалагічную работу па выхаванні нашых людзей. Я далёкі ад таго, каб быць самазадаволеным і гаварыць, што чалавек, які быў узрушаны нашым спектаклем, адразу стаў лепшым, зразумеў нешта глыбей ці больш правільна. Не, выхаваўчая работа складаецца з накаплення ўражанняў, і кожны наш выхад на сцэну — гэта імкненне дадаць да сумы ўражанняў сучасніка нешта новае. Такі творчы імпэт робіць больш плённым працу акцёра. Бо справядліва заўважыў некалі А. Папоў: «Акцёр — гэта самалёт, які бярэ разгон на ўзлётнай паласе. Як толькі з'явіцца глядач, самалёт узлятае...»

Не ведаю, ці здолеў я раскрыць дыялектычную неабходнасць і сучаснае значэнне сувязі тэатра з гледачом. Але на маёй самай адказнай акцёрскай рабоце ў спектаклі «Сінія коні на чырвонай траве» роздум пра ўсе гэтыя пытанні адбіўся самым непасрэдным чынам. Як мне хацелася б, каб словы Н. К. Крупскай: «Вобраз Леніна — гэта думка Леніна», — знайшлі па магчымасці граничнае ўвасабленне ў сцэнічным партрэце, штрыхі да якога мне выпала шукаць разам з пастаноўшчыкамі спектакля Б. Луцэнкам і Д. Дзіджыокасам, разам з маімі партнёрамі па сцэне! Паглыбляючыся ў творы правадыра, у перапіску яго з паплечнікамі, з роднымі, з блізкімі, вывучаючы мемуары пра Уладзіміра Ільіча Леніна, я шукаў тыя «ноты», ад якіх у маёй душы магла б загучаць «музыка» менавіта такой трактоўкі вобраза — як думкі, як інтэлектуальнага і эмацыянальнага роздуму аб часе і гістарычных кроках Рэвалюцыі. Бязмежна ўдзячны я супрацоўнікам Цэнтральнага музея У. І. Леніна ў Маскве, якія далі мне магчымасць пазнаёміцца з цікавейшымі архіўнымі дакументамі. Праўда, сумненні не пакідалі і не пакідаюць мяне. На кожны спектакль «Сінія коні на чырвонай траве» я іду як на прэм'еру. Па-творчы акрыляе мяне мая складанейшая задача — далучыцца да асобы Чалавека, Правадыра, Мысліцеля...

М. Шатроў прапанаваў выканаўцу ролі ў гэтай п'есе зусім новую форму выяўлення ленінскай думкі і ленінскага настрою — без грыму і знешне фатаграфічнага падабенства. Вопыт папярэднікаў у такіх умовах акцёру можа толькі памагчы. Непасрэдных падказаў ён не дае. І тое, што рабілі Б. Шчукін, М. Штраух, П. Малчанаў, А. Грыбаў, Б. Смірноў, М. Ульянаў, — матэрыял для вывучэння, але пошук тут вядуць рэжысёры і выканаўца на зусім новым драматургічным матэрыяле.

Не ведаю, ці здолеў я ў дастатковай меры перадаць ленінскую думку ў руху, яе маштаб, скажу толькі: працавалі і працуем мы з сапраўдным натхненнем. Нам дарагія водгукі і рэакцыя кожнай аўдыторыі на розных спектаклях. Часамі ў мяне ствараецца такое ўражанне, быццам зала на самой справе сочыць за думкай, за аргументацыяй Леніна ў дыспутах і размовах з іншымі персанажамі п'есы. Тады з'яўляецца адчуванне самага непасрэднага кантакту з сённяшнімі гледачамі. Гэта вельмі памагае знайсці творчы тонус на сцэне. Звярнуў я ўвагу і на тое, што зала надзвычай прыхільна сустракае кожную праяву непаўторнай ленінскай сціпласці. І мая запаветная мара знайсці спалучэнне непрымірымасці правадыра ў адносінах да ворагаў рэвалюцыі і чалавечай сціпласці, нават далікатнасці ва ўзаемаадносінах з паплечнікамі па барацьбе. Здавалася б, я называю палярныя пункты амплітуды вобраза, на самой жа справе ў межах гэтай амплітуды можна і трэба знаходзіць самыя выразныя, самыя ўражлівыя і самыя дакладныя псіхалагічныя нюансы.

Шчыра скажу, што паміж прэм'ерным паказам спектакля «Сінія коні на чырвонай траве» ў лістападзе 1980 года і цяперашнімі спектаклямі — розніца істотная. Магчыма, мы тады спяшаліся паспець выпусціць прэм'еру; магчыма, па-акцёрску я быў недастаткова падрыхтаваны да адказнай работы. Гэта адбівалася на якасці сцэнічнага ўвасаблення. Але ўплыў гледача на гучанне як усяго спектакля і яго ідэйна-мастацкага пафасу, так і маёй ролі — вельмі значны. Ад нечага мне давялося адмовіцца, штосьці замацаваць, нешта зрабіць больш яскравым і акрэсленым. Рабіў я ўсё гэта, прыслухоўваючыся да рэакцыі глядзельнай залы, да ўспрыняцця сцэнічнага партрэта У. І. Леніна нашым сучаснікам, а гэта пераважна — малады чалавек.

●

Штовечар мы выходзім на сцэну, каб заваяваць гледача і атрымаць ад яго сацыяльны заказ і адчуць эстэтычнае запатрабаванне ўжо і заўтрашняга дня. Шчасце, калі нам удаецца гэта зразумець і адчуць, а потым і ўвасобіць у сцэнічнай практыцы. Да гэтай мэты ва ўсякім разе мы імкнёмся. Гэтаму нас вучыць партыя. Да гэтага заклікае час. Нам нельга спасылацца на агульны поспех і росквіт мастацтва, а трэба кожнаму на сваім пасту рабіць запаветную справу па вышэйшых крытэрыях сучаснасці. З разуменнем гэтага мы пачынаем свае творчыя пошукі і адкрыцці ў знамянальны для савецкага грамадства і ўсяго рэвалюцыйнага развіцця свету 1981 год.

Юрый СТУПАКОЎ,
народны артыст БССР.

К. Арцёменка. (г. Магілёў). Хлеб-соль. (Саломка, пляценне).



Ручнікі.

Г. Асіпкова. (Чашніцкі раён Віцебскай вобласці). Тэматычная кампазіцыя. (Дрэва).



А. Паддубны. (Радашковічы). Набор для мачанкі. (Кераміка, адліўка).

«Цуд! Сапраўды—цуд!»—у захапленні гавораць тыя, хто пабываў у гэтыя дні ў мінскім Палацы мастацтваў. Тут на рэспубліканскай выстаўцы жыхары і госці сталіцы знаёмяцца з самабытнымі творамі майстроў традыцыйнага народнага мастацтва і лепшымі ўзорамі дэкаратыўна-прыкладных вырабаў прадпрыемстваў мясцовай і лёгкай прамысловасці Беларусі.

Шкло і фарфор, тканіна і саломка, кераміка і дрэва... Усё гэтае багацце фарбаў, матэрыялаў і, галоўнае, фантазіі майстроў робіць на наведвальнікаў незабыўнае ўражанне. У экспазіцыі мы бачым рознакаляровыя ручнікі, посцілкі, абрусы, цікавыя кампазіцыі з ільновалакна і гліны, залацістыя творы саломкапляцення, якія захапляюць сваёй вытанчанасцю і прыгажосцю.

На здымках нашага фотакарэспандэнта Ул. Крука—некаторыя работы народных майстроў, якія прадстаўлены на гэтай выстаўцы.

пераварочваў ёй сэрца, таму што кінуць яго, адмовіцца ад кахання — не магла тады, не хапала моцы. Здавалася, што не выжыць ёй без Андрэя, што свет замкнуўся на ім, і, адчуваючы вакол сябе страшнае кола, яна карчанела, губляла волю і рашучасць. Цярпела, а дакладней, ужо не заўважала павесялелай Наташы, якая цяпер штодзень прыходзіла ў РДК, змірылася з выбрыкамі Андрэя — але з тым большай сілай выкладвалася на сцэне, каля яго, гаварыла тое, што ў жыцці не магла выказаць.

— Ну, Танюха? Сягоння ж! Дамовіліся!

— Навошта ты мяне мучыш? Навошта табе ўсё гэта?

— Навошта? Адкуль я ведаю? Я мастак, слухаю свой унутраны голас. Хачу ведаць, ці кахаеш ты мяне... Так, як кахаюць іншыя. Ці любіш увогуле.

— Не люблю.

Сказала цвёрда, а на сцэну пайшла паўмёртвая. А дома не вытрымала і трох дзён. Прыйшла да яго — каб выгаварыцца, вырашыць нарэшце: можа, нечага не зразумелі яны, удваіх, можа, ён і праўда жартаваў, а яна жарту таго не ўлазіла? Ён не здзівіўся, убачыўшы панурую постаць на ганку. Павёў у хату, лёгка абняў за плечы, лёгка стаў чытаць:

Жизнь — истома и метанье,
Жизнь — витанье
Тени бедной...

Пацалаваўшы ў лоб, запытаўся з усмешкай:

— Чые вершы, ведаеш?

Не, яна не ведала таго, таму што ён ніколі не чытаў вядомых паэтаў. Ці знарок, ці бяздумна выбіраў тое, пра што ні Таня, ні іншыя гурткоўцы чуць не чулі — Аненскага, Іванова, Валошына. Неяк папрасіла яна ў раённай бібліятэцы Аненскага, на яе толькі паглядзелі здзіўлена. Папрасіла другім разам — у абласной — томік Іванова, прачытала—і мала што зразумела, але старанна завучвала цяжкія, цьмяныя радкі...

Не думалася, што горку тую, пра якую бабуля Еўфрасіння гаворыць, давядзецца пераадольваць з такімі намаганнямі... Відаць, не дарма ёсць той пагорак, тая вышыня ў кожнага. Не выпадкова сустрэўся ёй Андрэй — хіба інакш даведалася б яна, колькі ў ёй сілы дый крэпасці, ды бабчынай учэпістасці ў жыццё... Як жа згінала душу, як выкручвала яе каханне — а што, апроч кахання, можа перавярнуць жаночую душу? — але не, выжыла, вытрымала і — як выпрасталася, нарэшце, калі ў апошні раз і назаўсёды вырвалася з душнага, цёмнага палону...

Тады, як помніцца, вясна прыйшла рана, блакітныя капяжы віселі над дахамі, па рацэ плылі гарбатыя, пацямнелыя льдзіны, а ў высокім небе звінела бясконцая, урачыста-светлая песня жаўрука. Яна, Таня, ішла па вуліцы, сціскаючы сухія вусны, карычневыя боты глуха чмякалі па вадзе, хустка спаўзла з галавы, а на душы была і адрачонасць, і — падсвядомая — радасць ад таго, якім жа, аказваецца, вялікім можа стаць свет! І нейкая горкая мудрасць ад таго, што зразумела яна, нарэшце — пяройдзена горка, жывой, жывой засталася душа!

Скончыўся запазнелы канцэрт, і нястомны газік імчаў, накручваючы на сваты кіламетры, уперад, да раённай гасцініцы, дзе чакаў артыстаў вялікі пагнуты самавар, каторы раз уключаны ў разетку соннай дзяжурнай. Андрэй сядзеў на сваім месцы, глядзеў у акно і ўсё бачыў перад сабой Таццяну — такой, якой яна нядаўна ішла ў натоўпе, што падпіраў да выхаду. Яе гладка прычасаная галава была здалёк падобная да кветкі, футра прыгожа ляжала на плячах і хінулася да маленькага, але стройнага цела.

«Не пазнала, пэўна, не пазнала», — панура думаў ён, і атупенне, як пасля моцнага, бурнага перапою, навальвалася на плечы мацней і мацней, а ў небе, што праяснілася пасля нядаўняй завірухі, адзінока і непрыкаяна плыў маладзік, ныраючы, якраз як «рафік» у калдобіны, у рыхлыя аблокі і кожны раз выныраючы з іх...

ВЕРНАСЦЬ АБРАНАМУ ШЛЯХУ

НА ПЫТАННІ КАРЭСПАНДЭНТА ШТОТЫДНЕВІКА ТАІСЫ БОНДАР АДКАЗВАЕ НАРОДНЫ МАСТАК БССР ЯЎГЕН ЗАЙЦАЎ

— Яўген Аляксеевіч, сёння, калі прафесія мастака непазбежна становіцца масавай, калі патрабуецца ўсё большая колькасць высокакваліфікаваных мастакоў - выканаўцаў і калі мы з'яўляемся сведкамі таго, што ўзнікае традыцыя падкрэслена высокай (я сказала б нават — элегантнай) культуры выканання, як, у якім сэнсе ўжываецца тэрмін «высокае мастацтва»?

— Эпітэт «высокае» гаворыць аб асаблівай ідэйна-мастацкай якаснасці мастацтва, аб максімальна высокіх крытэрыях мастацкай творчасці. У гэтым сэнсе «высокае мастацтва», здольнае ўзбагачаць духоўны свет чалавека, уздымаць яго над будзённасцю, умацоўваць жыццёвыя патэнцыі, сёння патрэбна, як ніколі.

Ва ўзаемаадносінах мастака і гледача ў наш час шмат што змянілася. З аднаго боку, мастак нібыта стаў больш блізкім, даступным — зразумелым! — гледачу, яго праца ў пэўнай ступені страціла покрыў таямнічасці, недасягальнасці. З другога боку, гэтыя адносіны сталі больш апасродкаванымі — крытыка, мастацтвазнаўства, шматтысячныя рэпрадукцыі, кінафільмы... Нават не кранаючыся якаснага боку гэтых сувязей, можна ўявіць, што частка інфармацыі пры гэтым страчваецца, яна непазбежна карэкціруецца — страчваецца вельмі важны для мастацтва момант непасрэднасці ўспрыняцця арыгінала. Часам можна нават назіраць, як глядач, выхаваны ў асноўным на такім апасродкаваным успрыняцці мастацтва, пры сустрэчы з арыгіналам «не пазнае яго».

Ды, безумоўна, не толькі ў гэтым справа. На выстаўках апошняга дзесяцігоддзя ўсё часцей сустракаешся з вымалёўваннем вялікіх плямін, з падкрэслена контурнымі рашэннямі, часам з рацыяналістычнай робленасцю формы і прасторы ці, наадварот, з перайманнем дзіцячага прымітыву. Усё радзей сустракаешся з сапраўдным жывапісам...

— Што вы маеце на ўвазе?

— Спецыфічнай асаблівасцю жывапісу лічаць выкарыстанне колеру як сродку для пабудовы вобраза. Няцяжка паказаць, якое гэта недастатковае, няяснае вызначэнне жывапісу. У расфарбаваным малюнку колер таксама выкарыстоўваецца як сродак, што дапаўняе вобраз, хоць гэтае дапаўненне часта ўяўляецца залішнім. Ужываецца ён і ў колеравым эстампе. Але ўсё гэта — не жывапіс, хоць і расфарбаваны малюнак, і каляровы эстамп спрабуюць зрэдку яго імітаваць.

Жывапіс — мастацтва надзвычай цяжкае. Менавіта ў ім неабходна поўная каардынацыя дакладнага зроку, нервовай паслухмянай рукі, кампазіцыйнага дару і глыбокай эмацыянальнасці, успрыняцця, мудрасці, выхаванай вопытам. Хуткі поспех спадарожнічае хіба толькі геніям.

Патрэбна штодзённая работа, патрэбна фанатычная вера ў сваё прадвызначэнне.

Думаю, няўдачы (каго яны мінаюць?) моцнага духам мастака абавязваюць больш настойліва працаваць. Гэта слабыя — шукаюць кароткіх шляхоў да поспеху.

Жывапіс — подзвіг і драма мастака, пастаянная барацьба яго за цэласнасць і глыбіню творчага асэнсавання рэчаіснасці, за смелае, яркае ўвасабленне жыцця на палатне. Ён пад сілу нямногім.

— Яўген Аляксеевіч, галоўны і вельмі важны кірунак развіцця жывапісу — развіццё тэматычнай карціны, ці не так?

— Так, безумоўна. І беларускія жывапісцы, якія заўсёды стаялі на пазіцыі рэалізму, заўсёды шмат працавалі над вялікімі сацыяльнымі тэмамі. Гэта неаднойчы адзначалася. Яшчэ і да вайны, хоць і адчуваўся ў тагачасных работах недахоп чыста прафесійных ведаў, чыста прафесійнага майстэрства і ў малюнку і ў каларыце (людзей з вышэйшай мастацкай адукацыяй у рэспубліцы амаль што не было).

Тыя, хто прайшлі вайну і засталіся жывымі, лічылі, лічаць сваім абавязкам паказаць, расказаць аб гераічнай барацьбе нашага народа. Тэму тады не трэба было шукаць: мы змагаліся, разам з краінай перажылі той гераічны, той трагічны час. Перажытае рвалася на палотны. Грандыёзная тэма барацьбы стала нацыянальнай тэмай Беларусі.

Багата зроблена. Багата аб гэтым гаварылася і пісалася. Але жыццё не стаіць на месцы, яно ставіць перад мастакамі ўсё новыя і новыя задачы. Штодзень. Быць, заставацца на вышыні гэтых задач абавязак кожнага з нас. Складанае сёння жыццё, і, на жаль, — на маю думку — жывапіс адстае ад жыцця.

— Вы не перабольшваеце, Яўген Аляксеевіч?

— Хутчэй за ўсё, не. З кожным годам выстаўкі радуюць менш і менш. Пачынае знікаць карціна! Мала хто бярэцца за якуюсьці значную тэму — сацыяльна значную. Такое ўражанне, што ўсе займаюцца толькі самавыяўленнем, дакладней — самакорпаннем, сыходзячы да драбнатэм'я, да любавання нейкімі нязначнымі дэталямі, з'явамі, нібыта забыўшыся, што выяўлення, паказу чакае жыццё, наш час, наша рэчаіснасць.

Такое ўражанне, што мастакоўская думка нібыта слізгае па паверхні, не заглыбляючыся ў жыццёвыя з'явы, не аналізуючы пражытае, здзейсненае. Жывапіс раптам звярнуўся да рэпартажнасці, што заўсёды было хутчэй уласцівасцю графікі.

— Магчыма, гэта непазбежна, што вядомыя тэматычныя, сюжэтныя, кампазіцыйныя матывы ў сілу тых альбо іншых аб'ектыўных прычын прэвалююць у мастацкай творчасці?

— Мяне трывожыць нават не гэта. У экспазіцыі любой рэспубліканскай выстаўкі — 300—400 работ, і толькі лічаныя з іх — карціны. Многія сталі пісаць дачныя эцюды — далёка не едуць, глыбока не задумваюцца. Шмат хто ў нас сёння лічыць, што ён сябе ў мастацтве ўжо сцвердзіў, знайшоў сябе, свой стыль, сваю манеру. А мо занадта рана так лічыць?

Уважліва сачу за творчасцю і сваіх паплечнікаў і маладзейшых мастакоў. Заспакоіцца хто — глядзіш (ад выстаўкі да выстаўкі), пачынае паўтараць сам сябе, спыніўся на дасягнутым, становіцца аднастайным, нецікавым. Жыццё ж ідзе далей, мастак павінен ісці за жыццём, мяняцца — расці.

— Усё сказанае вамі тычыцца і апошняй па часе выстаўкі «Зямля і людзі»?

— Поўнасцю. Хаця я мушу агаварыцца: падыход да яе арганізацыі быў правільны. Прыцягнуць увагу ўсіх мастакоў, мастакоў розных пакаленняў, розных творчых почыркаў і накірункаў у рабоце, да адной значнай тэмы — такой з'яўляецца тэма сацыялістычнага пераўтварэння Палесся. Праўда, хацелася б больш творчых удач. І прычына, думаецца, адна: тэма патрабавала доўгатэрміновых паездак, глыбокага вывучэння краю, яго гісторыі, яго традыцый і побыту.

Наладжваліся выезды творчых груп. Неаднаразова. Але гэта нагадвала звычайныя камандзіроўкі: тыдзень, другі — і мастак, вярнуўшыся з паездкі, прыступаў да работы над палатном. Мастак не ведае— не паспеў уведаць! — чалавека ў жыцці, у працы; ён толькі разгледзеў яго: занатаваў знешняе аблічча. Вынік: так і піша —не чалавека з яго складаным духоўным светам, з пэўным светапоглядам, з непаўторным характарам, а — «скуру чалавека».

— Яўген Аляксеевіч, над чым вы працуеце? Якія новыя работы з'явяцца ў бліжэйшы час на выстаўках?

— Я заўсёды працаваў у жанры ваеннага, гістарычнага жывапісу. Тэмы — невычэрпныя. Многа не зроблена, не сказана мной дасюль. Ды заўважаю: больш, мацней стала хваляваць тэма сучаснасці. Узіраюся: які ён, мой сучаснік? Што хвалюе яго сёння? Што яму цікава?

Другі год працую над серыяй партрэтаў. Са зробленага можна назваць партрэты неглюбскіх ткачых, У. Е. Лабанка, народнага мастака БССР А. Анікейчыка, кіраўніка адной з правінцый Анголы Мяленджа... Сур'ёзна рыхтуюся да выстаўкі, якая адкрыецца напярэдадні XXVI з'езда нашай партыі, — «Мы будуем камунізм». Хацелася б напісаць карціну, у якой пэўным чынам былі б адлюстраваны 60 гадоў Савецкай улады ў рэспубліцы — тыя дасягненні, што радуюць нас і ўсіх прагрэсіўных людзей свету.

— І яшчэ адно пытанне: як вы ставіцеся да праблемы выхавання мастацкай моладзі?

— Да праблемы? Што ж, праблема, відаць, ёсць. За апошнія пяць гадоў Саюз мастакоў значна вырас, больш як дзвесце маладых творцаў — у маладзёжным аб'яднанні пры творчым саюзе. Што робіцца, каб дапамагчы ім у творчым росце, ва ўладкаванні? Па магчымасці — яны забяспечваюцца майстэрнямі, некаторыя з іх. Па магчымасці — з маладымі мастакамі заключаюцца дагаворы на будучую карціну як па лініі Міністэрства культуры, так і па лініі Саюза мастакоў. Па магчымасці — аказваецца дапамога па лініі Мастацкага фонду.

Я недарэмна паўтараю: па магчымасці... Справа ў тым, што вельмі ж малыя гэтыя магчымасці — памагчы пакуль што можна далёка не ўсім. І вось тут і пачынаюцца страты. Многія не вытрымліваюць першых жа цяжкасцей; далейшы шлях часта — камбінат, а тут майстэрства не расце, ператвараючыся ў рамяство...

Думаецца, віна за гэта, часткова, кладзецца і на падрыхтоўку жывапісцаў, у працэсе якой у будучых творцаў павінен выхоўвацца шырокі светапогляд...

Мала працуе з моладдзю бюро секцыі жывапісу, кантакты маладых з жывапісцамі старэйшага і сярэдняга пакаленняў найчасцей носяць выпадковы характар... Так што ёсць аб чым думаць нам усім!

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

КАЛІ ДРЭВА ГАВОРЫЦЬ

У начным небе павіс серп месяца. У яго прывідным святле — суровы і дзікі лес. Пачварныя ствалы, скурчанае голле, змеепадобнае карэнне дрэў надаюць чашчобе выгляд таямнічы і злавесны. У гэтым царстве мораку жывуць злыя сілы — Баба-Яга са сваімі прыслужнікамі. Да хаткі на курыных ножках прыпаўзлі змеі, зляцеліся совы, кажаны.

Гэта пано-разьба па дрэве карысталася на адной з абласных выставак асаблівай увагай. Выкананае з цэлага кавалка дрэва метадам скразной разьбы, яно прыцягвала шматлікіх наведвальнікаў. Усе элементы пано выкананы аб'ёмна і вызначаюцца незвычайнай тонкасцю, сапраўднай філіграннасцю работы. Разьбяру нельга адмовіць у багацці фантазіі.

Пра тое, што аўтару блізкі свет прыроды, расказваюць і іншыя яго работы, выкананыя з сукоў і карэнняў дрэва («Музыка», «Ласяня», «Птушка ў дупле», «Бусел»). Подпіс сведчыў, што іх аўтар — брастаўчанін Юрый Чарнёў.

Само па сабе імя аўтара яшчэ ні пра што не гаворыць. Хочацца ведаць пра яго больш. Чамусьці ён уяўляецца чалавекам ва ўзросце. На гэтую думку наводзіла майстэрскае выкананне работ. Думалася, за плячамі ўмельца шматгадовы вопыт, неаднаразовы ўдзел у выстаўках.

Аказалася — не так. Юрый — малады чалавек, толькі некалькі гадоў як звольніўся з вайсковай службы. І выстаўка ў яго першая. Пано «Казка» — таксама першая сур'ёзная работа. Яе поспех быў нават нечаканым для самога аўтара.

Гэта не значыць, што разец ён узяў у рукі ўпершыню. Але ўсе папярэднія работы — толькі спроба сіл, не больш. У дзяцінстве пастаянна наведваў выяўленчую студыю Дома піянераў, вучыўся маляваць пад кіраўніцтвам Міхаіла Сяргеевіча Талмачова, цікавіўся справамі юных скульптараў, разьбяроў, сам часам спрабаваў што-небудзь зрабіць. Больш за ўсё яму ўдаваліся вырабы з карэнняў і сучча дрэў. Кожная паездка ў лес давала багаты матэрыял для творчасці. Прырода часам падносіла ўжо гатовыя творы. Майстру заставалася толькі знайсці і надаць ім закончаныя формы.

Неяк на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці Юрый знайшоў сук з кавалкам цэглы, які намёртва ўрос у яго. Магчыма, гэтым кавалкам дрэва было пашкоджана ў дні гераічнай абароны. Рана зацягнулася, кара шчыльна абхапіла пабочнае цела і ўжо не адпусціла яго. У руках Юрыя знаходка ператварылася ў мастацкі твор: сам сук стаў берагам Буга, а камень, што ўрос у яго,— Холмскімі варотамі.

З часу абласной выстаўкі, у якой упершыню ўдзельнічаў Юрый Чарнёў, прайшло некалькі гадоў. Сёння малады мастак — прызнаны майстар разьбы па дрэве, неаднаразовы ўдзельнік рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак. Некаторыя з яго работ увайшлі ў экспазіцыі музеяў.

Казачны свет па-ранейшаму прыцягвае да сябе Юрыя Чарнёва. Ужо ўвасобіліся ў дрэве Іван-Царэвіч з Царэўнай-Лягушкай, ужо гатова вялікая скульптура Бабы-Ягі з яе памагатымі, ужо ў дэталях абмалявалася задума «Беларускага волата», які ўступіў у бітву са змеямі.

Юрый пастаянна ў пошуках новых тэм, сюжэтаў. Хочацца зноў вярнуцца да тэмы гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці, да прыроды Белавежскай пушчы, да партызанскай барацьбы ў беларускіх лясах.

У. МАЛАШЭЎСКІ.

СПЕЎ ПЯШЧОТНЫ ТРУБЫ...

У той дзень у клубе вытворчага аб'яднання «Гарызонт» было надзвычай людна. Выступленні народнага эстраднага аркестра заўсёды выклікалі цікавасць сярод слухачоў і збіралі шырокую аўдыторыю прыхільнікаў гэтага віда музычнага мастацтва. Але ж гэты канцэрт быў асабліва ўрачысты— адзначалася дзесяцігоддзе калектыву. Не трэба гаварыць пра тое, як адчувалі сябе музыканты і іх нязменны мастацкі кіраўнік заслужаны артыст БССР В. Волкаў — творчае хваляванне ўласціва ўсім, хто выходзіць на сцэну...

І вось глядзельную залу запаніла мелодыя «Шахерэзады» М. Рымскага-Корсакава ў апрацоўцы для эстраднага аркестра Віталія Волкава. Слухаючы выкананне гэтага інструментальнага твора, не перастаеш здзіўляцца тэхнічнай дасканаласці музыкантаў-аматараў. Празрыста гучыць сола на сапрана-саксафоне Генадзя Фралова — электрыка аб'яднання. Ярка і поўна ўступае труба інжынера Станіслава Навіцкага; эмацыянальна працягвае музычную эстафету флейтыст Сяргей Лашкоўскі...

Цяжкі і цікавы быў шлях аматараў да майстэрства. У ліпені 1978 года аркестру было прысвоена ганаровае званне народнага, якое калектыў пацвярджае і сёння на разнастайных конкурсах. На І Усесаюзным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці працоўных народны эстрадны аркестр ВА «Гарызонт» заваяваў званне лаўрэата. Такое ж званне калектыву было прысуджана і на Усесаюзным конкурсе лаўрэатаў гэтага фестывалю, які праходзіў на ВДНГ СССР. Летась аркестр стаў лаўрэатам конкурсу «Юнацтва Палесся», які адбываўся ў Салігорску. А на конкурсе «Водгукі Гаўі-80», што праводзіўся ў горадзе Сігулда Латвійскай ССР, дабіліся поспеху і салісты-вакалісты: выпрабавальніца радыёапаратуры Галіна Смятаніна заваявала званне лаўрэата і атрымала дыплом І ступені, інжынер-канструктар Віктар Жораў быў узнагароджаны заахвочвальным дыпломам.

Мінула дзесяцігоддзе з таго часу, як кіраўніцтва вытворчага аб'яднання «Гарызонт» запрасіла Віталія Васільевіча Волкава, саліста Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Белдзяржфілармоніі, стварыць тут эстрадны аркестр. Работа вялікая. Адно — аркестр з прафесійных музыкантаў, зусім іншае — пачынаць гэту работу з самадзейнымі музыкантамі. Эстрадны аркестр — жанр даволі спецыфічны і складаны для самадзейнасці. Музыкантам такога аркестра неабходна мець і добрую падрыхтоўку індывідуальнага выканаўства на інструментах, і ўменне валодаць ансамблевай ігрой, і свабоднае чытанне нот і многае-многае іншае. Віталій Волкаў ведаў, што ўсю работу яму трэба пачынаць, як кажуць, з нуля. Але гэта не спыніла яго. Яшчэ студэнтам Уральскай кансерваторыі імя Мусаргскага (клас прафесара Вячаслава Іванавіча Шчолакава (труба) Віталій Волкаў іграў у многіх джазавых і эстрадных ансамблях. Тады і з'явілася мара стварыць свой аркестр.

Пачаў Віталій Волкаў з індывідуальных заняткаў з тымі, хто жадаў трапіць у калектыў. Навучаў іх навыкам ігры на саксафонах, флейце, трубе, трамбоне, барабанах, гітарах. Толькі пасля гэтага пачаліся аркестравыя рэпетыцыі. Ім кіраўнік аддаваў увесь свой вольны час, і ў выніку праз тры месяцы эстрадны аркестр паспяхова выступіў на сваім першым канцэрце перад таварышамі па рабоце.

І пайшла пра аркестр слава па заводзе. Са сваім любімым калектывам рабочыя і служачыя аб'яднання сустракаюцца на розных культурна-масавых мерапрыемствах, на танцавальных вечарах.

Мінаў час, і эстрадны аркестр становіцца папулярны не толькі ў Мінску, але і ў рэспубліцы. Ён часты госць на розных канцэртных пляцоўках, у парках культуры і адпачынку, у калгасах і саўгасах, воінскіх часцях. У канцэртных праграмах калектыву гучаць інструментальныя творы і песні савецкіх і замежных кампазітараў, рускія і беларускія народныя песні. Яго запрашаюць выступаць у Вільнюс, Каўнас, Рыгу, Маскву, Нікалаеў, Алушту, Ерэван...

Калі паўстала пытанне, які калектыў паслаць у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку на святкаванне 30-годдзя Перамогі над гітлераўскім фашызмам, сумненняў не было — эстрадны аркестр Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт».

— Нас вельмі добра прымалі ў ГДР, — успамінае Віталій Волкаў. — У перапынках і пасля канцэрта нашых хлопцаў літаральна атакавалі ўзрушаныя слухачы — яны ніяк не маглі паверыць, што так могуць іграць непрафесійныя музыканты...

Гэтак жа трыумфальна праходзілі выступленні аркестра і ў 1978 годзе, калі самадзейных музыкантаў з Мінска запрасілі зноў у ГДР для выступленняў у Патсдамскай акрузе.

Пра музыкантаў аркестра можна расказваць многа. Але я хачу спыніцца на тых, хто ўсе гэтыя гады не расстаецца з родным калектывам. Гэта слесар Анатоль Холкін і слесар-зборшчык Мікалай Грышкевіч, якія іграюць на гітарах. Дзесяць гадоў у творчым кантакце два трубачы — электрамеханік Анатоль Камароў і рэгуліроўшчык радыёапаратуры Аляксандр Гарошка. Заўсёды цёпла слухачы прымаюць і салістаў - вакалістаў інжынера Люцыю Волкаву і рэгуліроўшчыка радыёапаратуры Яўгенія Рудэнку. Душой калектыву: як заўсёды, застаецца Людміла Чарніна.

Усе ўдзельнікі аркестра — людзі энергічныя, мэтанакіраваныя, выдатныя работнікі, грамадскія актывісты. Асабліва хочацца адзначыць Станіслава Навіцкага, трубача аркестра. Маючы разрад па футболе, ён абараняе яшчэ і спартыўны гонар аб'яднання. Акрамя гэтага, Станіслаў з'яўляецца членам партбюро аддзела вытворчай эстэтыкі.

Любяць і паважаюць удзельнікаў эстраднага аркестра на аб'яднанні. Вялікі клопат праяўляюць аб калектыве намеснік генеральнага дырэктара па быце Станіслаў Байдак, дырэктар клуба Тамара Магіленка. Словы ўдзячнасці трэба сказаць і ў адрас парткома, мясцкома, адміністрацыі гэтага прадпрыемства.

Такія адносіны да пытання развіцця мастацкай творчасці прыносяць свой плён. Усе калектывы ВА «Гарызонт» прымаюць самы актыўны ўдзел у гарадскіх і рэспубліканскіх аглядах - конкурсах, дзе займаюць вядучыя месцы. З дванаццаці калектываў аб'яднання пяць удастоены звання народных. Акрамя эстраднага аркестра, гэта ансамбль «Алеся» (кіраўнік А. Гундараў), мастацка-агітацыйная брыгада (кіраўнік Н. Міцук), народны хор (кіраўнік А. Андросаў), духавы аркестр (кіраўнік А. Голад).

Эстрадны аркестр ВА «Гарызонт» — адзін з чатырох народных аркестраў, якія ёсць у рэспубліцы. Канкрэтны прыклад яго творчага шляху яшчэ раз пераканаўча даказвае, што там, дзе ёсць сапраўдная захопленасць справай, заўсёды будзе поспех.

А. КАРАЦЕЕЎ,
старшы рэдактар канцэртнай залы Белдзяржфілармоніі.
Фота А. ХАРКОВА.

КРАІНА ДЗІЎНАЯ — ТЭАТР...

Тэатр... Сапраўды — дзіўная краіна. Незвычайная. Тэатр яшчэ можна параўнаць з вялікай дружнай сям'ёй, якая гасцінна запрашае вас у свой дом і якая радуецца сустрэчы з кожным сваім сябрам. Тут заўсёды шумна і цікава. Таму і прыходзяць сюды як на свята. Нездарма М. Гогаль у свой час пісаў, што тэатр — гэта такая кафедра, з якой можна сказаць свету шмат добрага. І якім бы ні быў тэатр — прафесійным ці самадзейным, — ён заўсёды павінен заставацца Тэатрам. Новым, сучасным.

Сёння наша гаворка пойдзе пра народны тэатр Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Нататкі гэтыя з'явіліся пасля прагляду спектакляў, шматлікіх сустрэч, знаёмстваў з яго ўдзельнікамі. Я не адчувала сябе чужой у іх сям'і. І як было прыемна, што калектыў гэты жыве сапраўды творчым жыццём і радуе нас сваім мастацтвам.

Тры разы на тыдзень у тэатры рэпетыцыя. Акцёры прыходзяць задоўга да яе пачатку. Проста, каб пабыць разам, паразмаўляць, падзяліцца навінамі, расказаць свае прыгоды. Аказваецца, тэатр — гэта не толькі рэпетыцыі, спектаклі, гэта яшчэ і сябры, неадлучныя ад цябе, як неадлучны і іх удачы і няўдачы, якія становяцца таксама і тваімі.

...Хутка пачнецца рэпетыцыя — амаль усе ў зборы. Рэжысёр Дзіна Георгіеўна Тыцюк раіць акцёрам, як лепш падабраць касцюм, дае свае парады:

— Не, Эла, нельга выходзіць у такім касцюме на сцэну. Колер не той. Не трэба было перафарбоўваць сукенку. Акцёр павінен іграць у адным і тым жа касцюме шмат спектакляў, каб адчуць, што гэта сапраўды яго касцюм, яго поступ, мова. Адным словам, паверыць, што гэта яго герой...

Валерый Данілавіч Анісенка, галоўны рэжысёр тэатра, вядзе рэпетыцыю, як у прафесійным тэатры. Па некалькі разоў паўтарае адну і тую ж мізансцэну. Асобныя моманты паказвае сам. Кожны рух старанна адточваецца. Усё павінна быць так, як і на спектаклі. Заўтра аматары паказваюць «Дзве стралы» па п'есе А. Валодзіна.

— Наш спектакль павінен быць крыштальны, крохкі, як сцэна Юнака і Дзяўчыны, — гаворыць Валерый Данілавіч, працуючы з Элай Зяньковай (Дзяўчына) і Сяргеем Ляпічам (Юнак)...

Рэжысёр дае парады і Лене Зайцавай, якая іграе Удаву:

— Твая гераіня павінна быць сапраўдная, глыбокая. На жаль, гэтага пакуль не атрымліваецца...

У гэтым незвычайным доме любяць слухаць адзін аднаго, прыслухоўвацца да парад. Тут усе як браты і сёстры, якія жывуць адной марай — стварыць спектакль...

Вось нарэшце гэты радасны і ўрачысты дзень настаў.

Уявіце сабе вялікую студэнцкую аўдыторыю, напоўненую гледачамі. Парты і сталы вынесены. Хтосьці трымае ў руках праграму, а хтосьці кветкі. Хутка глядзельная зала заціхне і спектакль пачнецца...

Хто забыўся — сёння аматары іграюць «Дзве стралы» А. Валодзіна. Дагістарычная прытча - дэтэктыў у каменным веку. Пастаноўка В. Анісенкі. Рэжысёр - педагог Дзіна Тыцюк, кампазітар — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР С. Картэс, мастак па касцюмах Л. Лобан.

Тэатр не выпадкова звярнуўся да гэтай п'есы А. Валодзіна. Старая ісціна — мінуўшчына такая ж цікавая, як дзень сённяшні і будучы. Разам з аўтарам артысты-аматары расказваюць гледачу пра цудоўныя чалавечыя пачуцці, пра добрых і дрэнных людзей, пра вечнае імкненне чалавека да дабра. На сцэне — сціплае афармленне: лясная паляна, своеасаблівы «заднік» — былыя зялёныя кулісы — лес. Тут, на паляне — нашы продкі. Яны адпачываюць, збіраюцца на савет, судзяць адзін аднаго, выносяць прысуд.

Доўгі час жыў гэты род мірна між сабой, змагаўся з ворагамі. Але нечакана нешта дзіўнае пачало адбывацца ў яго жыцці. Усё часцей тут стала чуваць хлусня, сварка... А нядаўна знайшлі забітага родзіча. Дзве стралы былі ў яго ў спіне. І самае страшнае — выявілася, што стрэлы гэтыя Вушастага — юнака з таго ж самага роду... Як гэта здарылася? Няўжо Вушасты мог зрабіць злачынства?..

Відаць, не мае сэнсу пераказваць змест усяго спектакля. Застаецца толькі паглядзець яго. Не сумняваюся — вам будзе цікава. Артысты-аматары працуюць самааддана, захоплена. Любяць сваіх герояў. Нават паміж сабой завуць адзін аднаго іх імёнамі.

— Я люблю сваіх артыстаў, — гаворыць Валерый Анісенка. — Люблю прыходзіць да іх. Весці дыскусіі ці проста размаўляць пра тэатр, музыку, пра цікавыя вечары, выстаўкі. Справядліва хтосьці заўважыў, што акцёры — гэта самая ранімая частка творчага чалавецтва. Ім патрэбна разуменне. Акцёры нашага тэатра — гэта і студэнты: Раман Кветнер — з мехмата, Пеця Марцаў — з філфака, Наташа Якімава і Сяргей Ляпіч — з журфака. Гэта таксама і аспіранты, і маладыя выкладчыкі, як Алена Зайцава і Віця Каратай...

Слухаю рэжысёра і думаю: як цудоўна, што людзі самых розных у будучым прафесій маюць адзінае захапленне. Прыходзяць у тэатр, каб разам радавацца і дзяліцца няўдачамі.

— Наш калектыў сталы, — працягвае Валерый Данілавіч. — Але «Дзве стралы» — гэта наша першая сумесная работа. Марым паставіць «Клапа» Маякоўскага. Вельмі хочацца, каб гледачам было цікава...

Тэатр — гэта і сапраўды цудоўны дом. Нідзе людзі не становяцца такімі блізкімі адзін аднаму, як тут. Яны заўсёды разам — і на новых прэм'ерах, і на днях нараджэння, і проста ў шумнай студэнцкай аўдыторыі. Мабыць, таму і іду я ў тэатр з нейкай асаблівай трывогай і захапленнем. Нібы адплываю ў далёкую дзіўную краіну...

Вераніка КОЗЕЛ.

КНІГАПІС

А. КАВАЛЕВА. Рабіна. Вершы. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

Аўтар гэтага паэтычнага зборніка — чалавек нялёгкага лёсу. А. Кавалёва не скарылася цяжкасцям, умее радавацца жыццю і расказвае пра гэта, хоць і нягучна, але шчыра, пранікнёна. Чытачу спадабаюцца вершы А. Кавалёвай пра родную прыроду, любоў да бацькоўскай зямлі.

Е. ДРОМІН.



А. МЕЛЬНІКАЎ. Тры словы. Вершы. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

«Тры словы» — другая паэтычная кніжка Аляксандра Мельнікава, урача па прафесіі. Як і ў папярэднім зборніку «Дзякуй, жыццё!», што выйшаў у серыі «Першая кніга паэта» ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» (1977), аўтар піша пра любоў да Радзімы, расказвае пра людзей сваёй прафесіі, услаўляе чысціню чалавечых пачуццяў.

В. РАСОЛЬКА.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

АТМАСФЕРА Ў СТУДЫІ... ЯКАЯ ЯНА?

Чалавек на тэлеэкране ўступае з намі ў псіхалагічны кантакт. Ні радыё, ні друк не валодаюць магчымасцю ствараць такую асаблівую атмасферу. З усіх сродкаў масавай інфармацыі толькі тэлебачанне дае нам ілюзію нашага непасрэднага, штохвіліннага гуказрокавага дыялога з канкрэтным чалавекам. Не толькі па словах, якія мы чуем, але і па яго міміцы, жэстах мы мяркуем аб меры яго шчырасці і адкрытасці, унутранай напоўненасці, праўдзівасці. Глядач вельмі чуйны на ўсялякі фальш у інтанацыях, позірку, руху і вельмі ўдзячны тэлебачанню за кожны «момант ісціны» — за сапраўднае адкрыццё новага цікавага чалавека, за новую змястоўную сустрэчу са старым добрым знаёмым.

Якія ж уражанні робяць перадачы рэспубліканскага тэлебачання з гэтага пункту гледжання? Ці заўсёды адбываецца сапраўдны дыялог з героямі тэлеперадач? Вядома, гэтае пытанне звязана з шырокім колам праблем, і на яго не адкажаш у адным артыкуле. Я спынюся толькі на такіх яго аспектах, як культура ўзаемаадносін удзельнікаў перадачы паміж сабой і з намі — гледачамі.

Якая атмасфера пануе ў кадры? Ці цікава вядучаму тое, пра што ён гаворыць з запрошанымі ў студыю? Ці натуральна адчуваюць сябе ў тэлевізійных умовах госці тэлебачання? Ці сапраўды адбываецца тут працэс зацікаўленага абмену думкамі — альбо толькі фармальна прагаворваецца падрыхтаваны раней тэкст сцэнарыя? Ад усяго гэтага (а часам і ад нязначных, здавалася б, дэталей) залежыць поспех той ці іншай перадачы. Бо вядома, што калі ўсё, пра што ідзе гаворка ў студыі, сапраўды цікава ўдзельнікам перадачы, яно ўсхвалюе і нас. Калі ж гэта толькі імітацыя зацікаўленасці, «гульня на публіку», «прадстаўленне» для нас, то мы беспамылкова адчуем падман і пераключым тэлевізар на іншы канал.

Паглядзім, як гэта адбываецца на практыцы.

... Ідзе перадача галоўнай рэдакцыі прапаганды «Публіцыст» (рэжысёр Л. Шчацінкіна). Вядучы (І. Рудамётаў) гаворыць з двума запрошанымі ў студыю — Варварай Саламаха (Героем Сацыялістычнай Працы, педагогам прафесійна-тэхнічнага вучылішча пры Мінскім тонкасуконным камбінаце) і Героем Сацыялістычнай Працы шліфавальшчыкам Мінскага завода аўтаматычных ліній Канстанцінам Саленікам. Побач з імі сядзіць немалады ўжо сівавалосы чалавек. На яго грудзях — узнагароды ваенных гадоў. Але чамусьці ён гледачу не прадстаўлены. Толькі ў сярэдзіне перадачы вядучы знянацку звяртаецца да сваіх субяседнікаў. «Я вам прадстаўлю Міхаіла Ніканоравіча Філонава больш падрабязна...» (?). Аказваецца, як гаворыць вядучы, гэты госць не знаёмы ўдзельнікам перадачы. І гэта не інтрыгуючы сюжэтны ход (як, напрыклад, у перадачы «Ад усёй душы»), а звычайная нетактоўнасць. Нарэшце трое ўдзельнікаў перадачы пазнаёміліся адзін з адным. Відаць, што гэта людзі цікавыя, з багатым жыццёвым вопытам. Ім, пэўна, ёсць пра што расказаць адзін аднаму (і нам — таксама). Але размова вядзецца фармальна, суха. Мо таму, што вядучы адразу ведае адказы літаральна на ўсе пытанні, якія ім задасць. Яго, па сутнасці, і не цікавяць гэтыя адказы. Перад ім жа — тэкст сцэнарыя, у які ён раз-пораз зазірае, а перад яго вачамі, пэўна, студыйны гадзіннік, які напамінае пра тэрмін заканчэння размовы. І калі адзін ці другі герой крыху разгаворыцца, вядучы вяртае яго ў русла сцэнарыя стэрэатыпнай фразай, накшталт: «Кожны малады чалавек зацікаўлены, каб яго ўвёў у жыццё старэйшы за руку...»

Майстэрства дыялога на тэлеэкране вельмі складанае. Вядучы павінен быць, па-першае, чалавекам добра арыентаваным у праблеме, а, падругое, шчыра зацікаўленым ў прадмеце размовы. Ніякая імітацыя зацікаўленасці тут не пераканае.

Дыялог павінен быць сапраўдным дыялогам двух субяседнікаў, а не казённым, фармальным прамаўленнем пытанняў (нібыта ад імя «мас», а не ад імя канкрэтнага вядучага) і гэткім жа фармальным адказам на пытанні запрошаных у студыю людзей.

Значыць, зацікаўленасць? Так. Значыць, сапраўднае веданне справы? Так. Але ж гэта аксіёмы. Так, аксіёмы, але пра іх варта не забываць на практыцы.

Ёсць і яшчэ адна важная рыса псіхалагічнага кантакту герояў у кадры — шчырасць. Вядома, я не маю на ўвазе свядомую няшчырасць, але хачу закрануць такую далікатную тэму, як праўду паводзін, натуральнасць інтанацый, рухаў, вымаўлення. Што і казаць, для многіх умовы тэлеперадачы ці відэазапісу з'яўляюцца экстрэмальнымі, тут, пад пільным вокам камеры (яшчэ калі ўявіш сабе шматмільённага гледача), любы чалавек можа збянтэжыцца, паводзіць сябе ненатуральна, скавана. Але ж на тое і тактоўны рэжысёр, і спрактыкаваны вядучы, каб зрабіць своеасаблівую «псіхалагічную тэрапію», дапамагчы чалавеку стаць самім сабой. Як часта, на жаль, гэтага не адбываецца!

Якія ж аптымальныя ўмовы для сапраўднага псіхалагічнага раскрыцця ўдзельнікаў перадач? Калі мы глядзім конкурсы «А ну, дзяўчаты!», «Што? Дзе? Калі?» ці «Вас выклікае «Спартландыя», нам цікава не толькі даведацца пра колькасць балаў, атрыманых асобным удзельнікам ці камандай, але і пазнаёміцца з тым ці іншым канкрэтным чалавекам, узбагаціць сваё ўяўленне аб сучасніку. І аўтары названых перадач заўсёды клапоцяцца пра гэта. На-

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

МОВАЙ НАРОДНАЙ ПАЭТЫКІ

Сярод разнастайных тэм выяўленчага мастацтва нашай рэспублікі значнае месца ў апошні час займае фальклорная тэматыка — увасабленне выяўленчымі сродкамі прыгажосці і багацця народых свят і абрадаў, сцвярджэнне гуманістычнай асновы песеннай, музычнай, вусна-паэтычнай творчасці народа, услаўленне чалавека працы, яго духоўнай і фізічнай прыгажосці.

Варта адзначыць, што актыўны зварот да выкарыстання ўзораў народнай творчасці ў творах выяўленчага мастацтва характэрны не толькі для Беларусі, ён вызначае адну з галоўных тэндэнцый мастацтва ўсіх нацыянальных рэспублік нашай краіны на сучасным этапе. Што датычыцца беларускага савецкага выяўленчага мастацтва, дык можна з упэўненасцю гаварыць, што такая тэндэнцыя была ўласціва яму з першых крокаў.

Вялікае ўражанне выклікаў у свой час твор, які зараз па праву з'яўляецца класікай беларускай скульптуры, — «Лірнік» Аляксандра Грубэ, створаны ў 1926 годзе. Работа была своеасаблівым адказам на шматлікія пытанні, якія ставілі перад сабой многія мастакі 20-х гадоў, шукаючы выйсця з заблытаных лабірынтаў модных у тыя часы «...ізмаў».

Ідэю бескампраміснасці і чысціні шукаў у народнай творчасці жывапісец Міхась Філіповіч. Ён таксама не раз звяртаўся да вобразаў народнага музыкі, бачачы ў дударах, лірніках, цымбалістах жывых носьбітаў гісторыі, самабытнай творчасці і адметнасці народа. Найбольш вядомыя дзве яго карціны на тэму «Купалля» — адна з іх знаходзіцца ў Беларускім дзяржаўным мастацкім музеі, другая захоўваецца ў музеі Янкі Купалы.

Шмат намаганняў для захавання духоўнай спадчыны народа прыклаў таленавіты мастак Язэп Драздовіч, нястомны падарожнік па родным краі. За час вандраванняў па гарадах і вёсках Заходняй Беларусі ён зрабіў вялікае мноства этнаграфічных замалёвак народнага дойлідства, прылад працы, прадметаў хатняга ўжытку. Вялікую каштоўнасць уяўляюць замалёўкі тканін, дываноў, паясоў, беларускай вопраткі. Вядомы і станковыя працы мастака. Гэта серыя малюнкаў, прысвечаная старажытным помнікам архітэктуры.

Імкненне зберагчы для народа яго здабыткі добра зразумелае і сённяшнім майстрам выяўленчага мастацтва.

Вялікім энтузіястам вывучэння ўзораў народнай творчасці быў Лявон Баразна, які трагічна загінуў у росквіце творчых сіл. Тры вялікія альбомы малюнкаў: «Беларускі народны арнамент Палесся», «Беларуская народая вопратка» і «Арнамент Гродзеншчыны» — яго ўклад у мастацтва. На аснове вывучэння народнага адзення розных рэгіёнаў нашай рэспублікі Л. Баразна выконваў эскізы сцэнічных касцюмаў для шматлікіх калектываў мастацкай самадзейнасці...

Народная творчасць знаходзіла сабе ўсё больш і больш прыхільнікаў сярод прафесійных мастакоў. Тэмай многіх твораў Алесі Паслядовіч стала шматгранная народная паэзія, шчырая, задушэўная песня. «Па матывах народных песень» — выдатная серыя аўталітаграфій, якая нібыта з'яўляецца графічным эквівалентам музычнага ладу і паэтычнай мовы.

Моцная сувязь з народнай творчасцю вызначае агульны напрамак твораў А. Паслядовіч, а фальклорная тэма — адна з улюбёных. Аб гэтым сведчаць розныя па жанры працы мастачкі — тэматычныя кампазіцыі, партрэты, нацюрморты, вядомыя па выстаўках і публікацыях у друку. Сярод іх серыя «Беларускія народныя святы», акварэль «Гаспадыня», серыя аўталітаграфій «Народныя майстры», каляровая літаграфія «Беларуская песня», аўталітаграфія «У суботу Янка ехаў ля ракі» і многія іншыя.

Далейшае развіццё фальклорнай тэмы ў творах выяўленчага мастацтва 60—70-х гадоў — вынік глыбокай зацікаўленасці і пільнага вывучэння яе лепшых узораў. Працягваючы размову пра графікаў, трэба адзначыць поспехі многіх мастакоў у творчым асваенні нашай духоўнай спадчыны. Яркія працы на тэмы дзіцячага фальклору стварае Алена Лось, творчая індывідуальнасць якой адзначана выкарыстаннем традыцый народнага жывапісу і малюнка ў самой тэхніцы. Серыі лінарытаў да казкі З. Бядулі «Скарб», па матывах паэзіі для дзяцей «Саўка ды Грышка ладзілі дуду», «Пасу, пасу авечкі», «Кую, кую ножку», іншыя станковыя працы і кніжныя ілюстрацыі вабяць адметнасцю кампазіцыйнага вырашэння, сакавітасцю графічнай мовы. Каляровае вырашэнне эстампаў А. Лось, у якіх дамініруе чорны контур, спалучаны з чырвонымі, аранжавымі, зялёнымі фарбамі, пераклікаецца з матывамі народнага лубка. Гэтая асацыяцыя ўзмацняецца наяўнасцю тэкставага аздаблення эстампаў.

Вядомая маленькаму чытачу па афармленні шматлікіх кніжак, а наведвальнікам выставак па серыях акварэлей і літаграфій Наталля Паплаўская («Героі беларускіх казак» — серыя літаграфій, ілюстрацыі да казкі «Музыка-чарадзей», серыя акварэлей «Казка за казкай» і іншыя).

Высокую ацэнку мастацкай крытыкі атрымалі ілюстрацыі Валерыя Славука да казкі «Удовін сын» і Уладзіміра Савіча да зборніка беларускіх народных казак, які выдадзены на англійскай мове.

Творчы пошук апошняга вызначыўся ўжо ў дыпломнай працы — ілюстрацыях да камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта». Буйнапланавая кампазіцыя ягоных літаграфій уражвае бадзёрым, жыццесцвярджальным настроем, дынаміка складанага рытму заўсёды адпавядае адмысловай, характэрнай менавіта для беларусаў пластыцы. Вобразы, створаныя маладым мастаком, заўсёды пазнавальныя і праўдзівыя — дзякуючы майстэрскаму раскрыццю адметных рыс нацыянальнага характару і пільнай увазе да этнаграфічных дэталей.

Пазбаўляючыся ад павярхоўнага падыходу да традыцый народнай творчасці, мастакі шукаюць глыбінны, першапачатковы сэнс і тую ролю, якую адыгрывае духоўная спадчына ў фарміраванні светапогляду эстэтычнага густу нашых сучаснікаў. Вывучэнне мовы народнай паэтыкі складае моцную аснову, на якую апіраюцца пошукі многіх беларускіх жывапісцаў. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, такія розныя па во-

пэўна, многім запомніліся прыгожыя, спрытныя і дасведчаныя дзяўчаты з конкурсу «А ну, дзяўчаты!», кемлівыя і разумныя «Знатакі» з конкурсу «Што? Дзе? Калі», няўрымслівыя і вясёлыя падлеткі з беларускай «краіны» «Спартландыя». Перадачы маюць такую мастацкую структуру, што героі самімі абставінамі пастаўлены ва ўмовы, дзе яны могуць раскрыцца перад намі. Эмацыянальная атмасфера гэтых тэлеперадач з яўляецца своеасаблівай гарантыяй, што цікава будзе і нам, тэлегледачам.

...Ідзе тэлеконкурс «Ваша слова, эрудыты!». Перадача з салідным шматгадовым вопытам, добрымі традыцыямі. Якая ж псіхалагічная атмасфера пануе на гэты раз у студыі? Школьнікам было дадзена «дамашняе заданне» — расказаць пра помнікі Беларусі (у Жодзіне, на плошчы Перамогі ў Мінску і г. д.). Яны зацверджана расказваюць «на памяць» вядомыя звесткі пра гэтыя помнікі. Нашто ў структуры тэлеконкурсу такі «філіял» школьнага ўрока, нашто гэтыя фармальныя дамашнія заданні? Ці трэба, каб журы імітавала калектыў педагогаў у час школьных экзаменаў? Ці ж у гэтым сэнс тэлеконкурсу? Ці ж зацікавіць нас такая псіхалогія кантакту дарослага і падлетка, дзе першы выступае як бездакорны носьбіт энцыклапедычных ведаў, які строга правярае магчымасці памяці школьніка, а малады чалавек дэманструе здольнасці механічнай памяці? Ці ж можна такога падлетка сапраўды назваць «эрудытам»?

На маю думку, у гэтай конкурснай праграме вельмі важны настрой своеасаблівага партнёрства, зычлівага гумару, калектыўнага роздуму. Самыя цікавыя моманты перадачы, як правіла, тыя, дзе школьнікі разважаюць, праяўляюць не механічную памяць, а ўменне самастойна мысліць, а часам і фантазіраваць, і жартаваць таксама (чаму б не?). Ды і ў журы таксама ж жывыя людзі — і іх рэакцыя на імправізаваныя сітуацыі, на арыгінальныя і нечаканыя адказы, на самастойныя думкі таксама вельмі цікавая. Вось, напрыклад, такой эмацыянальна афарбаванай была атмасфера ў студыі ў час перадачы (рэжысёр К. Еўлампіеў, рэдактар Л. Ротмілеў), калі школьнікі, адказваючы на пытанні пра афармленне кніг, не проста назвалі імёны мастакоў Г. Паплаўскага і А. Кашкурэвіча, а расказалі пра сваё асабістае ўспрыняцце іх твораў (і нават пра наведванне іх майстэрань).

Шматграннае развіццё асобы маладога чалавека — вось звышзадача ўсіх маладзёжных праграм. Кожная з іх выконвае гэтую функцыю згодна з своеасаблівым жанрам перадачы, яе стылявым вырашэннем.

...Ідзе «Дыскатэка», праграма цыклавай перадачы. Цікавасць да такой праграмы ў моладзі найбольшая. Музыка, танцы, вясёлы адпачынак. Радасная атмасфера эмацыянальнай раскаванасці, зносін з равеснікамі. Блок танцавальных нумароў з кароткімі каментарыямі ў агульным рытме з музыкай. Гэтага міжволі чакаеш ад тэледыскатэкі. Але ці ж сапраўды ўсё гэты мы бачым на тэлеэкране? На жаль, не. У кадры — вядучы, які вядзе музычную частку дыскатэкі. Ён чытае зацягнутую лекцыю пра дыскамузыку, з павольнымі паўзамі. У час яго «прамовы» ззаду мільгаюць агеньчыкі, устаноўкі «светамузыкі», якія адцягваюць увагу ад яго тэксту, часам гучаць урыўкі з фоназапісаў, якія таксама манцируюцца на слых са словамі. У выніку гукапластычны вобраз перадачы раздрабняецца, яна распадаецца на кавалкі. «Дыскатэка» — перадача патрэбная, і атмасфера чалавечых узаемаадносін у ёй павінна быць асаблівай — і эмацыянальна раскаванай і разам з тым прадумана вызначанай, выверанай па рытме.

Усё часцей сёння мы ўспамінаем вядомыя словы пра «раскошу чалавечых узаемаадносін». Такую раскошу дае нам не толькі само жыццё, але і тэлебачанне з яго неабсяжнымі магчымасцямі (успомнім хаця б нашы, «асабістыя» кантакты з І. Андронікавым, С. Абразцовым, С. Капіцай, Э. Разанавым і іншымі). Хацелася б, каб часцей такія незабыўныя моманты псіхалагічнага кантакту са светам непаўторнай асобы дарыла нам і рэспубліканскае тэлебачанне.

Вольга НЯЧАЙ.

СЛОВАМ ПУБЛІЦЫСТА

Максім ЛУЖАНІН

НА АДЫХОД,

пакуль што прэзідэнту, Дж. Картэру

Прывод гудзе.
Пакуль што прэзідэнт
Дае ў цапы ваеннай малатарні
Жыццё людзей...
У жорсткім руху прэнт,—
Пакуе склад заморская збраярня.

Збраярня, так... А як назваць інакш
Мясціну, дзе майструюць прорву зброі?
Рване—і можа мілы шарык наш
Рассыпацца, не будзе больш Зямлёю.

Папусцішся—пачнуць наноў В'етнам,
Закладзена абойма правакацый...
Што ж, хлопцы міру? Вам, як і дзядам,
Дзе-небудзь ды патрэбна абстраляцца.

Баліць мне так казаць, былому ваяку,
Для маці сын—сівы, а ўсё дзіцятка,
Ды спраў, што мы страчаем на вяку,
Не парабіць у беленькіх пальчатках.

Я збраяроў здавён сачыць пачаў:
Адзін быў—трохі пораху панюхаў.
Быў генерал—пагрозы сек з пляча,
А трэці—бомбу шпурляну ў з-за вуха.

Перадапошні—вось! Бліжэй хадзем,
Прыцэнімся: каму тут заядацца?
На хрэсьбінах яго назвалі—Джэймс,
Імя—дарма, а хроснік, што за цаца?

Танцуе на шарнірах. Вочы ўверх
Заводзіць. Як пацягнеш за шпагацік,
Рукамі спляскваe. Каб зарабіць давер,
Да скуры распранаецца ў сенаце.

Я б не сказаў, што на язык васцёр,
Хоць не прылічан і да гурту скромных,
Ды ўжо ж не нахапаўся з неба зор,
І не з такіх, каму стаўляюць помнік.

Каб мой памфлет без солі не злысеў,
З лупіны трэба вылузаць арэшак,
Хай курчыцца на белай паласе
Той, хто цкуе, і разам той, што брэша.

Хацеў бы імі не гнюсіць радкоў.
Паэт казаў: «Дай, Джым, на шчасце лапу...»[1]
Дык то ж быў — Джым! А гэты не з сяброў.
Здароўкацца хай цягне лапу папу.

Няўжо ж там не відно з-за пентагонскіх лінз,
З-за свежых цэнтаў і мазгоў нясвежых,
Як, сцягам веку стаўшы, камунізм
Кардоны нішчыць і змятае межы?

Паўстанні ў сэрцах рвуцца праз людзей,
Трасуць планету выбухі свабоды...
Чаму ж маўчыце, звяўшы прэзідэнт,
Ці не заныл косці на нягоду?

Каб угібаць у жменю Белы дом,
Хадзіць па коўзкім трэба прылаўчыцца.
І ён хадзіў, размахваў кулаком.
Не так ступіў—і паламаў ключыцу.

Што гаварыць, паломка без пары...
Хоць драбяза,—руцэ няма размаху,
Як ні стаўляюць шыну дактары...
Не хочацца, а трэба злазіць з даху!

[1] Радок з верша С. Ясеніна «Сабаку Качалава».

бразным ладзе і разам з тым блізкія па тэндэнцыі творы Г. Вашчанкі, В. Сахненкі, І. Рэя, В. Сумарава, А. Марачкіна, В. Маркаўца і многіх іншых мастакоў.

Упэўнена і настойліва заявіў аб сваім галоўным напрамку жывапісец Алесь Марачкін, чыя творчая біяграфія пачалася на пачатку 70-х гадоў. Можна пачаць гаворку аб яго творчасці з палатна «Гуканне вясны», прысвечанага аднаму з прыгожых народных абрадаў, які ў некаторых раёнах Віцебскай і Брэсцкай абласцей бытуе і па сённяшні дзень.

Вясна — гэта чаканне цяпла, час клопату селяніна аб будучым ураджаі. Абрады, у якія ўваходзіла «гуканне», былі звязаны з магічнымі заклікамі да зямлі. Гукалі вясну жанчыны і дзяўчаты — з пагорка ці з даху невялікага збудавання. Сімвалам вясны. з'яўляліся птушкі...

У карціне А. Марачкіна паказаны адзін з момантаў старажытнага абраду. Чатыры жанчыны, апранутыя па-святочнаму, выйшлі «гукаць вясну». Постаці выпісаны ў поўны рост, быццам набліжаны да нас — запаўняюць усю плоскасць карціны. Справа відаць кавалачак неба і чарада птушак, якія імкнуцца ўвысь да сонца. Выразныя твары жанчын, на іх адбілася таямнічая чароўнасць — наіўная вера ў чарадзейныя сілы прыроды, што спалучаецца са шчырай любоўю іх да зямлі і ўсяго, што жывіцца яе сокамі...

Прыглядаючыся да карцін А. Марачкіна, заўважаеш настойлівае імкненне мастака «перакінуць масток» з мінулага ў нашы дні, раскрыць сакрэты даўгавечнасці народнай творчасці. Прыкладам гэтага можа быць яшчэ адна карціна — «Матчына казка». На палатне буйным планам — калаўрот. Былы спадарожнік жаночых будняў з малалецтва і да старасці, сёння ён з'яўляецца экспанатам музеяў. Тым больш зразумелым становіцца роздум аўтара аб працавітасці нашых продкаў, аб каштоўным багацці мінулага, нашчадкамі якога мы з'яўляемся, аб руплівых руках і адметным таленце працоўнага чалавека.

У кожнага з нас на ўсё жыццё застаюцца ў памяці самыя разнастайныя прыкметы яго дзяцінства: добрая матчына казка, пах свежага хлеба, вузенькая сцяжынка, што вядзе да бацькоўскай хаты, і яшчэ вельмі многа чаго, што з любоўю завём родным кутам, бацькаўшчынай. Урачыстай песняй, прысвечанай бацькаўшчыне, успрымаюцца палотны Васіля Сумарава пра старажытную Навагрудчыну. Адна з апошніх прац гэтага цыкла — карціна «Спрадвеку», выраша-ная, як і іншыя, у эпічным ладзе. Над паселішчамі і краявідамі велічна ўзвышаюцца руіны Навагрудскага замка, яны нібы ўзнімаюцца на вачах гледача ў бясконцы сусвет, становячыся яго часткай—мастак перадае сваё адчуванне радзімы, традыцый, якія звязваюць дзень сённяшні з днём мінулым.

А вось карціна Віктара Маркаўца «Свята ў Докшыцах». Дзве дзяўчыны і юнак са скрыпкай у руцэ, крыху далей — група дзяўчат, якія няспешна кружацца ў карагодзе, яшчэ далей — людзі ў святочным адзенні... Свята — сягоння! Малюючы карціну сённяшняй рэчаіснасці, мастак падкрэслівае ўстойлівае зацвярджэнне народных традыцый у сучасным быце.

Гэтая ж думка праводзіцца і ў карціне «Купалле», створанай паводле артыкула беларускай паэтэсы Цёткі «Папараць-кветка». Вось некалькі радкоў з артыкула: «Папараць-кветка» — гэта сімвал усезнання. Народы ўсяго свету выцягваюць да яе рукі, ідуць з спрагненымі сэрцамі...» Карціна В. Маркаўца прысвечана неўміручай паэзіі Цёткі, справе яе барацьбы за шчасце беларускага народа. Але мастак, уводзячы ў карціну сваіх равеснікаў — юнака, дзяўчыну, зноў пераносіць дзеянне ў наш час, нібы працягваючы эстафету пошукаў сімвалічнай кветкі ўжо новым пакаленням дапытлівых і смелых.

Зусім іншы настрой пануе ў карціне Уладзіміра Гоманава «Свята ў полі». Кампазіцыя звязвае зграбныя постаці жанчын у нацыянальным адзенні і па-святочнаму ажыўленых мужчын у цесны круг. У цэнтры сонца ззяе традыцыйны вянок з жыта новага ўраджаю. Радасць калектыўнай працы, гордасць хлебаробаў за сваю пачэсную прафесію і гонар за дабрабыт гаспадаркі — усё перададзена дакладна, таленавіта.

Старадаўні народны абрад атрымаў у нашы дні новае гучанне. Безумоўна, у радасным настроі герояў палатна У. Гоманава няма нічога агульнага з тымі клопатамі, якія засмучалі радасць стваральнай працы іх продкаў. У гэтым — прыкмета нашага часу, сацыялістычнага ладу жыцця, дзе праца з'яўляецца радаснай патрэбай чалавека, яна — сіла і моц нашага грамадства.

А. КАСІНЕЦ,
мастацтвазнавец.

ПА ВОПЫТ — ДА «ЎСМЕШКІ»

Вялікім поспехам у гледачоў карыстаюцца выступленні лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, рэспубліканскіх і ўсесаюзных фестываляў народны агіттэатр «Усмешка» Палаца культуры ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі Магілёўскага завода штучнага валакна імя В. У. Куйбышава.

Гэты калектыў створаны пятнаццаць гадоў назад на базе цэхавай агітацыйна-мастацкай брыгады. Цяпер у агіттэатры 27 артыстаў — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя завода. Сярод іх лабаранткі С. Шчытнікава, Т. Чыжэўская, Г. Лявончык, электрык У. Адысеў, токар А. Краўцоў, служачыя А. Штэрэнгас, Л. Бараноўскі і іншыя. Многія гады працуюць у калектыве канцэртмайстры В. Бяляеў, А. Разоўскі і мастак В. Акулаў.

За час свайго творчага існавання агіттэатр падрыхтаваў дваццаць прадстаўленняў. Іх аўтар і нязменны рэжысёр — У. Бараноўскі. Разам з удзельнікамі агіттэатра ён падбірае матэрыял, шырока выкарыстоўваючы мясцовыя факты, складае сцэнарыі. У час правядзення першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных калектыў паказаў сваю спецыяльна падрыхтаваную праграму «Распішыцеся ў атрыманні» і стаў лаўрэатам.

Каля 2000 выступленняў на рахунку агіттэатра. «Усмешка» гастралявала ў Мінску, Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Калінінградзе. Рызе, Таліне, Адэсе. Па накіраванні ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ агіттэатр выязджаў на ўдарныя камсамольскія будоўлі Беларусі, Літвы, на цалінныя землі Казахстана, да будаўнікоў Байкала-Амурскай магістралі. У час IX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў «Усмешка» выступала ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі, а напярэдадні святкавання трыццацігоддзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла на экраны краіны фільм «Мы—сіняблузнікі», у якім расказваецца аб творчых дасягненнях «Усмешкі», яе гісторыі, удзельніках.

Пры агіттэатры створана пастаянна дзеючая студыя «Юнацтва», якой за творчыя поспехі прысвоена званне ўзорнай. У рэпертуары студыі цяпер чатырнаццаць спектакляў: «На старт, рамантыкі!», «Тэатр нашага двара», «Тут дзесяць класаў пройдзена», «Азбучныя ісціны» і іншыя.

Да свайго 15-годдзя народны агіттэатр «Усмешка» падрыхтаваў новае тэатралізаванае прадстаўленне. Гэта расказ пра слаўны гераічны шлях вернага памочніка партыі — Ленінскага камсамола ў будаўніцтве камуністычнага грамадства, пра барацьбу прагрэсіўнай моладзі ўсяго свету за мір, дружбу.

Другі год агіттэатр «Усмешка» з'яўляецца пастаянна дзеючай вучэбнай базай кіраўнікоў агітацыйна-мастацкіх брыгад вобласці.

У канцы мінулага года ў час тыдня народнага агіттэатра, які праходзіў у сувязі з яго 15-годдзем, Магілёўскі абласны і Рэспубліканскі навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культасветработы правялі на базе агіттэатра семінар-практыкум кіраўнікоў агітацыйна-мастацкіх брыгад і калектываў мастацкага чытання. Ён быў прысвечаны задачам агіттэатраў і агітбрыгад, калектываў мастацкага чытання ў перыяд падрыхтоўкі да XXVI з'езда КПСС.

Акрамя кіраўнікоў самадзейных калектываў Магілёўшчыны, у рабоце семінара-практыкума прынялі ўдзел кіраўнікі вядучых агітацыйна-мастацкіх брыгад Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.

На працягу пяці дзён удзельнікі семінара-практыкума прысутнічалі на рабочых рэпетыцыях «Усмешкі», дзіцячага ўзорнага агіттэатра «Юнацтва», народнай агітбрыгады «Таварыш» цэлафанавага цэха завода штучнага валакна, прагледзелі спектаклі гэтых калектываў, прынялі ўдзел у іх абмеркаванні.

А. ГОЛЫШ.

ПОШУКІ, ЗНАХОДКІ

З АРХІВА ЯНА РАЙНІСА

У архіве Яна Райніса ў Рызе выяўлены новыя матэрыялы, якія ўсё паўней высвятляюць асобу выдатнага латышскага паэта. Беларусы ведаюць яго і як шчырага друга і прапагандыста культуры нашага народа. Калі мне давялося знаёміцца з некаторымі архіўнымі матэрыяламі, я з хваляваннем адзначаў прыметы цікавасці і любві Я. Райніса да нашай паэзіі, тэатра... Ён быў сябрам Янкі Купалы, ведаў спектаклі і артыстаў тэатраў, якія пазней набылі імя Янкі Купалы і Якуба Коласа. На адной з кніг, падораных Купалам шаноўнаму латышскаму госцю, застаўся аўтограф лацінкай: «Вельміпаважанаму песняру Латвіі Я. Райнісу шчырапрыязны Янка Купала. Менск, 19.XI. 1926 г.».

Вядома, што Я. Райніс падтрымліваў у свой час усе культурныя пачынанні беларускага зямляцтва ў Латвіі. І першым дакументам з архіва я хацеў бы паказаць чытачу фотаздымак артысткі Н. Мікалаевай, якая першай у Латвіі выканала ролю Паўлінкі ў аднайменнай камедыі Янкі Купалы. На адвароце карткі захаваўся такі надпіс: «Яго Міласці Высокапаважанаму Грамадзяніну Дэпутату Я. Райнісу на ўспамін. 28 красавіка 1923 г.». Гэта была памятка беларускага культурна - асветнага таварыства «Бацькаўшчына», якое дзейнічала ў тагачаснай Латвіі. З выяўленых звестак пра Н. Мікалаеву можна сказаць, што яна ўпершыню выканала ролю Паўлінкі ў 1923 годзе, калі вучылася ў Люцынскай беларускай гімназіі, дзе існаваў драматычны гурток. У 1927 годзе яна закончыла Дзвінскую беларускую гімназію (Люцын—цяпер г. Лудза, а Дзвінск—г. Даўгаўпілс Латвійскай ССР). У 1932 годзе Мікалаева-Комісар — выпускніца Латвійскай кансерваторыі. Яна пакінула след у латышскай музычнай культуры, але сёння мне хочацца нагадаць яе дзейнасць на ніве беларускай культуры. У Дзвінску, напрыклад, станаўленне таленту Н. Мікалаевай праходзіла пад кіраўніцтвам выкладчыцы гімназіі, вядомай нам Паўліны Вікенцьеўны Мядзёлка. Н. Мікалаева-Комісар прымала чынны ўдзел у дзейнасці беларускіх аматараў тэатра. Вось прыклад: латышская прэса цёпла сустрэла спектакль «Паўлінка» і ў 1928 годзе з яе ўдзелам.

Восенню 1926 года Ян Райніс наведаў Мінск, Віцебск. Вельмі цікавіўся ён тэатральным жыццём маладой савецкай рэспублікі, сустракаўся з артыстамі, рэжысёрамі, з кіраўнікамі Першага БДТ у Мінску і Другога БДТ у Віцебску. Сабраў многа матэрыялаў, якія выкарыстаў у сваіх пазнейшых публікацыях аб развіцці беларускай савецкай культуры.

На групавым здымку 1924 года з архіва Я. Райніса, які я прапаную чытачам «ЛіМа», можна ўбачыць такія вядомыя постаці, як Уладзімір Уладамірскі і Эдуард Шапко (першы і другі злева направа ў другім радзе), Уладзімір Крыловіч (чацвёрты ў тым жа радзе) і Барыс Платонаў (першы справа); у першым радзе (злева направа) Яўген Рамановіч, Вольга Галіна, Еўсцігней Міровіч, Лідзія Ржэцкая і Язэп Дыла. Тэатралы добра ведаюць, што памянёныя тут дзеячы нашай сцэны закладалі тыя традыцыі, якія і цяпер складаюць здабытак і высокую каштоўнасць тэатральнай культуры наогул і Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў прыватнасці.

Чаму над здымкам зроблены такі надпіс: «Гурток самадзейнасці...»? Я паспеў пагутарыць аб гэтым з народнай артысткай БСССР В. Галінай. Яна сказала: «Пасля вялікага поспеху нашых першых гастроляў у Маскве ў 1923 годзе, дзе мы самі паглядзелі выдатныя работы нашых сталічных калег, выявіліся і нашы пэўныя недахопы. Было неабходна павышаць майстэрства, узровень артыстызму. Так арганізаваўся ў нашым тэатры вышэйзгаданы гурток...». Арганізаваўся ён перш за ўсё стараннямі грамадскага дзеяча і пісьменніка Язэпа Лявонавіча Дылы, які пэўны час быў дырэктарам тэатра. Ён, як згадвала Вольга Уладзіміраўна, рупіўся, каб з найбольшай самаддачай працаваў гурток, даставаў грошы на аплату заняткаў, якія праводзілі вопытныя педагогі. У 1924 годзе БДТ-1 паставіў п'есу «Панскі гайдук» Я. Дылы (на афішы быў пазначаны яго драматургічны псеўданім — Н. Бываеўскі). Пісьменнік часта бываў на рэпетыцыях. Таму на здымку ўдзельнікаў таго гуртка побач з артыстамі мы бачым і яго.





Са здымкаў тэатральных пастановак БДТ-1, знойдзеных у архіве Я. Райніса, прапануюць два — сцэну са спектакля «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча (ролю правадыра паўстання выконваў У. Крыловіч) і сцэну са спектакля «Жорж Дандэн» Мальера (крайняя справа—В. Галіна).

Здаецца, такія фатаграфіі яшчэ невядомы (або малавядомы). Яны дарагія—як дакументы часу, дакументы дружбы.

Сяргей ПАНІЗНІК.

НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

Другая, рэспубліканская праграма з 19 па 25 студзеня

19 студзеня, 21.35.

ЧАС, ЗЯМЛЯ, ЛЮДЗІ.

Праграма Магілёўскай студыі тэлебачання, прысвечаная XXVI з'езду КПСС. У перадачы прымае ўдзел першы сакратар Магілёўскага абкома КПБ В. В. Прышчэпчык.

20 студзеня, 20.10.

ПІСЬМЕННІК І ПЯЦІГОДКА.

Пісьменнік Л. Левановіч выказвае свае меркаванні аб праекце ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года», дзеліцца сваімі думкамі, расказвае аб вопыце апрацоўкі зямлі без плуга.

23 студзеня, 17.40.

КРЫНІЦА.

Праграма знаёміць са спявачкай В. Ярошынай — выкладчыцай вакала педвучылішча г. Гродна. Яна выканае творы Цікоцкага, Чайкоўскага, Вердзі, Варламава, Лукаса, Глінкі, Шуберта.

23 студзеня, 21.35.

АД НАРАЧЫ ДА АРЭСЫ.

Праграма, прысвечаная XXVI з'езду КПСС, расказвае аб дасягненнях працоўных Мінскай вобласці. У ёй прыме ўдзел першы сакратар Мінскага абкома КПБ У. А. Мікуліч.

24 студзеня, 15.40.

КАНЦЭРТ ДЗЯРЖАЎНАГА АНСАМБЛЯ ТАНЦА БССР.

24 студзеня, 19.20 і 21.35.

ЗАКЛЮЧНЫ КАНЦЭРТ ЛАЎРЭАТАЎ VI МІЖНАРОДНАГА КОНКУРСУ МУЗЫКАНТАЎ-ВЫКАНАЎЦАЎ.

24 студзеня, 22.45.

Чарговая перадача **«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ»** прысвечана польскім эстрадным спевакам І. Кубіцкай і М. Радовіч.

25 студзеня, 13.20.

КАНЦЭРТ КАМЕРНАЯ МУЗЫКІ.

Праграма складзена з твораў народнага артыста БССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР А. Багатырова.

25 студзеня, 21.35.

ЗАПРАШАЕ ТЭЛЕСТУДЫЯ «ЛІРА».

Тут адбудзецца сустрэча народнага пісьменніка БССР І. Шамякіна са сваімі чытачамі.

В А С ЗАПРАШАЮЦЬ

ДОМ ЛІТАРАТАРА

20 СТУДЗЕНЯ адбудзецца вечар, прысвечаны паэтам лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Генадзю Бураўкіну і Нілу Гілевічу.

ДОМ КІНО.

19—24 СТУДЗЕНЯ Саюз кінематаграфістаў БССР сумесна з кінастудыяй «Беларусьфільм» праводзяць дзевяты агляд-конкурс мастацкіх, тэлевізійных мастацкіх, хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў, кінаперыёдыкі, мастацкіх мультыплікацыйных фільмаў, створаных кінастудыяй «Беларусьфільм» у 1980 годзе. Конкурс прысвячаецца XXVI з'езду КПСС, XXIX з'езду КПБ, V з'езду кінематаграфістаў БССР.

ДОМ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

22 СТУДЗЕНЯ чарговыя заняткі універсітэта тэатральнага мастацтва «Выдатныя акцёры рускага тэатра XIX стагоддзя».

23 СТУДЗЕНЯ з творчай перадз'ездаўскай справаздачай выступае народны артыст БССР Зіновій Бабій.

24 СТУДЗЕНЯ выступае з творчай перадз'ездаўскай справаздачай Дзяржаўны тэатр музкамедыі БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 03019

1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі— 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, адзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-22-04, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва—23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-66.

Рэдакцыя прымае і разглядае празаічныя творы аб'ёмам не больш як друкаваны аркуш, артыкулы, нарысы—да 15 старонак, вершаваныя творы—не больш як 100 радкоў. Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО